
**УЛАДЗІМІР СЦЯПАН**



# ВЕЖА



Першая
кніга
празаіка

**УЛАДЗІМІР СЦЯПАН**



# ВЕЖА

**Апавяданні**



Мінск
«Мастацкая літаратура»
1990

ББК 84 Бел7
С 92

Серыя заснавана ў 1976 годзе

Книга рассказов «Башня» — это калейдоскоп событий, происшествий, как простых и обыкновенных, так неожиданных и экстравагантных. Автор заставляет своих героев задумываться и размышлять о настоящих и мнимых ценностях в жизни человека и в искусстве.

Герои — молодые люди, горожане — пробуют избавиться от одиночества, неустроенности, разрушить стены отчужденности, непонимания и вырваться из противоречивой действительности.

$С \frac{4702120201—145}{М 302(03)—90}$ БЗ 64—90

ISBN 5-340-00830-4

© У. Сцяпан. 1990
© Афармленне. У. А. Сцепаненка. 1990

## На вуліцы

— Гэй, інтэлігент, купі сабаку! Калі табе не трэба, то ёй купі! — чуецца надтрэснуты голас, і ад сцяны аддзяляецца цёмная постаць.

— Са-бач-ка! — аглядваецца дзяўчынка.

— Пайшлі, пайшлі! — прыспешвае хаду і цягне за сабой дзяўчынку мужчына з газетай.

— Сабакі! — сіпіць надтрэснуты голас.— Жывёлы.

Сабака паварочвае галаву і глядзіць на гаспадара. У вадасцёку, да якога мацуецца шворка, глуха грыміць і з шоргатам падае кавалак лёду. Сабака кідаецца ўбок. Шворка нацягваецца — чуецца хрып. З дахаў сыплюць капяжы.

— Што, волі захацеў? Месца! — злуе гаспадар.— Я — Крук. Мяне ўсе ведаюць. Я чалавек, а ты — сабака. Жывёла ты.

Крук змаўкае, садзіцца на цокаль будынка і пачынае шукаць наступнага, каму можна прапанаваць сабаку. У брудных худых пальцах дрыжыць недапалак папяросы. Круку робіцца нудна — прахожых няма, і ён торгае шворку. Сабака прыўстае і глядзіць на сагнутую постаць гаспадара.

— Нікому ты не патрэбны. Чаго падняўся, ляжаць! — Крук замахваецца. Галава сабакі ўціскаецца ў плечы.— А, страшна. Бо я гаспадар, а ты... Каго мне баяцца? Няма каго.

Непадалёк працуюць дворнікі. На шэрасці вуліцы яны вылучаюцца яркімі сігнальнымі камізэлькамі. Стары аднастайна падымае і апускае цяжкі лом. Тоў-

сты ўчарнелы лёд трэскаецца, пырскаюць бліскучыя аскепкі.

— Анічога сабака, нат да аўчаркі падобны,— звяртае ўвагу старога хлопец, што працуе побач. Ён на імгненне спыняецца, рыдлёўка з шырокім абсечаным лязом замірае ў паветры.— Сапраўды, сабака што трэба.— Хлопец падхоплівае брыль лёду і адкідвае на газон, пад чорныя камлі дрэў.

— Ану, пайшлі адсюль! — крычыць Крук на хлопчыкаў з каляровымі ранцамі, што спыняюцца каля сабакі.— Каму сказаў?

Дзеці спалохана адбягаюць і спяшаюцца па вуліцы. Сабака міргае. У вадасцёку чуецца шум. Вострыя вушы нашаторваюцца.

— Чаму б вам не набыць сабаку. Відаць, танна аддае,— звяртаецца малады да старога.

— Не люблю сабак,—стары прыпыняецца, выцірае лоб.— Ні аўчарак, ні паляўнічых не люблю...

— Што сталі, цюкайце,— хлопец глядзіць наперад, туды, дзе вузкая вулачка ўпіраецца ў праспект.

За імі застаецца чорны вільготны асфальт, на якім растаюць белыя аскепкі.

— Я сваё адцюкаў,— звяртаецца да маладога стары,— і ломам цюкаў, і кайлом, і сякерай цюкаў.— Стары гаворыць без злосці і абурэння.

— Тады навошта вам гэта праца? Вы ж на пенсіі,— у голасе хлопца непаразуменне.— Я чаму працую? Мне грошы патрэбны, надакучыла ад бацькоў залежаць.

— Не ад бацькоў, дык ад іншых будзеш залежаць. На гэтым і трымаецца свет.

— Ну, вы як настаўнік даводзіце.

— Цяпер не настаўнік, а вось вуліцу мяту. Смецце прыбіраю.

— А хто вас прымушае, вы ж ні ад кога не залежыце?

— Ніхто мяне не прымушае. Прывык працаваць. А незалежнасці няма,— стары прыпыняецца і аглядае вуліцу.

— Ну, гэта не! Калі маеш грошы — ёсць і незалежнасць. Адносная, канечне,— удакладняе хлопец і разам з раскрышаным лёдам падграбае рэшткі газет, леташняе лісце і螺ознае смецце. Падграбае і шпурляе на газон.

— Купі сабаку, дзед! Купі! Добры сабака,— заступае дарогу пенсіянеру з валізкаю Крук.

— Які я вам дзед? — абураецца пенсіянер.— Як вам не сорамна, мужчына? Сабаку прадаяце...— пенсіянер спыняецца з надзеяй выказацца, але Крук рэзка перапыняе яго:

— Ідзі, ідзі, тупай! Ходзяць розныя, не спытаць.

Пенсіянер пакрыўджана ківае галавой і, пазвоньваючы малочнымі бутэлькамі, паварочвае ў двор.

Дворнікі працягваюць працу. Яны пастуова набліжаюцца да вадасцёку, з якога бяжыць струмень і прамывае ў тоўстым лёдзе равок. Сабака мружыць вочы і слухае шум вады.

Вуліца з чатырохпавярховых дамоў шэрая і непрыбраная. На атынкоўцы фасадаў рагі вільгаці. З дахаў сыплюць капяжы. Няўтульна.

З двара, дзе знік пенсіянер, выходзіць падлетак. Ён набліжаецца да сабакі і кідае яму цукерку. Шворка нацягваецца, да цукеркі застаецца крок. Падлетак падымае яе і з далоні дае сабаку.

— Не браць! Фу! Я каму кажу! — істэрычна крычыць Крук.— Фу! Месца!

Але сабака з'ядае цукерку і глядзіць на падлетка.

Крук хапаецца за шворку, цягне і б'е сабаку нагой. Сабака скуголіць і прыціскаецца да вадасцёку.

— Месца! А ты, шчанюк, пайшоў адсюль! Купі — тады кармі, а пакуль я гаспадар! Хачу кармлю, хачу заб'ю!

— Вар'ят! — кідае ў адказ падлетак і незалежна шыбуе прэч.

— Я! Я! Я гаспадар! Я Крук! Мяне ўсе ведаюць! Я...— ён нарэшце супакойваецца і спрабуе запаліць недапалак.— А цябе заб'ю, калі ніхто не купіць.

Дворнікі ў сваіх сігнальных камізэльках набліжаюцца да раўка, у якім струменіць мутная вада.

— Гаспадар горшы за сабаку. Такіх забіваць трэба,— у рытм рухаў кажа малады і моцна б'е ў лёд.

— Кожны мае гаспадара, якога ён варты,— стары глядзіць на недагледжанага сабаку і адкідвае цёмныя брылі лёду.

— Лепш быць бяздомным, чым за такім гаспадаром.

Стары не адказвае. У вадасцёку абрываецца і грукоча лёд. Сабака кідаецца ўбок, амаль пад ногі маладому.

— Месца! Сядзець! — сіпіць Крук.— Заб'ю, падла!

Сабака скуголіць і цісне́цца да сцяны. Малады бярэ ў старога рыдлёўку і кароткім ударам перасякае шворку.

— Бяжы! Бяжы, сабака! Бяжы! — адначасова просіць і загадвае хлопец.

Нейкае імгненне сабака вагаецца, але потым бяжыць за рог дома.

— Ты што? Я цябе! — крычыць гаспадар, але да хлопца не набліжаецца.— Я Крук.

— Ану, валі адсюль! Крук! Ты што, не зразумеў? — ціха, амаль шэптам кажа хлопец. Ён на галаву вышэйшы за Крука і амаль удвая шырэйшы ў плячах.— Ідзі, і каб я цябе не бачыў.

Крук лаецца і, паслізгваючыся, сунецца ў бок праспекта.

— Ідзі, ідзі! — пераможна гучыць яму ўслед.

Малады бярэ ў старога лом і працуе. На твары задавальненне. Стары пачынае адставаць.

— Дарэмна ты гэта зрабіў,— стары спыняецца.— Нічога ты гэтым не зменіш...

— Змяніў. Што яму за шчасце жыць з такім вар'ятам? А цяпер яму воля.

— Воля. Толькі адчуеш яе, ірванешся да яе, а ашыйнік і перахопіць дыханне. Шворка нацягнецца — і ўся воля,— стары глядзіць у той бок, куды пабег сабака.

— Шворку я перасек,— упэўнена кажа хлопец.

— Воля. Адкуль яму ведаць волю, калі нарадзіўся на ланцугу. Яму воля за гаспадаром...— стары нагінаецца і адкідвае скрышаныя брылі пад дрэвы.

Вуліца асветлена сонцам. Асфальт, вызвалены ад скарынкі лёду, падсох, зрабіўся шэры.

Цывільна апрануты хлопец ідзе па тратуары.

— Гэй, інтэлігент, купі сабаку! — чуе знаёмы надтрэснуты голас.— Амаль задарма аддам.

Ля шэрай сцяны постаць Крука. Побач з ім навязаны да вадасцёку сабака. Хлопцу здаецца, што сабака вінавата міргае і ціснецца да сцяны. Крук не пазнае і безнадзейна прапануе: «Інтэлігент, купі сабаку!»

# Гадзіннік за сцяной

Калі прыслухацца да гукаў, што напаўняюць кватэру, то можна пачуць, як за сцяной цікае гадзіннік. Звонка і няспешна падаюць буйныя кроплі, аднастайна і бесперапынна бяжыць час.

— Дзінь! Бім! Бом!

Металічна хрусткі гук напаўняе двухпакаёвую кватэру лёгкім вібрыруючым звонам... Ізноў буйныя кроплі працінаюць сцены і трапляюць у пакой, дзе за круглым сталом, на якім раскладзены падручнікі і сшыткі, сядзіць хлопчык. У кватэры хлопчык — вучань другога класа, і суседка, якая даўно на пенсіі, бацькі хлопчыка на працы. У вузкім доўгім калідоры крокі. Цяпер адчыняцца дзверы і на парозе з'явіцца баба Вера.

— Валодзька, ты сабраўся ў школу? Ужо палова першай.

Хлопчык загортвае сшытак.

— Ты што, не чуеш?

— Чую.

— То збірайся, калі чуеш.

Гэта заўсёдны дыялог. Старая суседка ніколі не заходзіць у пакой, яна сваім ціхім голасам размаўляе з-за парога.

— У мяне яшчэ ёсць час,— кажа хлопчык.

— У цябе ёсць, але трэба спяшацца, а то яго не будзе.

— Будзе,— спакойна кажа Валодзька.

Баба Вера паварочваецца і павольна аддаляецца ў прыцемкі калідора.

Шуміць у жалезнай ракавіне вада, звякае чайнік, дзынкае посуд.

Хлопчык загортвае падручнік, адкрывае партфель. Тонкія сшыткі складаюцца ў кардонную папку, завязваюцца матузкі. І папка ставіцца ў партфель. На тым месцы, дзе яна ляжала, заўсёдная запіска, якую кожную раніцу пакідае маці. Хлопчык перачытвае друкаваныя літары, зашчэплівае партфель.

У кухні два сталы, два шкапчыкі, дзве паліцы з посудам і пліта на чатыры фаеркі — на ёй грэецца чайнік. Хлопчык ля свайго стала ўздымаецца на дыбачкі і па чарзе падымае накрыўкі каструль. Потым налівае кубак кампоту, дастае са шкапчыка батон. Увесь гэты час баба Вера назірае за ім.

— А суп, Валодзька?

— Не хачу.

— Чаму?

— Я ўчора еў суп.

— Дык гэта было ўчора.

— Прыйду са школы і буду есці разам з усімі.

Так яны размаўляюць штодня. Задаюцца прыкладна адны і тыя ж пытанні, на якія даюцца адны і тыя ж адказы.

Чайнік выдыхвае пару, сіпіць, накрыўка пачынае падскокваць. Баба Вера выключае пліту. Са шкапчыка дастае стракатую ў сланах бляшанку і засыпае ў імбрычак лыжку заваркі, з паліцы здымае вялікі кубак з адбітым вушкам.

— На вуліцы дождж, Валодзька.

Шкло акна чыстае. З-за кактусаў у высокіх вазонах відаць толькі неба, роўнае і светла-шэрае. Валодзька выходзіць на балкон. Два галубы палохаюцца, лапочуць крыламі і ўзлятаюць.

— Баба Вера, зноў галубы на балконе,— кажа ён і сочыць птушак, якія ляцяць праз двор да суседняга дома.

— Што, дождж перастаў?

— Не, я кажу, галубы прыляцелі.

— Я ведала, што будзе дождж, з вечара ногі балелі.

— Дажджу няма. Перастаў.

— Апранайся, а то спознішся.

Вуліца і школьная пляцоўка паблісківаюць калюгамі. На чорны асфальт дрэвы кідаюць яркую лістоту. Галубы вяртаюцца і садзяцца на мокрыя парэнчы...

— Вось і птушкі прыляцелі,— старая паказвае на іх.— Трэба пакарміць...

Валодзька ў сваім пакоі апранае школьную форму.

Дзінь! Бім! Бом!

Гучаць звонкія і ясныя ўдары. Хлопчык слухае, як металічны гук завісае, ускалыхвае паветра. Па сценах пакоя ляцяць срэбныя кляновыя лісты. Яны падаюць, павольна перакручваюцца, з лёгкім звонам чапляюцца вострымі рожкамі за шурпатасці тынкоўкі...

Робіцца ціха. Лісце вяртаецца назад, застывае на жоўта-зялёнай сцяне.

— Ці чуеш, Валодзька?

— Што?

— Гадзіннік. Хутчэй збірайся.

— Я ўжо апрануўся,— хлопчык бярэ партфель і выходзіць у калідор.

— Вазьмі, па дарозе з'ясі.

— Дзякуй.

У руцэ хлопчыка яблык. Учора была цукерка, сёння яблык, заўтра... Валодзька разумее, што сённяшні дзень паўторыцца.

Суседка прыпыняе яго, цёплай далонню прыгладжвае непрычасаныя валасы.

— Надзень кепку. На вуліцы дождж.

— Я ведаю, што дождж...— Ён не дагаворвае і адчыняе цяжкія калідорныя дзверы.

Хлопчык не адкрывае вочы і лічыць удары гадзінніка. Пасля дзевятага ўстае з ложка. На клёнах, што ўздымаюць свае шаты да трэцяга паверха, свіцяцца лісты. Яркім кругам, крыху замглёнае, падобнае да адпаліраванага дыска, вісіць восеньскае сонца. На сценах пакоя хістаюцца цені галін — пакой нагадвае парк, срэбныя лісты, зробленыя па трафарэту, пабліскваюць.

На цыраце круглага стала запіска: замест «суп» напісана «каша», а замест «кампот» — «малако».

Па дарозе на кухню хлопчык спыняецца ля дзвярэй суседкі, здзіўлены цішынёй. У яе пакоі ціха, з кухні яе таксама не чуваць. У гэты час баба Вера звычайна гатуе ці палівае кактусы... У пад'ездзе чуюцца галасы, у трубах шуміць вада; але ўсе гэтыя гукі аб'ядноўвае і перамагае гадзіннік, што цікае за дзвярыма суседкі.

— Валодзька, зайдзі!

Ён палохаецца, пачуўшы голас бабы Веры.

— Добры дзень,— кажа хлопчык з парога.

Баба Вера ляжыць на высокім ложку. Яе твар цьмяна вымалёўваецца на вялікай падушцы.

— Праходзь, праходзь,— кажа яна.

У куце, ля акна, фікус у драўляным вазоне. Яго тоўстыя лісты здаюцца цыратавымі і цяжкімі. Другі кут займае гадзіннік, вышынёю роўны з шафаю. Малочны цыферблат аздабляе вянок пераплеценага між сабой лісця, акенца, за якім хістаецца бліскучы дыск маятніка, абрамоўваюць точаныя паўкалоны. Па вуглах гадзінніка — тоўстыя вітыя слупы, на якіх трымаецца арка і надае гадзінніку ўрачыстасць і завершанасць.

— Валодзька, запалі святло.

Хлопчык толькі цяпер заўважае, што ў пакоі суседкі цемнавата. Ён паварочваецца і націскае на рыфлены ражок выключальніка. Абажур, які здаваўся бляклым і пыльным, робіцца ружовым.

— Баба Вера, я ўключыў святло.

— Дзякуй, сядай на канапу.

Хлопчык уладкоўваецца на канапу, пакрытую клятчастай посцілкай.

— Нават пабудзіць цябе не змагла.

— Я сам падняўся.

Побач з высокім ложкам — крэсла, на якім тэрмометр без футарала, пачак з таблеткамі і паўшклянкі вады.

— Можа, вам што прынесці?

Пытанне доўга застаецца без адказу.

— Нічога не трэба...

Плямамі снегу, які незаўважна растае і мяняе абрысы, ляжаць карункавыя сурвэткі. Яны на стале, шафе, пад керамічнымі вазонамі, з якіх вытыркаюцца сівыя шары кактусаў. Усё, што знаходзіцца вакол, здаецца старым і пыльным — хоць пылу не відаць. Толькі чорны гадзіннік выдае новым і абыякавым да ўсяго.

Дзінь! Бім! Бом!

Хлопчык азіраецца на бабу Веру, потым на гадзіннік, дзе з-за шкла яшчэ гучыць металічнае рэха.

— Палова дзесятай,— стомленым голасам кажа суседка.

— Так,— адказвае хлопчык.

— Валодзька, ты ўжо вялікі, завядзі гадзіннік,— баба Вера папраўляе коўдру і пачынае тлумачыць.

Хлочык падыходзіць да гадзінніка, паварочвае медны ключ і адчыняе дзверцы. Маятнік стукае аб руку і нерухомее. У пукатым дыску адбіваецца дзіцячы твар. Паліраваная паверхня падоўжвае нос, круглая галава выцягваецца, вусны робяцца тонкімі, а невялікі пакой— доўгім, аж сцены з усімі рэчамі загінаюцца за край дыска.

— Цяпер адну за другой падцягні гіры.— У маятніку адбіваецца доўгі ложак і рука бабы Веры.— Не бойся.

Адну, потым другую, з металічным хрубастам ланцужка, Валодзька падцягвае гіры. У пакоі неверагодна ціха. Чуваць, як цяжка дыхае баба Вера.

— Зараз кранi маятнік.

Асцярожна, указальным пальцам, Валодзька піхае залаты дыск і адразу адымае руку. Маятнік раўнамерна гойдаецца. Усярэдзіне гадзінніка пстрыкаюць колы і зорачкі, мінутная стрэлка сутаргавата зрушваецца на адну чорную рыску.

— Зачыні гадзіннік,— ціха просіць баба Вера.

Хлопчык зачыняе гадзіннік і два разы паварочвае медны ключ.

— Дзякуй табе.

— Баба Вера, а што там напісана?

— Лацінскія лічбы.

— Гэта я ведаю, пад лічбай дванаццаць што?

— Імя майстра, які зрабіў гадзіннік.

— А колькі яму гадоў?

— Гадзінніку? Больш, чым мне.

— Баба Вера, а колькі вам гадоў?

Суседка паварочвае галаву да хлопчыка, але глядзіць не на яго, а вышэй, на белы цыферблат.

— Валодзька, вазьмі сабе ключ ад гадзінніка. Бяры, будзеш прыходзіць штодня і заводзіць яго, ты ўжо навучыўся. Добра?

Валодзька выцягвае медны ключ, з вушкам, падобным да кветкі ці крыжа, крыху трымае на далоні і кладзе ў кішэню.

— Я прыйду заўтра раніцай, завяду гадзіннік, цяпер я ўмею.

Тонкая падвоеная стрэлка зрушылася яшчэ на некалькі рысак між лацінскімі лічбамі.

— Ты ўжо зрабіў урокі?

— Яшчэ ўчора.

— Паснедаў?

Валодзька садзіцца на канапу і некаторы час слу-

хае цíканне гадзíннíка. Суседка маўчыць. Побач з гадзіннікам вісіць карціна.

— Гэта мора,— нечакана чуе ён ціхі голас бабы Веры.

— Мора? — перапытвае хлопчык і падыходзіць да невялікай карціны ў белай рамцы.

— Так, мора.

Белая стужка берага. Сіняя вада, над якой блакітнае неба. Вузкія белыя аблокі. Спакой і цішыня. Вузкія аблокі, здаецца, спыніліся ў сваім палёце, а ледзь прыкметныя рыскі хваль змяняюць адна адну, але застаюцца нерухомымі.

— Здымі яе і падай мне.

— Якое вялікае мора! — Валодзька здымае са сцяны дошку ў тонкай сціплай рамцы.

— Мора... Яно сапраўды вялікае, а бераг вельмі кароткі.— Суседка трымае перад сабой карціну.

У свой пакой хлопчык вяртаецца з карцінай. Каля акна ён доўга глядзіць на спакой сіняй вады, на бясконцасць блакітнага неба са спыненымі вузкімі аблокамі.

На ржавых парэнчах сядзяць галубы. Валодзька крышыць кавалак хлеба і кідае на балкон.

— Ваба Вера, а вашы галубы прыляцелі,— кажа ён у вузкую шчыліну прычыненых дзвярэй.— Я даў ім хлеба.

Увечары, калі Валодзька вяртаецца са школы, у кватэры востра пахне лякарствамі. Дзверы ў пакой бабы Веры адчынены: там маці і дзве жанчыны ў белых халатах. У адной з жанчын у руках шпрыц. Другая бліскае акулярамі і зачыняе дзверы. У кухні спінаю да ўвахода сядзіць мужчына ў пацёртым скураным плашчы, побач з ім вялікі зморшчаны партфель. Насупраць мужчыны — Валодзькаў бацька. На «добры

дзень» мужчына паварочвае галаву з маленькімі вочкамі і праз плячо кідае позірк у цёмны калідор.

— Так, малога лепш завезці, навошта яму бачыць гэта,— кажа мужчына і ставіць партфель сабе на калені.

— Валодзька, мый рукі і хутчэй вячэрай. Паедзем.

— Куды паедзем?

— Дні са два пажывеш у цёткі.

— А ў школу?

— Не спрачайся, хутка вячэрай і пераапранайся,— у голасе бацькі стомленасць.

— А мама паедзе з намі?

— Яна застанецца дома.

— Бабу Веру забяруць у бальніцу?

— Забяруць...— мужчына ідзе ў пакой бабы Веры. Адтуль выходзіць маці, у яе руках кавалак бінта.

— Давай партфель і садзіся да стала,— у мяккім голасе маці стомленасць,— хутчэй вячэрай, а то будзе позна ехаць.

Раніцай Валодзька сваім ключом адмыкае цяжкія калідорныя дзверы. У кватэры нязвыкла ціха. Тонкім струменьчыкам цячэ і разбіваецца ў ракавіне вада. Хлопчык прыўздымаецца на дыбачкі, закручвае кран. Са сметніцы тырчаць кансароўкі, абсыпаныя лушпіннем бульбы. У куту чарада бутэлек з белага і зялёнага шкла. На сталах грувасціцца непамыты посуд. Толькі чайнік бабы Веры на сваім заўсёдным месцы — на паліцы, побач з кубкам, у якога няма вушка.

На дзвярах пакоя суседкі налеплена паска паперы з чарнільнай пячаткай і доўгім неразборлівым подпісам. Дзверы зачынены. На балконе адна на адну састаўлены доўгія лавы з белых габляваных дошак. Па лавах ходзяць галубы. У сваім пакоі Валодзька пераапранаецца і нейкі час аглядае пакой. На круглым

стале новая цырата. Неўпрыкмет, успамінаючы два доўгія дні, пражытыя ў цёткі, Валодзька засынае на канапе.

Яго будзіць тупат у калідоры і грукат у дзверы. На парозе мужчына ў скураным плашчы.

— Бацькі на працы? А ты што, сам прыехаў? — кажа мужчына і, не чакаючы адказу, зачыняе дзверы.

За сцяной чуцен скрыгат мэблі, якую перастаўляюць, і мужчынскія галасы. Хлопчык выходзіць у калідор. З пакоя суседкі два незнаёмыя мужчыны выносяць на плячах вялікі чорны гадзіннік. Мужчына ў плашчы кіруе.

— Пачакайце! Трэба загарнуць яго!

Мужчыны спыняюцца. Той, што ішоў наперадзе, прыгінаецца і апускае гадзіннік на падлогу, якраз насупраць хлопчыка.

— Стаіць,— кажа ён і міргае хлопчыку.

— Я магу заводзіць, я ўмею, мяне навучыла баба Вера!

— Завядуць і без нас,— мужчына папраўляе кепку і прытульваецца плячом да гадзінніка.

Усярэдзіне гадзінніка нешта скрыгоча.

Дзінь! Бім! Бом!

Пакуль гучыць і памнажаецца гулкім калідорам рэха металічнага ўдару — па сценах пакоя ляцяць срэбныя кляновыя лісты. Яны падаюць, павольна перакручваюцца і з лёгкім звонам чапляюцца вострымі рожкамі за шурпатасці тынкоўкі.

Гук, што раптоўна ўзнік у глыбіні чорнай скрыні і напоўніў кватэру, змаўкае...

— Каб яго! Я нават спалохаўся, як ён ляснуў! — кажа адзін з мужчын.

— Выносьце хутчэй,— гаворыць мужчына ў плашчы і накідвае на гадзіннік посцілку.

— Узялі!! — у два галасы вымаўляюць адно слова мужчыны і бяруць на плечы гадзіннік.

Яны крыху пагойдваюцца і павольна ідуць па калідоры.

— Слухай, а ты не ведаеш, куды старая клала ключ ад гадзінніка? Усё агледзеў, нідзе няма,— мужчына звужае маленькія вочкі і зазірае ў Валодзькаў твар.— Дык, можа, ведаеш?

— Не, не ведаю...— адказвае Валодзька і зачыняе дзверы свайго пакоя.

...Мужчына тупае ля пакоя бабы Веры, шчоўкае ключом і таропка выходзіць з гулкай кватэры.

Супакоенасць вяртаецца да хлопчыка паступова, разам з аднастайным шумам ветру і дажджу. Ён выходзіць на балкон, дзе пад мокрымі лавамі сядзяць галубы. У шкапчыку знаходзіць хлеб, крышыць і кідае птушкам. Здымае з паліцы чайнік, напаўняе яго вадой і палівае ўсе кактусы, што растуць на падваконні. Чайнік ставіць на заўсёднае месца, побач з кубкам.

Каля пакоя суседкі ён спыняецца. На дзвярах новая паска паперы з тым жа неразборлівым подпісам і чарнільнай пячаткай. Хлопчыку здаецца, што там, за дзвярыма, цікае гадзіннік. Валодзька прыціскаецца шчакой да патрэсканай фарбы і некаторы час прыслухоўваецца да аднастайнага бомкання буйных кропель.

# Браты

— Усё. Хопіць на сёння, мяне чакаюць,— сказаў Валік свайму шасцігадоваму брату.

— Яшчэ пачытай. Пра брацікаў, цара і цмока,— запярэчыў малодшы.

— Я сказаў, што хопіць. Калі не будзеш спрачацца і будзеш слухацца, то пачытаю ўвечары,— Валік закрыў вялікую кніжку ў цупкай глянцавай вокладцы, узяў брата за руку і пацягнуў з кватэры.

Каля пад'езда Валіка сустрэў яго аднакласнік — Стась. Хлопцы колькі часу шапталіся, потым заспрачаліся і пачалі злосна пазіраць на малога, які ўважліва слухаў іх размову.

— Скажы яму, каб не цягнуўся за намі,— кіўнуў Стась на малога.— Няхай бы дома сядзеў.

— Маці забараніла пакідаць яго аднаго ў кватэры, баіцца, каб не ўтварыў чаго. Гэны можа,— апраўдваўся Валік.

— Хай не плача. Праз гадзіну мы вернемся,— хударлявы, а таму з выгляду вышэйшы за Валіка Стась павярнуўся да школы.— А ты што стаіш? Спалохаўся?!.

— Не хадзі за мной як прышыты. Гуляй у двары, а мы скора вернемся,— Валік адышоў колькі крокаў, але не стрываў і азірнуўся.

Малы наважыўся заплакаць. Валік вярнуўся і схапіў яго за плечы.

— Гуляй у пясочніцы. Я прынясу табе салодкіх яблыкаў,— прашаптаў ён і кінуўся даганяць Стася, які паварочваў за вугал дома.

Малы ў сініх шортах, чырвоных сандаліках і футболцы застаўся стаяць каля пад'езда. Хлопчык праз нейкі час усвядоміў, што за ім ніхто не сочыць, і смела падаўся да вялікай калюгі. Ён зайшоў у ваду і парушыў адлюстраванне чатырохпавярховага дома. Адразу заблішчэла і разбілася каля ног хлопчыка яркае вераснёўскае сонца. Малы задаволена хадзіў па калюжыне...

— Добра, што ў мяне няма братоў... Глядзець і бегаць за імі не трэба. Сам сабе гаспадар,— сказаў Стась, калі Валік дагнаў яго на павароце да школьнага стадыёна.

— Кармі яго, мый, ды яшчэ казкі чытай, а галоўнае — глядзі, каб шкоды не нарабіў. Надакучыла, хутчэй бы бацькі прыехалі,— крыху вінавата скардзіўся Валік.

— Калі твае вернуцца?

— Заўтра абяцалі.

— А мая маці кажа, што з яе хопіць аднаго. Бацька незадаволены, сварыцца на яе ўвесь час,— Стась сагнуўся і пачаў завязваць адмыслова забэрсаныя кеды.

— Табе добра,— з зайздрасцю ўдакладніў Валік.

Школьны стадыён быў пусты. Аднапавярховая доўгая школа нежывымі вокнамі адлюстроўвала свет і двух хлопчыкаў ля баскетбольнай пляцоўкі. На дзвярах школы вісеў вялікі замок. Над уваходам быў плакат, яшчэ не злінялы і не змыты дажджамі: «Сардэчна запрашаем у школу!»

— Цікава, а дзе зараз Кульгавы? — спытаў Валік і апусціўся на доўгую лаву, умацаваную ў асфальтавую пляцоўку.

— Відаць, пайшоў дахаты вячэраць, бо я тут з паўгадзіны сядзеў. Калі лезці — трэба адразу.

— А можа, счакаем цемры? Я малога пакладу спаць,— Валік пачаў забэрсваць кеды.

— Як трэба што сапраўднае рабіць, то заўжды твой

малы замінае. Даў бы па шыі, і няхай сядзіць дома,— Стась падцягнуў спартыўныя нагавіцы з белымі лампасамі.

— Ён хоць і кульгавы, а бегае хутка,— у роспачы прамовіў Валік.— Ды я і футболку новую надзеў...

Адразу за школай, за двухметровым парканам, зробленым з тоўстых негабляваных дошак, быў школьны сад.

— Калі боязна, то не трэба звальваць на футболку. У мяне таксама кеды новыя. Я цябе не трымаю — ідзі да свайго брата: гуляй з ім у пясочніцы, будуй яму домікі, пячыце разам аладкі, а я заўтра ўсім скажу, які ты герой...

Валік адмаўчаўся. Перад хлопцамі была брамка ў сад. На дрэвах ярка свяціліся антонаўкі. Ад аднаго іх выгляду ў роце з'яўлялася сліна і кіславаты смак.

— Хутка можа Кульгавы вярнуцца, а мы тут разважаем,— голасам вопытнага сказаў Стась і з незалежным выглядам пайшоў уздоўж паркана.— Калі што якое — імёны і прозвішчы называць чужыя, але, думаю, да гэтага не дойдзе.

Хлопцы абходзілі сад, зазіралі ў вузкія шчыліны паркана, шапталіся і ўдакладнялі дэталі. У засені сада панавала цішыня. Сцежкі былі падмеценыя, ападкі прыбраныя. На акуратных дагледжаных градах цвілі яркія астры, адцвіталі ружы на невысокіх кустах, і на драўляных агароджах жаўцелі на кволых сцяблінах настуркі. Сад быў маўклівы, нішто не выклікала падазронасці, акрамя цішыні і спакою, якія панавалі над дрэвамі.

— А дзе салодкая? — прыпаў да шчыліны Валік.

— Там, за градамі з цыбуляй. Мы яе латашылі ў мінулую нядзелю,— прашаптаў Стась.

— Калі што — іншыя імёны...

Хлопцы прыкацілі парожнюю ржавую бочку і з яе ўзлезлі на паркан і саскочылі ў сад. Калі яны азірну-

ліся на сцяну, якая аддзяляла іх ад вуліцы, то заўважылі, што дошкі зверху густа выпацканы салідолам. Хлопцы адначасова паглядзелі на свае рукі. Рукі былі чыстыя, і хлопцы схаваліся за колкія кусты агрэсту.

Бульбоўнік пад дрэвам быў стаптаны, на зямлі ляжала некалькі яблыкаў, але хлопцы не сталі іх падбіраць, а адразу палезлі на яблыню і ліхаманкава, без разбору, пачалі рваць і запіхваць за пахузу і ў кішэні яблыкі.

— Кульгавы! — пранізліва закрычаў Стась і, ломячы галлё, скочыў з дрэва.

— Стаяць! Куды, падшыванцы? — з цапком у руцэ бег па градах вартаўнік.

Валік цяжка переваліўся на другі бок паркана ў пыльныя дзяды і быльнёг. Яблыкі высыпаліся ў траву і на дарогу, але Валік падхапіўся і адбег ад паркана.

На другім баку пачулася валтузня, хрубаст кустоўя і пранізлівы крык.

— Дзядзечка! Дзядзечка, не біце! Я ўсё скажу, толькі не...— енчыў Стась.

Валік стаяў метраў за дзесяць ад паркана, дошкі якога ўздрыгвалі, узбуджана дыхаў і калаціўся. Праз лаянку вартаўніка чуліся ўсхліпы Стася, які канючыў і прасіў прабачэння.

Стась, як і дамаўляліся, сваё прозвішча схлусіў, але Валікава назваў дакладна, нават сказаў, дзе і кім працуюць яго бацькі.

Праз паўгадзіны вартаўнік вывеў хлопца з брамкі школьнага саду. Стась ледзь перастаўляў ногі ў мокрых нагавіцах з белымі лампасамі, твар яго быў чырвоны і заплаканы. Вартаўнік кульгаў побач і трымаў Стася за каўнер.

Валікава радасць, што здолеў уцячы, змянілася горкім пачуццём расчаравання, злосцю і крыўдай на аднакласніка, які так бессаромна здрадзіў.

Валік вылез з кустоўя, дзе хаваўся, і, абураны ўжо

на сябе самога, падаўся ад школы і свайго дома ў процілеглы бок. Ён яшчэ з гадзіну бадзяўся па гарадку, прыдумваў на заўтра апраўданні, але ў галаву нічога добрага не ішло, і ён, калі на вуліцы добра сцямнела, крадком пашыбаваў дадому. Прадчуванні былі самыя благія — усё было супраць яго...

У бязлюдным двары пагойдвалася і прывідна свяцілася бялізна. Вокны Стасевай кватэры ярка гарэлі, і па фіранках рухаліся энергічныя цені.

Толькі ў кухні, калі Валік убачыў каструлі з вячэрай і непрыбраны на стале посуд, ён успомніў пра брата. Толькі тут, у пустой гулкай кватэры, яму па-сапраўднаму зрабілася страшна. Па целу разлілася гарачай хваляй млявасць, далоні і лоб зрабіліся мокрымі ад халоднага поту...

Валік выбег на лесвічную пляцоўку і спачатку ціха, а потым гучна паклікаў брата. Рэха гулка паляцела на гарышча, скацілася па стаптаных прыступках у сутарэнні і, знясіленае, вярнулася да яго. У пад'ездзе запанавала невыносная цішыня, у якой было толькі дыханне і ўдары Валікавага сэрца. Суседскія дзверы былі зачыненыя, і на грукат і званкі ніхто не адазваўся.

Валік не зачыніў дзвярэй, не згасіў святла і выбег у двор. Мокрыя прасціны білі па твары, ён нервова рассоўваў іх, клікаў брата... Ён адчуў слабасць, ногі не слухаліся, і, каб супакоіцца, ён сеў на брудны борт пясочніцы. Праз мінуту ён падхапіўся і напрасткі, праз цёмны парк пабег да возера. Ён спыняў позніх прахожых, але ніхто не бачыў малога ў пасястай футболцы, сініх шортах і чырвоных сандалях.

На беразе возера, пад ніцымі вербамі сядзелі парачкі і цалаваліся. Срэбным слюдзяністым слупом, ад берага да берага, ляжала адлюстраванне поўні...

Валік забыўся пра ўсе падзеі сённяшняга вечара, забыўся пра аднакласніка і кульгавага вартаўніка, пра

высокі паркан і разгалістае дрэва — ён думаў толькі пра брата. Ён жадаў толькі адзінага і дзеля гэтага гатовы быў прыняць любое пакаранне: ад бацькоў, настаўнікаў, ад усіх, без розніцы,— абы знайсці малога, знайсці як мага хутчэй...

Калі стрэлкі гадзінніка сышліся і на імгненне спыніліся на лічбе дванаццаць, у кватэру зайшла незнаёмая жанчына. Яна трымала за руку хлопчыка ў сініх шортах, чырвоных запэцканых сандалях і пасястай футболцы.

— Гэта мой брацік! — сказаў малы і сеў на канапу.— Гэта наш дом.

— Добра, што малы вуліцу і нумар дома ведае, а то не ведала б, куды і весці,— жанчынаківала галавой і ўважліва аглядала кватэру.

— Мой брацік,— зноў сказаў малы, пабег у кухню, вярнуўся і стаў побач з Валікам.

— На кацельні знайшла. Я там прыбіраю. Гляджу — цёмна, а ён сядзіць і гуляе сабе з кацянятамі і ісці нікуды не ідзе. А бацькі дзе? — раптам строга спытала жанчына.

— Тата з мамай паехалі да дзеда, далёка-далёка, яны мне яблыкаў прывязуць,— адказаў малы.

Жанчына яшчэ колькі пастаяла, паківала незадаволена галавой і сышла. Што яна гаварыла — Валік не чуў. Ён абмацваў малога, гладзіў яго па галаве, выціраў мурзатыя шчокі і хутка-хутка распранаў: нязграбна і нервова сцягваў футболку, здымаў шорты, скідваў сандалікі...

— Ну ты...— ён хацеў дадаць: — Ідзі мыцца! — злосна, як прарвала, закрычаў ён на малога.

Валік замкнуў кватэру на два замкі, патушыў святло ў пакоі і памыў посуд.

Калі ён вярнуўся ў пакой, малы сядзеў у ложку і сонна міргаў вачамі. Валік хадзіў па пакоі, ён не знаходзіў сабе месца.

— Я не хачу спаць. Пачытай мне казку. Пра брацікаў — ты ж абяцаў,— з крыўдай у голасе запатрабаваў малы.

Валік спачатку не зразумеў, пра што пытае брат, што і калі яму абяцаў, якую казку...

Старэйшы пакорліва ўзяў кніжку, разгарнуў і сеў на ложак.

— Жыў-быў цар. Было ў цара вялікае царства. Было ў цара два сыны-царэвічы: адзін старэйшы, а другі малодшы.

Калі прыйшоў час паміраць цару, то паклікаў ён сыноў сваіх царэвічаў і кажа: «Калі добра будзе каму з вас — то пакліч брата. Калі блага будзе каму — пакліч брата...» — Валік спыніўся...

Яго малодшы брат спаў. Валік накрыў яго і ціха паклаў кніжку на этажэрку.

Толькі калі ён распранаўся, то агледзеў, што новая футболка пад пахамі перапэцкана чорным салідолам, а рукаво падранае. «Няйначай, калі ўцякалі, зачапіўся за цвік... А Стасю я не дарую...»

# Шлягер

Кава ім не падабалася. Яе паўднёвы колер, гарачы смак і арыстакратычны водар не выклікалі іхняга захаплення.

— Гэта апошняя,— Андрэй адкаркаваў бутэльку і напоўніў шклянкі.

— Мне падабаецца піць няспешна,— Аліна запаліла наступную цыгарэту.

— А куды спяшацца? — Антон падняў шклянку і нетаропка выпіў.

Яны былі дыпломнікамі мастацкага вучылішча. Майстэрня знаходзілася на шостым паверсе вялікага вуглавога дома, які ўпрыгожвае скрыжаванне цэнтральных вуліц.

Паветра мансарды ад тытунёвага дыму і вечаровага святла выдавала падфарбаваным у сіні колер. Яго празрыстыя сувоі, працятыя вертыкалямі мальбертаў, ледзь заўважна рухаліся, змянялі выявы на пачатых і скончаных палотнах.

Яны сядзелі вакол груваасткага дыктавага подыума. Абрус замянялі лісты шчыльнай белай паперы. На ёй, пасярэдзіне подыума, мясціўся нацюрморт: бутэлька з віном, некалькі яркіх цукерак, цыгарэты, кансароўка-попельніца і тры шклянкі.

Месяц таму Антон і Аліна пасварыліся. Цяпер яна спала [redacted] Андрэем. Антон гэта ведаў. Яны сядзелі поруч і пілі таннае віно. На паперы заставаліся вінныя плямы.

— Ён паказваў сваю новую карціну,— Аліна ад-

піла глыток, збіла попел.— Люблю чырвонае віно,— яна прымружыла веі.

Калі яна хвалілася ці жадала здзівіць, то прыкрывала вочы, гаварыла павольна і расцягвала словы.

— Ад яго пад раніцу страшэнна смажыць і галава баліць, а п'ецца добра,— голасам знаўцы, які выносіць прысуд, сказаў Антон і перакуленай шклянкай аддрукаваў на паперы ланцуг.

— Яго новыя карціны...— пачала Аліна.

— Як і ранейшыя,— перапыніў Антон.— Толькі называюцца інакш,— Антона зачапіла, што не яго, а Аліну запрасіў да сябе ў майстэрню кіраўнік дыпломаў.— Мне і старыя не падабаюцца. А ён не прапаноўваў табе пераспаць з ім?

— Я кажу, ён паказваў карціну.

— Пра карціны мы чулі. Не трэба заводзіцца,— паспрабаваў супакоіць Андрэй.

— Яшчэ ён прапанаваў напісаць мой партрэт,— голасам, які злаваў Антона, сказала Аліна.

— Абавязкова партрэт? І пажадана ў поўны рост. А лепш аголеная... Стары разумее,— падкрэслена здзекаваўся Антон.

— Кінь ты! Ён стары для яе.

— Чаму стары? Яму толькі пяцьдзесят,— Аліна дапіла віно і ўзяла цыгарэту.

— Нельга адмаўляць старому чалавеку. Гэта негуманна, неміласэрна. Што табе, цяжка? — голас Антона дакладна перадаў інтанацыі кіраўніка.— Мы не будзем крыўдаваць. Праўда? — ён паляпаў па плячы Андрэя.

— Не,— Андрэй кіўнуў галавой.

— Бачыш, мы добрыя,— Антон пачаў заводзіцца.

— Заткніся! — Аліна падхапілася з крэсла і паваліла бутэльку. Цёмная пляма, як расціснутая кветка, заблішчэла на белым аркушы.

— Дура,— задаволена і спакойна кінуў Антон і паставіў бутэльку.

П'янымі яны не былі, але і цвярозымі назваць іх было цяжка.

Аліна гучна смяялася, хістала мальберты і тушыла амаль цэлыя цыгарэты. У майстэрні цямнела. Антон перакуленай шклянкай ствараў не то выявы крыжоў, не то геаметрычных кветак.

У чатырох вокнах, як на каляровай стужцы, кадравалася травеньскае неба. Усе маўчалі. Унізе, за вокнамі, звінелі трамваі. Сіні водбліск ад выкрасленых трамваямі іскраў прабягаў па нахіленай столі мансарды. Нехта з хлопцаў павінен быў сысці.

— Дап'ем віно?..

— Антону не трэба — будзе балець галава,— Аліна выйшла з-за палатна.

— У цябе ніхто не пытаў,— Антон паставіў сваю шклянку да бутэлькі.— Суцеш старога чалавека!

— З ім я піць не буду,— Аліна павярнулася, пайшла да дальняй сцяны і села там паліць.

— А я вып'ю. Давай, Антон, шклянкі,— Андрэй разліў рэшткі і паставіў бутэльку на падлогу.

— За што?

— За нас.

— За вас я піць не жадаю,— ён пашукаў вачамі Аліну.— Я вып'ю... Я ведаю, за што.

Яны моўчкі выпілі.

— Я стаміўся,— Антон падняўся.

— Пойдзеш дахаты?

— Не ведаю. Пайду прайдуся.

— Глядзі. Лепш ідзі дахаты,— Андрэй падняўся следам за ім.

Антон адчыніў замок, запаліў цыгарэту і пайшоў. Андрэй колькі часу стаяў на пляцоўцы. Нарэшце грукнулі пад'ездныя дзверы і зрабілася ціха.

Аліна сядзела на подыуме, які быў засланы вялі-

кім кавалкам палатна, складзенага ў некалькі столак. Андрэй лёг і паклаў галаву ёй на калені.

— А калі хто прыйдзе? — спытала Аліна і паставіла шклянкі на падлогу.

— Не адчынім.

Яна вызвалілася з яго абдымкаў, паднялася і праз галаву скінула сукенку. Сіні водбліск зрабіў яе цела гіпсавым, а калі згас — яна наблізілася да Андрэя і пакорліва лягла побач...

— Антон! — у яе голасе быў жах.

Андрэй павярнуўся на спіну. У прастакутніку акна цёмным абрысам на папяловым небе стаяў Антон. Яго твар прыціскаўся да шкла. Растапыраныя далоні трымаліся за гэтую нябачную перагародку між пакоем і небам. Андрэй павольна рушыў да яго. Цёмная постаць кранулася, далоні заслізгацелі па шкле. Па чарзе ён з'явіўся ў кожным з чатырох вокнаў.

Калі Андрэй выбег на вуліцу, Антона там не было. Спыняліся і адыходзілі трамваі. Спяшаліся людзі. Андрэй каля пажарных драбін паглядзеў на вокны майстэрні, на вузкі, як ступіць нагой, карніз і адчуў спустошанасць і цвярозасць.

З іх трох толькі Аліна працягвае пісаць карціны. Раз на тры-чатыры гады яна прыязджае да бацькоў і тэлефануе Антону ці Андрэю. Яны сустракаюцца, заходзяць у кавярню, займаюць асобны столік і п'юць каву.

Аліна скардзіцца на мужа, хваліцца сынам.

Яны рады гэтым сустрэчам.

## Колер хакі

Нашы ложкі былі побач — на другім ярусе, насупраць вялікага акна, з якога ўвесь час цягнула сцюжай. За акном хістаўся ліхтар, і яго сіняе нежывое святло перашкаджала спаць. Нават калі на вуліцы было ціха — ліхтар пагойдваўся, і святло паліравала нашы змарнелыя твары.

— Гэй, Пятак, раскажы, якія ў тваёй Касі грудзі! — загадваў сяржант і піхаў нагой у панцырную сетку.

Алесеў твар палатнеў, рабіўся аднолькавага колеру з падушкай. Пляма на шчацэ цямнела.

— Ты што, не чуеш? Пісьменнік!

— Ён успомніў і язык праглынуў!

— Сяржант, глядзі, каб твой салдат слінай не падавіўся. Відаць, успамінае!

— Вялікія і мяккія, а, Пятак?

— Пятак, а ты спрабаваў на раялі?

— Слізка!

У казарме рагаталі. Мой сусед маўчаў. Яго вочы былі сухімі і бліскучымі. Алесем яго звалі толькі некалькі чалавек з нашага восеньскага прызыву, астатнія карысталіся мянушкай Пятак. Мянушку далі з-за плямы, памерам у пяцікапеечную манету, якая цямнела на правай шчацэ майго суседа.

— Ты напішы ёй, каб прыехала,— чулася з цемры.— Мы пусцім цябе на КПП. Хоць паціскаеш як след, а то, відаць, забыўся...— і зноў рагаталі ў розных кутках казармы.

— Ты што, заснуў? — піхалі ў ложак.

— Ён спіць? — пыталіся ў мяне.

— Спіць,— адказваў я.

У казарме яшчэ з паўгадзіны ішлі размовы пра прыгажосці жаночага цела, пра віно, ежу, бойкі, расказвалі анекдоты.

Алесь ляжаў з адкрытымі вачамі: нерухомы, як нежывы. Сіняе святло рабіла твар ненатуральным, як на экране чорна-белага тэлевізара.

Мы страшэнна стамляліся. Ногі, спіна, рукі цяжка гулі, нават паварушыць пальцамі было балюча. Мы прачыналіся ў тых жа позах, што і кладліся. Раніцай мы не ўсведамлялі, што пачаўся новы дзень, што прыйшло ранне. Мы перасталі чакаць змены і ведалі, што новы дзень, акрамя новых клопатаў, не прынясе нічога новага.

Алесь штодня пісаў лісты да Касі. Ён знаходзіў вольную хвіліну, забіваўся дзе-небудзь у кут, згінаўся над паперай, прыкрываў яе рукой і пісаў. Калі яго клікалі, то ён падхопліваўся, спалохана азіраўся, згортваў паперы, хаваў стрыжань у кішэнь і з пачырванелымі вачамі бег на крык. Я ведаў, што ён не атрымліваў адказаў на свае лісты.

Аднойчы ліст выцягнулі і ноччу прачыталі ўголас на ўсю казарму. Не ведаю, як мой сусед прачнуўся, відаць, ад рогату, а можа, адчуў нядобрае і падхапіўся.

— ...Ты прасіла мяне расшпіліць маланку, і я доўга, бо рукі дрыжалі, а я хваляваўся, не мог яе знайсці. Ты смяялася з маёй нязграбнасці, а я чырванеў. Ты спакойна скідала сукенку праз галаву, і яна падала да нашых ног. Я клаў яе на раяль, а яна саслізгвала на падлогу, і ты злавалася. Потым ты прычэсвалася, а я разгублена і збянтэжана глядзеў на цябе. Я ўвесь час баяўся, што хто-небудзь з тваіх сяброў зойдзе ў пакой і ўбачыць цябе, але я і хацеў, каб хто зайшоў і ўбачыў

нас разам. Ты ўпэўнена хадзіла па пакоі, прыбірала сваю сукенку ў шафу. Ты адлюстроўвалася ў цёмным акне, у шафе, у паліраваным раялі, у вялікім люстры, а я саромеўся і баяўся падняць вочы...

Алесь стаяў у споднім і прасіў, каб супыніліся, каб аддалі ліст. Але яго тонкі інтэлігентны голас яшчэ больш заводзіў публіку. Асобныя радкі і абзацы перачытваліся па некалькі разоў.

— ...а я саромеўся і баяўся падняць вочы. Ты кудлаціла і блытала мае валасы, закрывала мне вочы і казала, што я твой самы ўлюбёны кавалер. Ты накідвала вялікую мужчынскую кашулю і садзілася мне на калені. Мне здавалася, што я губляю прытомнасць, а ты смяялася...

Алесь бегаў ад ложка да ложка, блытаўся ў лабірынтах-праходах, падаў. Яго голас зрываўся на свісцячы шэпт, здавалася, што яму выбілі зубы. Потым ён пачаў рухацца запаволена, яго белую прывідную постаць пачало хістаць.

— ...Я не заўважыў, што скончылася музыка. Ты пацягвалася, адпускала мяне з абдымкаў і прасіла памяняць касету. У пакоі пахла кветкамі, тваім целам і парфумай — мне здавалася, што я вельмі п'яны...

— Давай далей, што спыніўся! — крычалі з цемры казармы.

Алесь стаяў сярод казармы.

— ...пахла тваім целам... я п'яны. Я прачнуўся раней за цябе. Мне было сорамна за маё нязграбнае цела. Я апрануўся і сеў у крэсла. Раніцай ты была сумная, на вуліцы ішоў дождж. Ты казала, што ўсё будзе добра, і развіталіся мы неяк хутка, я не паспеў табе ўсё сказаць...

Ліст Алесю аддалі. Кінулі на падлогу.

— Пятак, дык ты пісьменнік. Заўтра напішаш маёй,— сказаў сяржант, што ляжаў на першым ярусе пад намі.

— Ёй трэба не Пятак, а такі, як я,— зарагатаў нехта ў куце казармы.

— Лепш я. Раніцай ёй не было б сумна,— сказаў і пазяхнуў сяржант.

— Як ён там напісаў? Гладкія доўгія ногі і грудзі?

Алесь стаяў нерухома і глядзеў у падлогу, вакол чуліся рэплікі, парады, здзекі — ён не адказваў, і здавалася, што ён не чуе і нічога не бачыць.

Алесь падняў ліст і басанож, па халоднай падлозе, пацягнуўся ў прыбіральню. Калі я прыйшоў туды, ён кінуў парваную на дробныя шматкі паперу ва унітаз і пусціў ваду. Я даў яму палову цыгарэты, але ён адмовіўся. Было халодна, мяне пачало калаціць, і я вярнуўся ў казарму.

Сярод ночы я прачнуўся ад холаду. Мой сусед ляжаў паверх коўдры і глядзеў на сіні ліхтар.

— Гэта невыносна...— шаптаў ён.

— Што? — не зразумеў я.

— Ты што, не бачыш?

— Ліхтар?— выдыхнуў я сіняй парай.

— Жалеза. Скрыгат жалеза.

— Накрыйся,— я пачаў нацягваць коўдру паверх галавы.

— Я збягу,— сам сабе прашаптаў ён.

Мы падхопліваліся з халодных ложкаў у выстылую за ноч казарму. На падваконнях і на шкле была шэрань. Мы беглі ў прыбіральню, звягалі вёдрамі, хапалі анучы і рыхтаваліся да ранішняй уборкі. Пасля зарадкі запраўлялі свае і чужыя ложкі, шаравалі з содай чорныя пісягі на лінолеуме, выціралі са шкапчыкаў і падваконняў пыл, якога не было.

Алесь увесь час працаваў у бібліятэцы — так называлі прыбіральню. Парэпанымі ад хлёркі і халоднай вады рукамі ён цёр кафляную падлогу — гуляў у шаш-

кі, чысціў да гарачага бляску медныя краны, мыў і шараваў унітазы і рукамыйнікі.

З раніцы ўсе былі злосныя. Нашча палілі, сплёўвалі на падлогу і прыспешвалі Алеся.

Дзень новы быў падобны да мінулага, як пачышчаныя салдацкія гузікі.

Былі вечары, калі ўся рота стомлена валілася на ложкі і пасля двух-трох-сто разоў чутых анекдотаў засынала. Гэта былі рэдкія вечары. Нехта цяжка ўздыхаў, выкрыкваў каманды, лаяўся, стагнаў...

Шаргацела па бляхах падваконня завея, курэла вакол ліхтара сіняя крупа, вецер лізаў шкло.

Такімі вечарамі Алесь расказваў мне пра сябе, пра маці — настаўніцу малодшых класаў і зрэдку гаварыў пра Касю.

Грукалі боты — па казарме праходзіў дзяжурны па роце. Алесь замаўкаў, мы рабілі выгляд, што спім.

— ...Яна вучыцца на трэцім курсе. Некалькі разоў я хадзіў на канцэрты ў кансерваторыю. Уяўляеш: вялікі чорны раяль, а каля яго кветкі, шмат кветак. У зале цішыня. Потым апладысменты... Яна заўсёды выступае ў доўгай аксамітнай сукенцы, а ў валасы падвязвае чырвоную стужку... Яна прытрымлівае спадніцу, робіць паклон, падыходзіць да раяля, садзіцца, папраўляе спадніцу, ставіць ногі ў бліскучых лакавых чаравічках на педалі і разгортвае ноты...

Звычайна ў гэтым месцы ён спыняўся і паварочваўся на спіну.

— Пасля канцэртаў мы разам з яе сябрамі ішлі да яе. Я звычайна нёс кветкі. Яна казала, што мне пасуюць букеты ў шалёсткім цэлафане. Кветкі пахлі парфумай і снегам... Дома мы вячэралі, пілі віно з высокіх крыштальных келіхаў, уключалі магнітафон і танцавалі. Кася апранала джынсы і мужчынскую кашулю, а сукенку хавала ў шафе...

— Давай спаць,— прапаноўваў я.

— Ведаеш, аднойчы я застаўся ў яе. Гэта было вясной, на яе дзень нараджэння...

— І што? — цікавіўся я.

— Я не магу. Я збягу. Расклад цягнікоў я ведаю. Мне трэба ўбачыць яе. Хоць на некалькі дзён.

— Гэта нічога не зменіць. Заляціш у дысбат, і ўсё.

— Ты не разумееш. Спі.

Мне сніўся раяль. Маладая жанчына ў аксамітнай сукенцы. Вялікая шафа, у люстэрку якой адбіваецца яе прывабнае цела. Сукенка, якая мякка падае да нашых ног.

Музыка мне ніколі не снілася.

Вясной, калі прайшла дэмабілізацыя, мы ўздыхнулі з палёгкай. Служба зрабілася звыклай і аднастайнай. Мы нават знешне змяніліся: вопратка была чыстай, падшытай і адпрасаванай.

Алесь зрэдку пісаў лісты і не атрымліваў адказу.

Вечарамі мы размаўлялі пра службу, і дзіўна — святло ліхтара нам не замінала, хоць акно было адчынена ўсю ноч.

На той час у кожнага з'явіліся свае інтарэсы. Мяне перавялі працаваць у клуб, Алесь заступаў на варту, у нарады і ездзіў на палігон будаваць гаражы і капанеры.

Мы ляжалі перад адчыненым акном, глядзелі на цёмнае неба, на цёплыя вільготныя зоры, на матылёў, што лёталі вакол ліхтара.

Размова то перапынялася, то пачыналася зноў.

— Праз тыдзень ёй дваццаць тры,— сказаў Алесь заклапочана.

— Лепш не думай пра гэта,— параіў я.

— Не магу.

— Што ты з-за яе месца сабе не знаходзіш. Яна табе нават адказаць не хоча. А ты...

— Яна тут ні пры чым,— сказаў ён пасля доўгага маўчання.

Тут я не стрымаўся і выказаўся пра яе і пра іх адносіны. Алесь выслухаў, паглядзеў на мяне, як глядзяць дарослыя на дзяцей, і вінавата ўсміхнуўся.

— Яна любіць кветкі. Раніцай пазваню ў дзверы і аддам вялікі букет. Ёй будзе прыемна.

— Давай спаць. Ведаеш, калі ў цябе будзе дзень нараджэння — я куплю пяцьсот канвертаў і стос паперы табе ў падарунак. Каб ты пісаў ёй лісты,— сказаў я і хутка заснуў.

— Слухай, у цябе ёсць грошы? — пабудзіў ён мяне ўначы.

— Ёсць. Спі. Гадзіна апоўначы.

— Мне вельмі трэба,— ён глядзеў на мяне і загадкава ўсміхаўся.

— Ты што, ідыёт? Прачніся.

— Я не магу тут. Мне трэба быць там.

— Ты звар'яцеў! Цябе зловяць.

— Усё адно. Так будзе лепш.

Калі я чуў такое на пачатку службы, то не надаваў асаблівай увагі,— усім было цяжка, усе хацелі збегчы...

Я размаўляў да світання. Я пераконваў і адгаворваў не рабіць гэтага. Перад світаннем, калі неба пачало святлець, я пераканаў яго і стомлена заснуў.

...Пасяджэнне трыбунала адбывалася ў клубе. Перад сцэнай паставілі дыктавую агародку, пафарбаваную ў колер хакі. Я стаяў на ганку і глядзеў на пляц. Дзіўна, я адначасова бачыў сябе і ўсё астатняе. Пляц быў вымыты, і на ім ярка бялелі лініі і стрэлкі, з ганка добра чыталіся каманды на бетонных плітах. Жанчыну з афіцэрам, якія ішлі да клуба, я заўважыў адразу і здзівіўся яе нетутэйшаму выгляду. Яны па дыяганалі перасеклі пляц. Калі жанчына параўнялася з тупаносай машынай і праходзіла каля закратаванага

акенца, у яе з рук выпалі акуляры. Шкельцы разбіліся на дробныя аскепкі, а металічная аправа засталася цэлай... Потым жанчына час ад часу выцягвала яе з чорнага рыдыкюльчыка і хавала назад. Наўрад ці яна што добра бачыла. Яе твар напружваўся, вочы чырванелі, і я заўважыў, як дробна дрыжалі пальцы і крывіўся рот... Жанчына не плакала і ўвесь час маўчала...

Зала сядзела ціха. Шмат хто спаў. Маладыя салдаты вылучаліся каротка пастрыжанымі галовамі і запэцканымі гімнасцёркамі. Мікрафоны працавалі блага, і часта голас прападаў у пранізлівым свісце, які рваўся з калонак.

Алесь быў апрануты ў цывільнае. Шэры швэдар і паношаныя джынсы ў зале спрэс колеру хакі вылучалі яго і ядналі з жанчынай на краі трэцяга рада. На сцэне, побач з доўгім сталом, за якім сядзелі афіцэры, стаяў вялікі канцэртны раяль. У зале было задушліва, і ўсе дзверы давялося адчыніць. На пляцы пачаўся развод на варту, і ў залу залятала гучныя і рэзкія каманды. Мне было відаць, як Алесь уздрыгвае ад кожнага гуку, як яго твар палатнее і пляма робіцца цёмнай.

Алесь увесь час глядзеў на вялікі канцэртны раяль у куце сцэны. Раяль быў на маленькіх бліскучых колах.

Калі Алеся пад канвоем вывелі з залы, усе адчулі палёгку. Тупаносая машына пасігналіла, развярнулася на пляцы і ціха-ціха пакацілася да КПП.

У зале, калі выйшлі ўсе колеру хакі, засталася жанчына. Яна сядзела на краі трэцяга рада, трымала ў руках аправу ад акуляраў і выцірала яе белай хусцінкай. Жанчына не плакала.

Нарад па клубу пачаў насіць ваду і мыць залу. Салдаты не памылі толькі там, дзе сядзела Алесева маці...

Я прачнуўся за хвіліну да пад'ёму. Алесь спаў. За акном стаяў густы і вільготны туман. Кроплі блішчэлі на білах ложкаў.

— Слухай, мне снілася такая каламуць пра цябе.

— Што? — не зразумеў ён.
— Сон дурны сасніў.
— Даруй. Гэта з-за мяне: позна леглі.
— Нічога. У цябе ўсё нармальна.
— Галава баліць.
— Добра,— сказаў я.

Пасля снядання я пацікавіўся, ці носіць Алесева маці акуляры ў металічнай аправе. Ён сказаў, што ніколі не насіла, нават ад сонца. Яшчэ ён сказаў, што хутка ў яе адпачынак і яна да яго прыедзе. На гэтым размова скончылася. Я пайшоў у клуб. Алесь паехаў на будоўлю гаражоў.

Перад абедам я даведаўся, што Алеся заваліла цэглай.

Ён саскочыў з кузава самазвала і падвярнуў нагу. Ён не паспеў адпаўзці. Пяць тон бітай цэглы абрынуліся на яго. Калі цэглу раскідалі — Алесь быў нежывы.

— Старшына, каб табе не было сумна, паклаў на месца Пятака маладога. Не пашанцавала хлопцу,— сказаў дзяжурны па роце, калі я вярнуўся з клуба ў казарму.

Я паглядзеў на салдата, які спаў на Алесевым месцы. Пасядзеў на сваім табурэце. Потым згарнуў пасцель і перайшоў на вольны ложак у цёмны кут казармы.

Я ляжаў з заплюшчанымі вачамі і лічыў: спачатку да сотні, потым да тысячы, потым да пяці тысяч, потым збіўся і пачаў спачатку.

## «Я — Віца»

Сваё імя, прозвішча, назву вуліцы і шмат іншых, нават даволі складаных слоў Віца вымаўляе добра. Слова «алігафрэн» яму нічога не гаворыць, бо яго сэнс яму невядомы.

Двухпакаёўка на першым паверсе, у якой жыве Віця з бацькамі, выходзіць вокнамі на поўдзень. Але кватэра цёмная, бо амаль усутыч да вокнаў шэрая, складзеная з бетонных квадратаў-пліт сцяна кааператыўнага дома. Панурасць і аднастайнасць сцяны парушае вузкая шыльда з назвай вуліцы «Другая Авангардная». Белыя друкаваныя літары добра глядзяцца на ярка-сіняй эмалевай паверхні.

Сцяна кааператыўнага дома закрывае амаль увесь краявід. Толькі, калі наблізіцца да акна, бачны невялікі кавалак вуліцы і кантэйнеры са смеццем. На брудных кантэйнерах дзяжураць нахабна-палахлівыя памыйныя каты.

Але Віцю дастаткова і гэтага аскетычнага краявіду. Ён нерухома і стоена сядзіць ля падваконня і пазірае то на сцяну з шыльдай, то на аблезлыя ржавыя кантэйнеры, то на хіжых катоў, якія нетаропка прагульваюцца вакол сметніка.

Ёсць дзіўны момант, які выклікае найбольшую цікаўнасць,— гэта надыход шарай гадзіны. Віця бачыць у шкле вуліцу з цёмнай стромай сцяны, адбітак пакоя і самога сябе. Адлюстраванні і краявід накладваюцца ў шкле адно на другое і суіснуюць у адным вымярэнні — у плоскасці шкла. Віця адыходзіць ад акна на некалькі крокаў і нерухомее. Блакітныя, як у цацачнай

лялькі, вочы раз-пораз прыкрываюцца доўгімі веямі. На твары разгубленасць...

Калі знадворку цямнее, маці запальвае святло. Шкло адлюстроўвае да драбніцы знаёмы інтэр'ер пакоя і маўклівую, засяроджаную постаць трыццацігадовага Віці.

Засынае ён хутка — ледзь дакранаецца няголенай шчакой да падушкі. Сон у яго моцны і глыбокі. У сне на твары з'яўляецца спакой і задуменнасць. Віця не чуе, як заходзіць маці, як яна папраўляе коўдру, колькі часу глядзіць на сына, прыбірае рэчы, тушыць святло і прычыняе дзверы.

Шторы і фортачка ніколі не закрываюцца.

Прачынаецца Віця ў адзін і той жа час і адразу пачынае галіцца. Электрабрытва натужна гудзе, калі ён водзіць ёю па падбароддзі, шчоках і шыі. Шчэць, што адрастае за суткі, густая і жорсткая. Пасля таго як твар робіцца гладкім, а брытва гарачай, Віця з апетытам снедае і займае месца ля акна.

Па вуліцы, паўз клятчастую сцяну, спяшаюцца ў школу дзеці. Віця прыціскаецца высокім ілбом да шкла і ўзмахамі рукі вітае іх. Дзеці смяюцца, круцяць каля скроні пальцамі, паказваюць языкі і заварочваюць за рог дома. Віця заціскае правы кулак, а левым грукае па падваконні.

Пасля таго як падлеткі імклівымі купкамі хаваюцца за домам, Віця супакойваецца і выбіраецца на вуліцу. У гарадку яго ведаюць усе, бо ён кожнаму дае «добры дзень». Калі яму адказваюць, ён звычайна спыняецца, выцягвае з кішэні розную драбязу і хваліцца.

Бывае, хто-небудзь кідае яму ў адказ «дэбіл» і прыспешвае хаду. Віця даганяе яго, заступае дарогу, глядзіць крыху вінавата ў вочы і кажа: «Я — Віця» — пасля чаго працягвае свой рэй па пыльных вуліцах ранішняга гарадка.

Здаля Віця выдае на моцнага мужчыну, гадоў на

сорак, не надта спрытнага, але дужага і спакойнага. Ён з задавальненнем дапамагае рабочым прыбіраць кантэйнеры са смеццем. Смела, без рукавіц, хапае брудныя, заплямленыя памыямі скрыні і падае ў кузаў машыны. Мужчыны яго не праганяюць, бо Віця для іх — свой чалавек, дармавая дапамога. На сметніках і ў кантэйнерах Віця і знаходзіць рэчы, якія нясе дахаты. Ад гэтых знаходак звычайна сыходзіць кіслы і цяжкі смурод. Пах сметнікаў характэрны не толькі для Віці, але і для яго пакоя. Паветра, хоць фортачка ўвесь дзень адчыненая, густое і цяжкае. Раней на яго сварыліся, але пазбавіць заганнай звычкі не змаглі...

Віцю шанцуе — ён знаходзіць вялікі акварыум і адразу кідае працу, хапае акварыум, надзявае яго на галаву і спяшаецца дахаты.

Віця шыбуе праз увесь гарадок. Яго галава ў шкляной скрыні скульптурная і значная. Кучаравыя валасы прыліплі да высокага лба, з твару знікла звычайная млявасць.

Віця крочыць сярэдзінай вуліцы і ўчэпіста трымае за жалезныя канты цяжкі акварыум. Ён спяшаецца і не чуе, што кажуць прахожыя яму ўслед.

Акварыум амаль цалкам займае стол каля акна.

Віця доўга цягае слоікам ваду і супакойваецца, калі акварыум робіцца ўкрай поўным.

Акварыум бацькі не выкідваюць, бо занадта ён вялікі і цяжкі, дый Віця не адыходзіць ад яго.

Ужо некалькі дзён у акварыуме плавае даволі ладны карась, якога Віця ўратоўвае ад чорнай траскучай патэльні. Карась млява варушыць плаўнікамі, а Віця зачаравана цікуе за павольнымі рухамі залацістай рыбіны, за бліцамі, што ўспыхваюць на яе баках.

Дні праходзяць у маўклівым сузіранні шкляной скрыні. Віця крышыць у ваду хлеб і пазірае, як рыбіна павольна ўздымаецца да паверхні і ляніва хапае яго. Карась то тыцкаецца ў пясок і на дне застаюцца мяккія

хвалістыя баразны, то абыякава вісіць у зеленаватай тоўшчы вады і не зважае на хлеб, што размяклымі сняжынкамі ападае на дно.

Карась спыняецца ля шкляной сцяны і нерухомее. Віця ўпіраецца падбароддзем у стол, і позірк яго спыняецца на круглых вачах рыбіны. Карасю надакучвае нерухомасць, і ён імкліва зрываецца з месца. Вада робіцца каламутнай, і мільгаюць павялічаныя шклом: то пукатая галава, то цьмянае золата лускі, то рухавы плаўнік, то цёмны веер хваста...

— Стой! Стой! — просіць Віця, але рыба, захопленая сваім танцам, не чуе яго загадаў.

Раптоўна карась спыняецца каля дна, а Віцю ахоплівае жах, што яго рыба знікла.

Ён апускае ў акварыум рукі з тоўстымі растапыранымі пальцамі і абмацвае ваду. Карась спалохана б'ецца ў далоні, выскоквае над паверхняю. Віця супакойваецца, выцягвае рукі і расплёхвае цёплую ваду на падлогу і мокрымі рукамі пачынае крышыць хлеб.

— Рыба. У мяне рыба! — кажа Віця і радасна, крыху разгублена смяецца.— Я маю рыбу! — хваліцца ён дзецям, што з цікаўнасцю глядзяць на акно.

Віцю здаецца, што словы не пераконваюць, і тады ён апускае рукі ў акварыум, ловіць карася, моцна сціскае яго і, узбуджаны, падымае над галавой. Малыя бачаць толькі вялікую галаву з адкрытым ротам і хвост, які сударгава трапечацца і млява павісае. Кроплі бягуць па шкле і пакідаюць празрысты след.

— Вялікая! Карась! — дзеці, задаволеныя выглядам рыбы, бягуць у суседні дом.

— Карасік,— ціха гаворыць Віця і асцярожна кладзе рыбу ў ваду.

Карась апускаецца на дно, павольна перакульваецца на спіну і ўсплывае.

Віця пальцам піхае яго ўглыбіню, але карась упар-

та ўсплывае да паверхні, ледзь бачна падрыгвае плаўнікамі.

Віця не адыходзіць ад акварыума. Ён крышыць у ваду хлеб, трымае рыбіну ўглыбіні, падсоўвае ёй мокрыя крошкі... Карась пераварочваецца і ляжыць на паверхні.

Пад вечар рыбіна цвярдзее, золата лускі блякне, бакі ўздуваюцца. Яна, як драўляная, ляжыць на вадзе...

— Тсс! — шэпча Віця і прыкладае палец да вуснаў.— Карасік спіць. Ён заснуў.

Маці глядзіць на сына, ківае галавой і выходзіць з пакоя.

Віця распранаецца і кладзецца ў ложак.

Уначы маці выцягвае з акварыума рыбу, якая пачала смярдзець, і праз фортачку выкідвае яе ў бок сметніка. У цемры чуюцца хіжыя крыкі катоў і злоснае каўканне.

Віця прачынаецца як ніколі рана. На вуліцы шчыльны шэры туман. Відаць толькі край сцяны і вузкую сінюю шыльду. Акварыум пусты. Віця будзіць бацькоў і паўтарае толькі адно слова: «Рыба? Ры-ба?» Бацькі палохаюцца, пачынаюць тлумачыць, што карась памёр, і абяцаюць купіць новага.

Віця ведае шмат розных, нават даволі складаных слоў — і цяпер, перад кубам з зеленкаватай вадой ён паўтарае кароткае слова «памёр» і намагаецца зразумець яго сэнс.

## Шэры матылёк

У кухні сонечна і ціха. Бацькі на працы. Я адзін у кватэры. За акном пыльны, асветлены сонцам гарадок. Разглядаю знаёмыя будынкі, знаёмыя абрысы дахаў, купіны вялікіх шэрых таполяў. Усе справы засталіся там — у сталічным горадзе. У мяне тры вольныя дні. Не трэба ісці на працу, спяшацца, чакаць. Можна доўга спаць, праглядаць некалі прачытаныя кнігі, гуляць ля возера, у парку. Гарадок амаль не змяніўся. Жоўты трохпавярховы будынак школы, цагляныя дамы, іржавыя дахі, белыя коміны і над усім — вялікія таполі. Некаторыя дамы афарбавалі па-новаму, але ўжо некалі яны былі такімі, і таму гэтыя змены не здзіўляюць. Аднойчы я спрабаваў напісаць свой гарадок, стварыць дакладны краявід...

Званок. Адзін доўгі, два кароткія. Хто гэта можа быць? Іду ў калідор і адчыняю дзверы.

— Не чакаў?

— Ведаеш, не. Праходзь у кватэру.

Мы падаём адзін аднаму руку. У яго моцны поціск. Ён раней таксама моцна сціскаў маю далонь пры сустрэчы ці развітанні.

— Я даведаўся, што ты прыехаў, і вырашыў завітаць. Даўно не бачыліся, не тое што ў школе. Штодня тры гады за адной партай. Каб ты не пайшоў вучыцца, то і далей сядзелі б побач.

Згодна хітаю галавой. Ён Віктор. У класе ва ўсіх былі мянушкі. Сабе мянушку ён зрабіў сам, змяніўшы націск. Таму ў яго была мянушка-імя. Нават некаторыя настаўнікі звалі яго «Віктор». У гэтым была пава-

га да здольнага хлопца. Мы яму зайздросцілі. Вучыўся Віктар лепш за ўсіх у класе. Вучоба давалася яму лёгка, без асаблівых намаганняў. Да ўсіх урокаў ён ставіўся аднолькава, адказваў роўна і ўпэўнена. Мы не ведалі, якія прадметы яму падабаюцца.

— Ты што, не пазнаеш, так разглядаеш?

— Даўно не бачыў, вось і гляджу. Праходзь у залу, сядай дзе зручней.

— Мо пойдзем на вуліцу. Надвор'е неблагое, хоць і горача.

— У другой палове дня абяцалі навальніцу.

— А ты змяніўся,— кажа ён і садзіцца да стала.

— Час. Толькі наш гарадок не мяняецца.

— Ты змяніўся, выглядаеш па-даросламу.

— Жартуеш, Віця? — нечакана нават для самога сябе я называю яго Віця. Ён уважліва глядзіць на мяне і паварочваецца да стала. У яго бліскучыя каштанавыя вочы ў чорнай аблямоўцы веек.

— Надоўга дадому?

— На тры дні, потым зноў праца.

— А ў мяне вакацыі, яшчэ месяц вольнага часу.

— Зайздрошчу — адпачнеш.

— А ты ведаеш, не стаміўся, адпачываць няма ад чаго.

Між шыбаў лётае матылёк. Ён стукаецца ў шкло. Крылы складваюцца і робяцца шэрымі, разгортваюцца, і я паспяваю заўважыць два карычневыя кругі ў белай аблямоўцы. За шклом неба. Бухматыя цяжкія аблокі вісяць над іржавымі дахамі, над пыльнай зялянінай дрэў, над ружовымі дамамі, над збялелым, зліняслым ад сонечнага святла асфальтам. Матылёк на імгненне сцішэў, склаў крылы. Потым пачаў караскацца па вертыкальнай сцяне шкла. Здавалася, што ён сядзіць на вільчыку даху, потым на срэбным дроце тэлеантэны, на коміне, мяняе напрамак і трапляе на франтон жоўтага дома. Шэры матылёк у жоўтым трохкутніку, по-

бач з люкарнай. Жоўты будынак школы пад зялёна-папяловымі таполямі. Так і трэба пісаць краявід гарадка...

Мой госць сядзіць, паклаўшы моцныя інтэлігентныя рукі на калені. Ён разглядае карціны, што вісяць у прасценку, між кніжнаю шафай і акном. Я прыглядаюся да яго. Заўважаю бледнасць твару, пад вачамі сінятыя кругі.

— Што глядзіш так уважліва? — ён паварочвае галаву.

— Нешта ты бледны, не загарэлы?

— Не загараў... Вось і бледны. Ты таксама не эталон здароўя.

— Я і прыехаў адпачыць. Стаміўся. Шмат працы. Амаль паўгода з майстэрні не вылазіў. Ды і засталося шмат чаго дарабляць.

— Добра чалавеку, калі ў яго ёсць праца,— ён змоўк, не дагаварыў фразу.

— Ну, а як ты, Віця?

Ён зноў уважліва глядзіць на мяне, тонкія вусны крывяцца ў спробе ўсміхнуцца.

— Жыву... Не ведаю, як і адказаць. Ты ведаеш, чаму я завітаў да цябе?

— Добра, што прыйшоў.

— Я хацеў пагаварыць.

— Са мной?

— Я спрабаваў з іншымі, не атрымліваецца. Слухай, у цябе была калі-небудзь бяссонніца? Не было? А ты ведаеш, што гэта такое? Хоць адкуль, калі ў цябе яе не было.

Я сачу за матыльком, што спрабуе прабіцца праз шкло на вольнае паветра, апынуцца ў прасторы краявіду.

— Кладуся спаць, хоць ведаю, што не засну. Ведаю, што доўга буду глядзець у сцяну. Чаму ў сцяну?

Я засынаю толькі тварам да сцяны. Засынаю — перада мной сцяна, прачынаюся — бачу сцяну.

Матылёк зноў на даху школы. Я вучыўся ў гэтай школе. Твары аднакласнікаў успамінаюцца цьмяна, невыразна. Дэталі, словы — белыя фартухі, сінія касцюмы...

— Памятаеш, як мы з табой пажартавалі з Лінзы. Гэта было ў восьмым класе. Апошнім часам я ўспамінаю гэты выпадак даволі часта.

Ён сядзеў побач з намі, праз праход. У яго былі вялікія акуляры ў чорнай пластмасавай аправе, з пукатымі круглымі лінзамі. Ідыёцкія акуляры, памятаеш іх? На ўроку матэматыкі ён заснуў. Ты першы гэта заўважыў. Ён спаў, сціскаючы ручку. Здавалася, што ён уважліва слухае настаўніка. Ты адарваў два кавалкі паперы ад сшытка. Я паслініў іх і нячутна заляпіў шкельцы акуляраў. Ён нават не варухнуўся, нічога не адчуў. Потым я нахіліўся да яго і сказаў на вуха: «Лінза, да дошкі!» Ён падхапіўся і закрычаў. Ён не разумеў, што з ім, размахваў рукамі, пакуль не скінуў акуляры. Нам было весела, хоць і запісалі заўвагі ў дзённікі.

Зараз я разумею яго. Гэта жахліва: прачынацца, адкрываць вочы і бачыць сцяну. Белую сцяну, і не ўяўляць, дзе ты. Толькі я не крычу — прызвычаіўся. Ты хочаш спытаць, што жонка? Яна пачынае плакаць, калі я расказваю ёй пра сцяну. Я спрабаваў змагацца з бяссонніцай. Бегаў, плаваў, займаўся на турніку, стамляўся, што ледзь прыходзіў дадому, але дарэмна — не дапамагала. Раней не ўяўляў, што такое можа быць са мной. Разумееш, менавіта са мной?

За акном нерухомыя аблокі пачынаюць цямнець. Сонца знікае. У пакоі паўзмрок. Адшукваю матылька. Ён зліўся з іржавым дахам школы і заўважаецца толькі па ўздрыгванні крылаў.

— Ты памятаеш школу? Я добра вучыўся, быў вы-

датнікам. Мне заўсёды шанцавала. Раней. Самая вялікая рыбіна трапляла да мяне. На спаборніцтвах і «алімпіядах» я перамагаў, хутчэй за ўсіх бегаў і хутка рашаў задачы. Усё атрымлівалася само па сабе, я нават не прыкладаў асаблівых намаганняў. Пасля восьмага класа, калі ты паехаў вучыцца, я сядзеў за адной партай з дзяўчынай. Тады ўсё было добра. Я займаўся спортам, трэнеры былі задаволены. Зараз выкладчыкі таксама задаволены, я лічуся адным з лепшых дыпломнікаў. Пасля школы я адразу паступіў у інстытут. У які — мяне не вельмі хвалявала, ведаў — змагу вучыцца ў кожным. Там у інстытуце гэта і пачалося. Не, не бяссонніца. Спаў я добра і моцна, вельмі моцна. Я пачаў заўважаць, што мне нецікава вучыцца, нецікава займацца спортам, нецікава чытаць, размаўляць — усё пачало страчваць сэнс. Я не кінуў інстытута, не кінуў спорта, не кінуў хадзіць на спатканні. Жыццё ішло як раней — толькі мне было нецікава, яно рухалася побач, не кранаючы мяне, як за шклом. Я не мог ні з кім параіцца, ніхто не разумеў ці не хацеў зразумець. Я пачаў заставацца сам-насам.

Падчас гаворкі ён глядзіць у акно. Моцныя інтэлігентныя рукі сціскаюцца ў кулакі. Ён сашчэплівае пальцы, зноў сціскае кулакі. Рукі рухаюцца асобна, незалежна ад слоў.

— Пасля першага курса я думаў, што стаміўся, што трэба змяніць звыклы рытм жыцця. Рытм змяніўся. Я апынуўся ў войску. Напачатку было цяжка, вельмі цяжка. Усе ранейшыя клопаты зніклі, я забыўся на свае праблемы. Да войска думаў, што там у мяне будзе час, каб знайсці выйсце і зразумець, што адбываецца са мной. Там з'явілася надзея, што калі служба скончыцца, то маё жыццё зменіцца. Разумееш, апошні год я толькі чакаў, калі вярнуся дадому. Чакаў з упэўненасцю, што ўсё прайшло, скончылася і мне зноў будзе цікава жыць.

Нарэшце я дома. Жыццё здалося новым. Я сустрэў сваю будучую жонку, мы з ёй сядзелі за адной партай у дзевятым і дзесятым, я табе гаварыў. Яна вучылася ў інстытуце. Павінна было нарадзіцца дзіця — мы ажаніліся. Я вярнуўся ў інстытут. Яе бацькі аддалі кватэру, дапамагалі, усё было добра. Нарадзілася дачка...

Зараз я зноў адчуваю, што займаюся не сваёй справай. Што ўсё, што здараецца са мной,— не маё, не кранае мяне, што жыццё не змянілася. Ты разумееш, пра што я кажу?

Між шыбаў лётае матылёк. Ён паланёны шклом. Гук, калі ён б'ецца ў шкло, мяккі, але добра чутны ў цемнаватым пакоі. Я падыходжу да акна і адчыняю фортачку. Шэры матылёк сядзіць на белай раме. Малюнак на крылах крыху сцёрся. З вуліцы пахне гарачым асфальтам і пыльнай тапалёвай лістотай. Я вяртаюся на сваё месца.

— Ты ведаеш, што рабіць. У цябе ёсць занятак, якому ты належыш. Я спрабаваў чытаць, але кнігі не пра тое, што хвалюе менавіта мяне. Спрабаваў нічога не рабіць — не дапамагло.

Я магу быць інжынерам, добрым інжынерам. Мае праекты падабаюцца. У іх няма нічога незвычайнага, яны надзейныя праекты. Толькі мне гэта нецікава. Я не магу імі займацца.

Спорт. Я кінуў спорт. Трэнеры не разумелі. Казалі, што я вельмі перспектыўны. Я не бачыў той перспектывы. Памятаеш, у восьмым класе пісалі сачыненне «Кім я хачу быць». Ты напісаў, што будзеш мастаком. Да канца заняткаў заставалася мала часу, а я не ведаў, што пісаць. Ты параіў напісаць пра спорт. Я напісаў, што мая мэта — быць чэмпіёнам. Я стаў чэмпіёнам у дзесятым. Я не разумеў, што «чэмпіён» — гэта не прафесія, не занятак, што гэта імгненны стан, кароткі, ненадзейны. Я адчуў гэта пасля і кінуў спорт....

У мяне ёсць дачка, жонка, кватэра, інстытут, здольнасці — што яшчэ трэба, каб жыць. Але не маю нечага галоўнага.

Можна кінуць інстытут, жонку, кватэру... Можна, толькі што гэта зменіць. У войску не было ні жонкі, ні інстытута, а было нецікава. Я не адчуваю сваёй неабходнасці ў жыцці. На маім месцы можа быць іншы. Ты маўчыш, добра, што не раіш паехаць на вёску.

Матылёк узмахвае крыламі, некалькі разоў натыкаецца на шкло і нарэшце вылятае на вуліцу. Неба зрабілася цёмным, чуецца далёкі гром. Дождж пакуль не пачынаецца.

— Віця, а чым займаюцца аднакласнікі, той жа Лінза?

— Аднакласнікі? Жывуць. Лінза працуе на заводзе. Кожны тыдзень ходзіць у лазню. Адпусціў бараду, носіць капялюш. Зараз у яго цёмныя акуляры ў тонкай залатой аправе. Увогуле задаволены жыццём, хоча наладзіць сустрэчу класа. Заўсёды запрашае ў лазню. Ён зробіць сустрэчу, толькі я не пайду. Не ведаю, пра што размаўляць, а сядзець моўчкі і рабіць зацікаўлены выгляд не маю ахвоты. Ва ўсіх сваё жыццё: дзеці, жонкі, праца, лазня, машына — усё як належыць. Я, можа, перабольшваю, але ты разумееш, ва ўсіх свае цяжкасці.

Ён змаўкае і глядзіць у сцяну. На твары разгубленасць. Моцныя рукі сціскаюць край стала. Нават у цемнаватым пакоі відаць, які ў яго бледны твар. Тонкія вусны крывяцца.

— Віця, а як твая дачка?

— Дачка. Ёй ужо два з паловай. Ходзім разам у парк, да возера. Я сяджу на лаве, яна гуляе ў пяску, вышуквае ракаўкі, размаўляе. Учора былі ля возера, я глядзеў на ваду, яна кранула мяне і сказала: «Тата, не спі». Яна думае, што калі я нерухомы, то сплю. Разумееш, як разважае дзіцёнак. А я ведаю, што ўначы

будзе сцяна, белая сцяна... Глядзі, як цёмна на вуліцы. Зараз будзе навальніца. Я, відаць, пайду. Прабач.

Ён падымаецца з крэсла і вінавата пазірае на мяне.

— Будзе навальніца.

— Усё абыдзецца, не хвалюйся, Віктор,— я называю яго Віктор нечакана для самога сябе.

— Думаеш?

— Так.

У калідоры мы паціскаем рукі. Яго поціск вялы і слабы. Зачыняю дзверы. Некалькі хвілін слухаю яго крокі ў пад'ездзе. Іду ў кухню. Па шкле бягуць першыя буйныя кроплі. Іржавыя дахі робяцца цёмнымі. На таполях выварочваецца лісце — моцны раптоўны вецер. Чую рэзкі ўдар і звон разбітага шкла. Звон стаіць у вушах. Спяшаюся ў залу, чапляюся за крэсла, на якім сядзеў мой госць. Зачыняю фортачку.

Ціха. Краявід гарадка ярчэе, набірае колеры: асфальт робіцца бліскуча-чорным, жоўты будынак школы на вачах ператвараецца ў зялёны.

Па шыбках бяжыць залева навальніцы. Дождж і шкло размываюць і ствараюць дакладны краявід правінцыяльнага гарадка.

# У чаканні цягніка

Да цягніка заставалася амаль гадзіна. У памяшканні станцыі было холадна, хоць па ўсіх сценах віселі рабрыстыя пафарбаваныя ў травяны колер вялікія радыятары. Высока пад столлю гарэлі тры цьмяныя лямпачкі, і іх няпэўнага колеру святло сцякала па шэрых сценах і спынялася на каменнай падлозе. Два вялікія акны, скругленыя ўверсе, былі каламутныя ад пылу і цёмныя — на вуліцы быў вечар.

За драўлянай перагародкай, пафарбаванай некалі ў белы колер, а зараз злінялы і таму жоўта-шэры, за маленькім, напалову зашклёным акенцам сядзела жанчына ў форме чыгуначніцы. Я сядзеў насупраць акенца на дыктавым крэсле. Яшчэ тры рады такіх жа крэслаў былі перада мной. Розныя надпісы перакрэсліваліся, заблытваліся і стваралі неверагодныя арабескі графічнай фантазіі пасажыраў. Чытаць кніжку было цёмна, і я разглядаў надпісы, спрабуючы зразумець, ■ якой нагоды пакідалі свае аўтографы пасажыры, чакаючы цягніка.

Жанчына праз сваё акенца паглядзела на мяне без усялякай цікавасці. Білет я набыў, як толькі прыйшоў. Ад увахода да акенца касы бачны мае вільготныя сляды, ад дзвярэй больш цёмныя і выразныя, каля касы яны расплыліся ў адну пляму, а каля майго крэсла ўжо амаль зніклі. Жанчына перабірала паперы, раз-пораз падымала якую і доўга ўглядалася ў яе, трымаючы пад настольнай лямпай. Выраз поўнага твару рабіўся зацікаўлены, але зацікаўленасць знікала хутка, як і з'ўлялася. Я падумаў, што яна, відаць, працуе апош-

нія гады, а потым пойдзе на пенсію і будзе поркацца ў сваім гародчыку і разглядаць з такой жа зацікаўленасцю бульбіну ці памідор.

За сцяной праходзілі цягнікі, грымелі рэйкі, ляскалі вагоны, грукаталі колы, і восеньскую цішыню разразаў моцны і рэзкі гудок. Пасля цягнікоў доўга і цэнька звінелі шыбкі вялікіх вокнаў. Потым зноў рабілася ціха. Я глядзеў на гадзіннік, на расклад, зноў на размаляваныя крэслы. Стрэлкі гадзінніка, здавалася, знерухомелі, і час спыніўся. На вуліцы дождж змяніўся снегам, і на чорным шкле, за якім ззялі нязменныя кропкі семафораў, пачалі з'яўляцца белыя малюнкі.

Адчыніліся дзверы. Па нагах пацягнула холадам, снег заляцеў у памяшканне, закруціўся, знік, пакінуўшы на падлозе цёмныя кропелькі вільгаці. Я падняў галаву і ўбачыў чалавека, што ўвайшоў і спыніўся ля дзвярэй. Ён патупаў нагамі, абіваючы з хромавых ботаў снег, паправіў капялюш, агледзеўся, прайшоў праз усё памяшканне, пакінуўшы на каменнай падлозе акуратныя сляды, і сеў насупраць мяне.

— Колькі зараз часу, ты не падкажаш? — глухаватым голасам спытаў мужчына.

— Дваццаць тры пятнаццаць,— не паглядзеўшы на гадзіннік, адказаў я.

— Чакаеш цягніка?

— Чакаю.

— Сустракаеш ці ад'язджаеш?

— Ад'язджаю,— сказаў я, кінуўшы погляд на сваю зялёную дарожную сумку.

— Будзем разам чакаць,— не то спытаў, не то пацвердзіў мужчына.

Я паглядзеў на яго чыста паголены твар, на снег, што пачаў раставаць на чорным футры каўняра, на мяккі, з шаўковай стужкай капялюш у кроплях вады, на чорныя скураныя пальчаткі, якія ён зняў і паклаў побач. Ён выглядаў гадоў на пяцьдзесят пяць.

— Ты ад'язджаеш, я сустракаю, а абодва чакаем. Не падабаецца чакаць,— зноў не то сцвердзіў, не то спытаў мужчына.— Працуеш ці вучышся?

— Працую,— не зусім ахвотна адказаў я і паглядзеў у акно на нязменнае сузор'е агеньчыкаў.

— Працаваць лепш, чым вучыцца, як ты лічыш?

— Не ведаю, што лепш.

— Лепш працаваць, калі праца добрая.

— Можа, і так,— пагадзіўся я.

— А я жонку сустракаю.

Некалькі мінут мы маўчалі. Мужчына агледзеў свае боты, халявы якіх блішчэлі, а ніз быў запэцканы глінай. Ля ног пачала расплывацца пляма лужыны.

— Снег пайшоў,— раптам сказаў мужчына.

— Калі я ішоў, быў дождж,— адказаў я.

— Быў дождж, а зараз снег. Ты, відаць, даўно прыйшоў.

— З паўгадзіны ўжо тут.

— Я і думаю, што з паўгадзіны. Сляды твае высахлі,— сказаў ён і абвёў позіркам памяшканне станцыі.— Мая працуе ў горадзе, прыязджае гэтым цягніком, што ты чакаеш. А ты жанаты ці не?

— Жанаты.

— Жанатаму лепш. І дзеці, відаць, ёсць?

— Не, пакуль няма.

— Цёмна на вуліцы, вось і хаджу штодня, акрамя суботы і нядзелі, на станцыю сустракаць.

— А дзе яна працуе?

— Хто?

— Ваша жонка.

— А,— відаць, узрадаваны пытаннем, ён загаварыў хутка.— На заводзе працуе. Я колькі казаў, каб знайшла дзе бліжэй працу. Не хоча, кажа, што звыклася, хоча дапрацаваць на адным месцы.

— А кім працуе? — зноў запытаў я, каб не адказваць на якое-небудзь пытанне.

— Яна,— ён крыху падумаў,— выдае інструмент на фабрыцы, кладаўшчыком працуе.

Я адчуў на сабе позірк і павярнуў галаву. Жанчына ў форме чыгуначніцы глядзела на нас праз акенца, нават паперамі перастала шамацець. Яна ўзіралася то ў мужчыну, то ў мяне, і калі нашы вочы сустрэліся, яна нахіліла галаву і зноў занялася паперамі.

— Цяжкая праца. Сварыцца трэба з кожным, а яна спакойная, плача, бывае, як моцна пасварыцца.

Я звярнуў увагу на яго рукі. Пальцы былі доўгія, з акуратна абрэзанымі пазногцямі. Ён пастукваў указальным пальцам па карабку запалак. Запалкі адказвалі ціхім стукам, падобным да стуку далёкага цягніка.

— Колькі нам засталося чакаць? — спытаў ён.

— Яшчэ дваццаць мінут.

— Будзённым днём мала хто едзе, калі толькі з працы. А ў цябе што, адпачынак?

— Ужо скончыўся, праз дзень на працу.

Пачуўся гудок. Потым пачаў набліжацца грукат, які з кожнай хвілінай мацнеў, і нарэшце зазвінелі шыбкі. Вокны асвяціліся, і белыя снежныя малюнкі на шкле ператварыліся ў блакітныя, потым зноў зрабіліся белыя. Кароткія ўспышкі святла біліся за шклом і прападалі. Я заўважыў, што снег не аціхэў, а ўсё ідзе, яшчэ больш буйны і густы. Яшчэ раз ускрыкнуў гудок. Акно канчаткова счарнела і перастала звінець, кропкі семафораў гарэлі на тых жа месцах. Мужчына барабаніў па карабку.

— Ты ўжо набыў білет? — неяк здалёку пачуўся яго голас.

— Ага,— адгукнуўся я.

— А вагон які?

— Вагон нумар два,— паглядзеўшы на цвёрды карычневы прамакутнік, адказаў я.

— Яна таксама прыязджае ў другім вагоне.

Ён перастаў барабаніць, падняўся, зняў капялюш, дастаў з кішэні грабеньчык у пластмасавым футарале і прычасаў валасы; рэдкія і сіваватыя. Паклаў грабеньчык у кішэню і павярнуўся да чорнага акна.

— Выйду на вуліцу. Не хочаш пакурыць?

— Холадна, ды і курыць неахвота.

— А я выйду, нешта горача тут.

Ён павярнуўся і, трымаючы ў руцэ капялюш, пайшоў да дзвярэй, яшчэ раз глянуў у шкло і надзеў капялюш. Зноў пацягнула холадам. Заляцелі і апалі на падлогу буйныя сняжынкі. За акном заіскрыўся агеньчык цыгарэты, потым знік.

— Хлопец! Ці чуеш?

Я павярнуўся на голас жанчыны.

— Няма ў яго ніякай жонкі. Ходзіць сюды штодня, а чаго?

— Як няма? Ён жа сустракае яе.

— Невядома каго ён чакае, а жонкі ў яго няма. Усё, што ён казаў,— мана. Сам сабе маніць і іншым, а я ведаю. Вось так,— сказала і змоўкла, відаць, чакаючы маіх пытанняў.

Я маўчаў, не ведаючы, што сказаць. Нашу маўклівасць парушыў далёкі гудок цягніка, потым яшчэ адзін.

— Хуткі ідзе. Наступны твой,— сказала мне касірка.— Я яго даўно ведаю. Жыве адзін. Раней быў настаўнікам, а зараз на пенсіі. Неблагі чалавек. Неблагі чалавек, нікому нічога не робіць дрэннага.

— І даўно ён так ходзіць?

— Як выйшаў на пенсію, так і пачаў некага чакаць. Ужо з год.

Апошнія словы прапалі ў грукаце колаў і звоне шкла. Аднастайнаю залатой паскай пабеглі вокны вагонаў, грукат зрабіўся роўны.

— Вось такія паперы,— сказала касірка, і яе твар раптоўна схіліўся да стала.

Я павярнуў галаву і ўбачыў, што мужчына стаіць ля дзвярэй і абтрасае снег з капелюша.

— Наступны наш. Колькі ўжо часу?

— Дваццаць тры трыццаць шэсць,— адказаў я, адводзячы вочы.

— Зусім мала засталося чакаць. Мінут праз пяць трэба выходзіць, а то можаш не паспець ускочыць. Мінуту толькі стаіць.

Чорныя хромавыя боты. Карычневае паліто з футравым каўняром. Сіні гальштук, шэры капялюш, які ён усё трымаў у правай руцэ. У левай руцэ былі чорныя скураныя пальчаткі. Звычайная вопратка настаўніка ў невялікім гарадку. Нічога незвычайнага ў ім не было. Я паглядзеў на яго правую руку. На ёй не было пярсцёнка, але і я таксама ўжо колькі не насіў свой. Твар у мужчыны быў спакойны, а вочы абыякавыя.

— А цябе будуць сустракаць? — спытаў ён, падыходзячы.

— Цягнік прыходзіць рана, вельмі рана.

— Тады, відаць, будуць чакаць?

— Магчыма, будуць,— адказаў я.

Мы яшчэ колькі часу маўчалі. Я зноў агледзеў памяшканне станцыі, чапляючыся позіркам за розную драбязу. Спыніўся на тым месцы, дзе сядзеў мужчына. На бруднай падлозе выдзяляліся цёмнай плямай сляды ад ботаў.

— Снег сыпле, што зімой,— сказаў мужчына і пайшоў да дзвярэй.

Я падняўся, узяў сумку і зірнуў на касірку. Яна глядзела на мяне. Я кіўнуў і падаўся да выхаду.

Вецер круціў снежныя пасмы. Мужчына стаяў, павярнуўшыся тварам у той бок, адкуль павінен быў паказацца цягнік. Ён прытрымліваў правай рукой капялюш, а левай прыкрываў вочы ад ветру і снегу. Уся яго постаць, нашатораная, як у вялікай чорнай птушкі,

была ўважлівасць і чаканне. Я падышоў да яго, ён адчуў гэта і павярнуўся.

— Пойдзем, я пакажу, дзе спыніцца другі вагон, а то можна не паспець,— сказаў, павярнуўся і пайшоў па пустым пероне. Я рушыў за ім, узіраючыся ў цемру.

— Вось тут і будзе другі вагон, гэта дакладна,— сказаў і павярнуўся да ветру спіною.

Далёка ў каламуці завеі з'явіўся агеньчык і пачаў набліжацца. Потым пачуўся гудок і грукат колаў. Незвычайна вялікі цягнік засіпеў, заскрыгатала жалеза, і павольна цёмна-зялёны з белай паскай лакаматыў праплыў ля нас і стаў, таргануўшыся даўгім жалезным целам, нябачным за шчыльнай завеяй. Дзверы другога вагона апынуліся перад намі. За брудным, залепленым снегам шклом заварушыўся чорны сілуэт, і дзверы адчыніліся, кінуўшы на сіні перон доўгую пляму святла, у якой круціліся вялікія сняжынкі. Праваднíца адкінула прыступку і, высунуўшыся, глянула ўздоўж цягніка.

— Хутчэй, хлопец, мінуту стаім.

Я падаў ёй карычневы прамакутнік білета і ўскочыў у тамбур. Праваднíца, не гледзячы, надламіла цвёрды кардон і аддала мне. Цягнік здрыгануўся і крануўся з месца.

— Пачакайце, пачакайце, мне ж выходзіць,— пачуўся голас, і паўз мяне выбегла ў тамбур жанчына ў белай вязанай хустцы з гаспадарчай валіскай, поўнай буйных апельсінаў.

— Хутчэй, хутчэй,— крыкнула праваднíца і прыціснулася да сцяны.

Жанчына на нейкае імгненне прыпынілася на апошняй прыступцы і потым сышла на перон, які амаль незаўважна плыў ля цягніка. Праваднíца зачыніла дзверы і апусціла прыступку.

— Ледзь не прамінула сваю станцыю,— сказала і пайшла ў вагон. Цягнік павольна набіраў хуткасць.

# Самакат

Наш двор — між двух чатырохпавярховых дамоў. З аднаго боку, за агароджаю, якую бялілі вапнаю, быў стары парк, з другога стаялі гаражы, складзеныя з чырвонай цэглы. У двары расло з дзесятак вялікіх клёнаў, пад якімі мясціліся альтанка, пясочніца і некалькі лавак.

Я сядзеў пад клёнамі, з якіх павольна падалі вялікія, большыя за маю далонь лісты, і павелічальным шклом выпальваў на габляванай дошцы геаметрычны малюнак. Ля гаражоў дворнік зграбаў лістоту. Быў чуваць скрыгат жалезных грабель па асфальтаванай дарожцы.

Яркая кропка святла пакідала за сабой чорныя крэсы, якія складаліся ва ўзор. Ад дошкі, над якой я схіліўся, пахла смалой і дымам. Была зроблена палова малюнка, калі кропка згасла. Я падняў галаву. Перада мной стаяў Астах.

Мы вучыліся ў адным класе і жылі ў адным пад'ездзе, але не сябравалі. Са з'едлівай усмешкай ён глядзеў на малюнак і ціхенька насвістваў скрозь зубы. Кішэні яго портак і курткі, як звычайна, адтапырваліся. У нашым двары з ім ніхто не сябраваў, і мо таму ён быў на ўсіх злосны.

— Адыдзі, не засці сонца! — сказаў я.

— Самакат вырашыў зрабіць? — абыякава запытаў ён.

— Не твая справа.

— Значыць, самакат,— упэўнена абвясціў Астах і сеў на лаўку.

На кожную пару года ў нашым двары былі свае забавы. Зімой — канькі, лыжы, снежныя вежы, якія доўга будавалі і з задавальненнем разбуралі, гойсанне з абгаражкоў у сумёты. Калі сыходзіў снег і дворнік абразаў з клёнаў веццe, мы рабілі лукі і стрэлы, а калі ў парку падсыхала зямля і фарбавалі агароджу, гулялі ў «цюк» і «гузікі». Пасля надыходзіў час футбола і ровараў, а падчас летніх канікулаў мы пачыналі ладзіць самакаты. Грукат і ляскат падшыпнікаў напаўняў двор і парк. Мы насіліся на самаробных самакатах дацямна, выкрасалі з асфальту іскры і задаволена крычалі. Дарослым гэткая забава не падабалася. Я не памятаю, каб яны калі-небудзь дапамагалі нам рабіць самакаты, і таму нам даводзілася самім здабываць дошкі, падшыпнікі і спадзявацца толькі на ўласнае майстэрства.

— Пакажы шкельца,— сказаў Астах.

— У цябе свае два.

Ён зняў акуляры, падобныя да ровара, крысом курткі працёр лінзы і зноў надзеў на дзюбаваты нос.

— Пакажы, не будзь скнарай.

— На, толькі хутка,— сказаў я і падаў тоўстую, крыху падрапаную «павелічалку».

Ён пакруціў яе на далоні, пахукаў, працёр аб калашыну, прыладзіўся і пачаў выпальваць на лаўцы літару «А».

— Добра пячэ.

— Гэта самая лепшая ў двары.

— У нашым, можа, і самая, але я ведаю, у каго ёсць і мацнейшая.

— Ты не маеш і гэткай. Давай назад!

— Слухай, а мо махнём? Ты мне шкло, а я табе падшыпнік. У цябе ж няма? — ён зірнуў мне ў вочы і ўсміхнуўся.

— Дзякуй. Аддавай «павелічалку»!

— Пачакай,— ён не выпускаў шкло з рук.— Пад-

шыпнікаў зараз не дастаць, а ў мяне ёсць адзін, навюткі! — з націскам на апошняе слова сказаў ён.

— А дзе я вазьму другі?

Астах задумаўся, потым сказаў:

— Выменяеш на што-небудзь.

Я нічога не адказаў. Ён, відаць, адчуў мае ваганні і дадаў:

— Можа, я змагу дастаць і другі, а цяпер давай махнём.

Мне вельмі хацелася мець самакат. Астах падаў руку, я паціснуў мяккую далонь, і маё павелічальнае шкло знікла ў адтапыранай кішэні курткі.

Праз некалькі мінут Астах выйшаў з пад'езда і пазмоўніцку падаў мне навюткі, загорнуты ў правошчаную паперу падшыпнік. Я пакруціў верхні вобад, агледзеў, ці няма дзе трэшчыны, акуратна загарнуў і абнадзееный, з нясконченым малюнкам на дошцы падняўся дадому.

Яшчэ колькі дзён прайшло ў пошуках другога падшыпніка, але адзіным маім здабыткам быў кавалак ізаляцыйнай абалонкі ад кабеля, якую я меўся разрэзаць і насадзіць на ручкі будучага самаката.

...Я сядзеў на лаўцы і сцізорыкам перарабляў малюнак на дошцы.

— Ну, як поспехі, знайшоў падшыпнік? — падышоўшы да мяне, зацікаўлена спытаў Астах і сеў побач.

— Няма ні ў кога.

— Няўжо? Я ведаю, хто мае адзін... Добры складанчык.

— Хто аддасць падшыпнік?..

— Аддаць не аддасць, а махнуць з ім можна,— ён гаварыў і пазіраў на сцізорык.— Гэта бацькаў? — як між іншым запытаў ён.

— Не, мой уласны, а што?

— Дай зірнуць.

— На, глядзі,— сказаў я і падаў яму сцізорык.

Некаторы час мы сядзелі моўчкі. Астах круціў мой сцізорык і спрабаваў прыладзіць да яго ланцужок, сплецены з меднага дроту. Я глядзеў на дворніка, які зносіў лістоту ў вялікую гурбу.

— Дык ты не хочаш зрабіць самакат?

— Ты ж абяцаў дастаць другі падшыпнік.

— Абяцаў. Давай складанчык, і праз паўгадзіны я прынясу падшыпнік.

— Праз паўгадзіны?

— Можа, нават хутчэй, бо ведаю, у каго ёсць.

— У каго? Пойдзем разам, і я з ім пагавару.

Астах адкрыў маленькае лязо. Перарэзаў дубчык. Некалькі разоў шчоўкнуў спружынаю.

— Я пайду адзін: ты толькі сапсуеш усё. Лепш пачакай, і праз паўгадзіны будзеш мець падшыпнік.

Астах падхапіўся, схаваў сцізорык у кішэнь і пабег у суседні двор. З'явіўся ён нечакана.

— Трымай,— крыкнуў ён і бразнуў на лаўку падшыпнік у правошчанай паперы.

— Новы! — здзіўлена сказаў я.

— Ледзь дамовіўся,— адказаў Астах.

Праз два дні пад вечар я выйшаў з пад'езда з навюткім самакатам. На ручкі была насунута сіняя абалонка кабелю. Дошка, на якую станавіцца, была абабіта рыфленай гумай. Перад самаката ўпрыгожваў выразаны і расфарбаваны геаметрычны малюнак, а таксама зіхатлівая металічная лічба «адзін».

Я разагнаўся і ад пад'езда паімчаўся да суседняга дома. Нават дворнік перастаў месці тратуар і праводзіў мяне незадаволеным позіркам. А самакат выйшаў выдатны. Колы круціліся лёгка, пыл і лістота ляцелі ў розныя бакі, руль паварочваўся як мае быць... Я ўяўляў, як буду ляцець на сваім самакаце пад гару па асфальтаванай сцяжыне ў парку.

— Дасі пакатацца? — спытаў Астах, калі я праязджаў ля альтанкі да парку.

— Сам яшчэ не наездзіўся,— адказаў я, прыпыніўшыся, каб перавесці дыханне.

— Валодзька! Валодзька! Хопіць грымець самакатам! Ідзі вячэраць! — паклікала з балкона маці.

Я падхапіў на плячо самакат і подбегам пачаў уздымацца на трэці паверх.

— Куды ты яго нясеш? Я толькі што падлогу памыла, пакінь на пляцоўцы,— сказала мама, калі я ўвайшоў у кватэру.

Мне нічога не заставалася, як пагадзіцца з ёю і хуценька павячэраць, каб зноў пайсці ў двор з новым самакатам.

Але калі я выйшаў з кватэры, самаката на пляцоўцы не было. Я збег у двор. Ля альтанкі гулялі дзве дзяўчынкі, ля гаражоў дворнік па-ранейшаму зносіў лістоту. Самаката не было і тут.

Я збегаў на гарышча нашага дома, потым навобмацак абышоў сутарэнні, агледзеў парк і суседнія двары.

— Вы не бачылі мой самакат? — звярнуўся я да дворніка.

Стары паставіў да сцяны граблі, аглядзеў мяне.

— Ішоў тут адзін у акулярах і з самакатам у бок парку, але гэта было з гадзіну таму,— сказаў ён і зноў узяўся за граблі.

«Астах, Астах!» — вымаўляў я і бег да парку.

Ля белай агароджы сядзелі дзве дзяўчынкі з букетамі кляновага лісця і гулялі ў «сакрэт». На маё пытанне, ці бачылі Астаха, яны пераглянуліся і разам сказалі: «Сакрэт».

Калі я вяртаўся ў двор, было цёмна. У вокнах нашага дома гарэла святло. Раптам я заўважыў Астаха. Ён шыбаваў ад гаражоў да пад'езда і раз-пораз азіраўся. Зрэдку бліскалі яго круглыя акуляры.

— Стой! Дзе мой самакат?

— Самакат? — здзіўлена спытаў ён.— Які самакат?

— Мой, той, што з зрабіў. Ты яго ўзяў, я ведаю, мне сказалі.

— А, самакат, што ты зрабіў з маіх падшыпнікаў... Не ведаю, я за ім не гляджу.

Нечакана Астах павярнуўся і кінуўся ў адчыненыя дзверы пад'езда. Я паспеў схапіць яго за куртку. Ён крутнуўся, і мы разам упалі на пляцоўку першага паверха, але імгненна падхапіліся...

— Пусці! Пусці!

Раптам пад маімі нагамі захрубасцела шкло.

— Акуляры. Мае акуляры,— захныкаў ён.— Акуляры...

— Астах! Астах! — пачуўся зверху жаночы голас.

Я заўважыў, што побач з растаптанымі акулярамі ляжаў мой сцізорык з медным ланцужком. Я падняў яго і выбег на двор, да гаражоў.

...Усю ноч мяне мучыў жахлівы сон. Быццам круглыя акуляры бясконца крышыліся пад маімі абцасамі і чуўся крык Астаха: «Я нічога не бачу!..»

Прачнуўся я з думкаю, што, можа, і не ён узяў самакат: не бачыў жа гэтага на свае вочы і пашкадаваў, што атрымалася бойка.

Я ўзяў сцізорык, які вырашыў вярнуць Астаху, і падняўся на чацвёрты паверх.

У парозе стаяў Астах. Я ніколі не бачыў яго без акуляраў. Блізарукія цёмныя вочы мружыліся і глядзелі на мяне спалохана і вінавата. Белыя вейкі хутка-хутка міргалі. Мне падалося, што ён не бачыць мяне.

— Вось твой сцізорык, прабач...— сказаў я.

— Я ведаю, дзе твой самакат,— азваўся Астах.

Я працягнуў яму сцізорык. Ён стаяў нерухома і глядзеў паўз мяне.

— Самакат схаваны ў гурбе лістоты ля гаражоў, пад ламаччам.

Мы пабеглі ў двор. За рогам, каля гаражоў, гарэла

вогнішча. Побач стаяў дворнік і жалезнымі граблямі падварушваў яго.

— Там самакат! — закрычаў Астах і кінуўся да агню.

— Куды ты лезеш? Адыдзі! — злосна сказаў дворнік і торкнуў у полымя граблямі.

З-пад лістоты вылецеў сноп іскраў, агонь заняўся мацней і ахапіў ламачча, што ляжала зверху.

— Самакат? Я вось сабраў усё лісце, смецце і запаліў. Трэба, каб у двары было чыста і ўпарадкавана, а не абы-як. Зіма хутка, а вы пра самакат.

Мы павярнуліся і ціха пайшлі дадому.

— Пачакайце!

Мы спыніліся.

— Ведаеце, дзе мая кладоўка? Яна не зачыненая, там ваш самакат. А калі будзеце грымець да ночы ў двары, сапраўды спалю. Зразумелі?

# Доўг

Ён некалькі хвілін стаіць у двары і глядзіць на вокны пяціпавярховага дома. На трэцім паверсе гарэць два акны. Першае ад пад'езда — жоўты квадрат — кухня, другое — шэра-блакітны прамакутнік — зала.

Ён бярэцца за ручку, адчыняе на сябе дзверы і ўваходзіць у цёмную цеплыню пад'езда. Крыху чакае, звыкаецца з цемраю і асцярожна пачынае ўздымацца па лесвіцы, трымаючыся за гладкую фарбаваную парэнчу.

У гулкай цішыні добра чуваць шамаценне цэлафану, у які загорнуты кветкі, добра чуваць крокі, хоць ён стараецца ісці ціха.

На пляцоўцы трэцяга паверха ён спыняецца: апускае каўнер паліто, папраўляе валасы, перакладае шаматкі букет у левую руку. Перад ім дзверы з вялікаю кропляй жоўтага вочка. Над вочкам цьмяна паблісквають дзве лічбы.

Ён навобмацак знаходзіць кнопку званка, націскае і робіць крок да дзвярэй. Жоўтая кропля вочка згасае, потым успыхвае, і ён чуе голас: «Зараз, зараз!»

Дзверы адчыняюцца. У парозе стаіць мужчына і глядзіць на яго: спачатку на твар, потым на кветкі, якія паблісквають цэлафанавай абалонкай.

— Вам каго, малады чалавек? — расцягвае словы мужчына.

— Добры вечар. Вы мяне не пазнаяце? Я — Раман.

— Раман, Раман,— выгаворвае кожны гук мужчына.— А, Раман! Прабач, не пазнаў. Праходзь. Даўно цябе не бачыў, вось і не пазнаў адразу,— мужчына адыходзіць убок, саступае яму дарогу і падае руку.

Раман уваходзіць у калідор і глядзіць на свае кветкі.

— А жонка, ведаеш, пайшла да знаёмай, але хутка павінна быць.

— Гэта ёй,— Раман падае букет гаспадару.

— Распранайся і праходзь, будзем піць каву. Я толькі што зварыў,— мужчына знікае ў кухні, адкуль чуецца шамаценне цэлафану і шум вады.

Раман распранаецца і праходзіць у кухню. Гаспадар паказвае на белы табурэт між халадзільнікам і сталом. Раман сядае. Гаспадар здымае з пліты кававарку, ставіць яе на белы пластык стала побач са шкляным цыліндрам, у якім стаяць кветкі.

У зале працуе тэлевізар. Голас дыктара добра чуваць у кухні. Раман пачынае прыслухоўвацца.

— Гэта тэлевізар,— удакладняе гаспадар.— Цікавая перадача пра археолагаў. Ты ж таксама некалі быў археолагам, памятаю, як ты расказваў.

— Некалі быў.

— А мне падабаецца глядзець тэлевізар. На тым тыдні была гэта перадача, цяпер працяг.

...нечаканыя знаходкі здзівілі саміх археолагаў. Знойдзеныя на невялікай глыбіні, яны прымушаюць думаць, што раней...

Гаспадар ставіць на стол два керамічныя кубкі.

...але сцвярджаць што-небудзь больш акрэслена пакуль немагчыма...

— Вось вучоныя і тыя не могуць сказаць акрэслена пра тое, што было раней. Ды і што скажаш, калі столькі часу прайшло. Табе падабаецца глядзець тэлевізар?

— Не, я больш люблю чытаць.

— Раней я таксама шмат чытаў, а цяпер гляджу тэлевізар. Гэта цікавей і прасцей. Жонка чытае, а я — толькі газеты.

...вучоныя лічаць, што знаходкі даюць адказ на незлічонае мноства пытанняў...

— Адкажуць на адны пытанні, з'явяцца другія,— гаворыць гаспадар і пачынае разліваць густую духмяную каву па кубках. Спачатку Раману, потым сабе.— Ну, а ў цябе якія навіны? — гаспадар сядае да стала і кранае далонню нікеліраваны бок кававаркі.— Ты мо не вячэраў?

— Не, я павячэраў, дзякуй вам.

— Ну, як ведаеш.

...хаатычна раскіданыя, перамешаныя і сцэментаваныя часам гэтыя рэшткі можна лічыць самым багатым...

— Я хачу прасіць прабачэння і ў вас і ў вашай жонкі, што не аддаў доўг у тэрмін, як абяцаў,— ён выгаворвае кожнае слова, дастае з кішэні і кладзе на стол грошы.

— Які доўг? Пра што ты, Раман? — здзіўлена пытае гаспадар і глядзіць на акуратныя паперкі.— Я нічога не ведаю,— гаспадар устае, бярэ кававарку, ставіць яе ў ракавіну і зноў глядзіць на грошы, што ляжаць ля кветак на белым пластыку стала.

...цяжка сказаць. Спецыялісты, аднак, схільны меркаваць, што ўсе знаходкі...— спакойна гаворыць дыктар пад гукі старажытнай мелодыі.

— Я пазычаў у вас грошы два гады назад, але ў тэрмін аддаць не змог, і вось зараз...

— Пачакай, Раман,— гаспадар перапыняе яго.— Я памятаю, як ты пазычаў, але жонка казала, што ты аддаў. Ці я нешта блытаю? Не, я дакладна памятаю, што яна сказала, што доўг ты аддаў.

...пасля дажджоў,— пад музыку гаворыць дыктар,— воды рэк, якія вярнуліся ў свае рэчышчы, панеслі і сабралі іх у адным месцы, дзе яны і захаваліся да нашага часу...

— Давай закурым. Нешта я нічога не разумею,— гаспадар бярэ з падваконня цыгарэты і запалкі.

...гіпотэзы, хто мог гэта зрабіць, хвалююць вучоных, і яны ўпэўнены, што загадка крыецца ў саміх паводзінах людзей...

Гаспадар зачыняе дзверы кухні, гук тэлевізара робіцца далёкім, і словы разабраць немагчыма.

— Я толькі зараз прынёс, мяне не было ў горадзе ўвесь гэты час,— гаворыць Раман і паварочвае ў пальцах гарачы кубак.

— Не было. Нешта мы з табой блытаем. Закурвай,— гаспадар падае цыгарэты.

— Я кінуў.

— А я вось не магу без цыгарэты. Колькі ні спрабаваў, не атрымліваецца. Звычка. А ты добра зрабіў, што кінуў,— гаспадар запальвае цыгарэту і шукае вачыма попельніцу. Раман падае круглую попельніцу, якая стаяла на халадзільніку.

— Ты пі каву, а то астыне,— выдыхае дым і бярэ свой кубак гаспадар.

Яны моўчкі п'юць каву.

Зашклёныя дзверы кухні асвятляюцца. Шкло робіцца малочна-жоўтым.

— Гэта ты? — прыадчыняе дзверы і гаворыць у калідор гаспадар.

— Што ты пытаеш? — адказвае жаночы голас.

— Яна. Цяпер усё высветліцца,— гаспадар кладзе цыгарэту на край попельніцы і выходзіць на калідор.

...як заўсёды, адсутнасць пісьмовых сведчанняў дае магчымасць для стварэння розных супярэчлівых меркаванняў. Але вучоныя спадзяюцца, што далейшы пошук новых фактаў дасць дакладныя і пераканаўчыя...— чытае тэкст ужо жаночы голас пад старажытную мелодыю.

— Добры вечар, Раман,— кажа гаспадыня і ўваходзіць у кухню.

— Вечар добры,— вітаецца Раман.

— А мы цябе чакаем, каву п'ём,— гаворыць гаспадар і праходзіць на сваё месца.— Гэта табе кветкі,— ён пераводзіць позірк з Рамана на жонку.

— Дзякуй, Раман, мне вельмі прыемна,— яна сядае на табурэт ля акна.

— А мы тут разбіраемся наконт грошай,— позірк гаспадара спыняецца на акуратных паперках, што ляжаць каля кветак.

— Я вам прынёс доўг, што пазычаў даўно, можа, вы забыліся? Мне няёмка, што не змог аддаць...

— Прабач, Раман,— мякка перапыняе гаспадыня.— Які доўг? Ты ж аддаў яшчэ даўно, як абяцаў. Ты нешта блытаеш.

— Вось і я думаю, што ён нешта блытае,— гаспадар бярэ цыгарэты, глядзіць на грошы, потым на Рамана, потым на жонку.

— Ты перадаў нам грошы ў тэрмін, як абяцаў, праз свайго брата. Я гэта добра памятаю.

— Што вы, у мяне няма братоў,— Раман паварочвае ў пальцах парожні кубак.

— Тады не ведаю, але грошы мы атрымалі. Можа, ты каго прасіў? — яна глядзіць на Рамана здзіўленым і заклапочаным позіркам.

...доказам гіпотэзы могуць быць толькі факты. А факты настолькі супярэчлівыя, што ні адна з існуючых гіпотэз не вытрымлівае іх колькасці. Таму сцвярджаць што-небудзь дакладнае немагчыма. Факты, якія з'яўляюцца ў час пошукаў, нішчаць гіпотэзы, і таму нам застаецца...— запаўняе цішыню кватэры голас дыктара.

— Мо яшчэ вып'ем кавы? — гаспадар устае, падыходзіць да крана і пускае ваду. Потым чыркае запалкай, бярэ цыгарэту са стала, прыкурвае і запальвае фаерку. Кран пачынае вуркатаць.

— Ды выключы ты ваду,— злуецца гаспадыня,— і тэлевізар. Ніхто ж не глядзіць.

— Тэлевізар, тэлевізар,— выгаворвае гаспадар, паварочвае керамічную ручку крана і выходзіць з кухні.

...спадзяванні вучоных на далейшы пошук. Яны лічаць, што адказ на пытанні дасць час, і тады будзе можна меркаваць...

Музыка і голас дыктара абрываюцца, і ў цішыні чуваць, як падаюць кроплі ў поўную кававарку.

— Ведаеш, што мне запомнілася? Той чалавек, што прынёс грошы, калі я яго праводзіла,— пайшоў не ўніз па лесвіцы, а ўверх. Гэта мяне здзівіла, але потым я забылася.

Гаспадар вярнуўся, не пачуўшы апошняй фразы.

— Што ты кажаш?

— Я кажу, ён пайшоў уверх па лесвіцы.

— Хто пайшоў?

— Той, хто прынёс грошы.

— Я гэта чуў.

— Нашто тады перапытваеш?

— А што далей?

— Я зачыніла дзверы, вось што далей.

— Можа, гэта быў паштальён?

— Кінь жартаваць,— нервуецца гаспадыня.— Калі будзеш варыць каву, дык вары, а не будзеш — выключы пліту.

— Я на ноч не хачу піць, калі толькі вы з Раманам,— адказаў гаспадар і сеў да стала.

Раман паглядзеў на гаспадара, потым на грошы, потым на гаспадыню.

— Ну што, мне трэба ісці.

— Дзіўна ўсё гэта,— гаспадар паварочвае ручку пліты.

— Раман, дык ты забяры грошы, мо акажацца, хто перадаў,— просіць гаспадыня.

Гаспадар падсоўвае да Рамана акуратныя паперкі.

— Атрымліваецца, што гэта няведама чые грошы,— разважае Раман і ўстае з-за стала.

— Гэта твае грошы,— з націскам на першае слова кажа гаспадар.

Раман бярэ грошы, складае іх удвая і глядзіць у акно. Там у чорна-сінім шкле ён бачыць сваё адлюстраванне, праз якое прасвечваюцца вокны процілеглага дома. Яго адлюстраванне трымае ў руцэ паперкі, потым кладзе іх у кішэнь.

— Дзякуй вам за каву і прабачце за клопаты.

— Якія клопаты,— адказвае гаспадыня, ідзе да стала, бярэ кубкі і нясе іх да ракавіны.

Раман разам з гаспадаром выходзяць у калідор. Раман апранаецца, потым дастае грошы і перакладае іх у паліто.

З кухні выходзіць гаспадыня з мокрымі рукамі.

— У пад'ездзе цёмна,— гаворыць яна.— Нехта павыкручваў лямпачкі.

— Падшыванцы, відаць. Збіраюцца на другім паверсе, кураць,— адказвае гаспадар.

— На нашым паверсе яшчэ трохі відаць, а ўнізе зусім цёмна,— гаспадыня падыходзіць да дзвярэй і адчыняе іх.— Ты не хвалюйся, Раман, я думаю, знойдзецца твой сябар, які аддаў грошы.

— Паглядзім,— няўпэўнена адказвае Раман, паціскае руку гаспадару, развітваецца з гаспадыняй і выходзіць на пляцоўку.

— Дзіўна ўсё гэта. У пад'ездзе цёмна...— чуе ён голас гаспадара за дзвярамі.

Ён азіраецца. Залатая кропля вочка згасла. Ён падымае галаву і глядзіць угару. Між лесвічных маршаў прабіваецца цьмянае жоўтае святло. Ён падымае каўнер паліто і пачынае сыходзіць у цёмную глыбіню пад'езда. Навобмацак знаходзіць дзверы, штурхае іх і выходзіць у двор. Дзверы гучна грукаюць.

«Трэба было прытрымаць. Грукату нарабіў»,— ду-

мае ён, адыходзіць ад пад'езда і глядзіць на вокны дома. На трэцім паверсе гарыць жоўты квадрат — кухня, наступнае — чорны прамакутнік — зала. У пад'ездзе, між чацёртым і пятым паверхамі, гарыць святло. «Туды падшыванцы не дайшлі, відаць, пабаяліся».

Потым ён ідзе па вуліцы. Хочацца курыць. Прахожыя ідуць, нагнуўшы галовы і наставіўшы каўняры. Яны не азіраюцца, калі праходзяць побач.

«Трэба было ўзяць цыгарэту, але ж я кінуў курыць. Тады не трэба. Год не курыў, а зараз хочацца. Ніхто [redacted] прахожых не курыць, а мне патрэбна цыгарэта. Патрэбна падумаць пра ўсё гэта».

«Спадзяванні вучоных на далейшы пошук. Яны лічаць, што адказ на пытанні дасць час... І тады будзе магчымасць меркаваць...» — успомнілася фраза, пачутая па тэлевізары.

Вуліца збягае пад гару да парку. Ён ідзе хуткай хадой, нібыта спяшаецца. Ідзе да моста, пераходзіць рэчку, паварочвае і павольна ідзе ля вады. Наперадзе шуміць вадаспад і нават у цемры відаць белую сцяну вады, што з шумам падае з плаціны. Супраць плыні ракі вецер гоніць рознае смецце: кавалкі дрэва, лістоту, пабітую скрыню, мячык, а ля самага берага круціцца пластыкавая лялька, выставіўшы з вады белую руку. Вецер гоніць усю гэту драбязу да вадаспада, дзе шуміць і віруе халодная вада. Ад ветру на рацэ бягуць іртутныя блікі.

«Трэба грошы пакласці ў партаманет, а то выцягну разам [redacted] насоўкаю ці квіткамі і згублю»,— думае ён і спыняецца на падыходзе да вадаспада. Выцягвае партаманет, расшпільвае металічную кнопку і разгортвае яго як кніжку. Замерзлымі пальцамі дастае грошы, распраўляе храбусткія паперкі і левай рукой пачынае ўкладваць. Цвёрды партаманет выслізвае з рук. Ён спрабуе падхапіць яго, але разгорнутая скураная кніжка падае. Вецер выхоплівае лёгкія паперкі грошай і,

крутануўшы каля ног, уздымае і нясе іх у цемру — туды, дзе бягуць па чорнай вадзе ртутныя блікі.

Ён павольна нагінаецца, падымае скураную вокладку, зашпільвае і кладзе ў кішэню паліто. Некалькі хвілін узіраецца ў цемру, адшуквае вачыма пластыкавую ляльку, глядзіць на яе белую руку, паварочваецца і, нагнуўшы галаву, ідзе супраць ветру.

«Воды рэк, якія вярнуліся ў свае рэчышчы, панеслі і сабралі іх у адным месцы, дзе яны і захаваліся да нашага часу...» — успомніў ён словы дыктара, ідучы да аўтобуснага прыпынку.

# Пераўтварэнне

На лесвічнай пляцоўцы дванаццатага паверха, каля вялікага, ва ўсю сцяну акна стаялі дзве жанчыны. За шклом, да самага далягляду, доўжылася панарама горада. Цёмныя прамакутнікі паркаў, роўныя крэсы дарог, аснежаныя палі з раскіданымі па іх новабудоўлямі стваралі дакладны партрэт ускраіны вялікага горада. Па дарогах, да імжыстых мікрараёнаў на даляглядзе каляровымі кроплямі беглі аўтамабілі.

— Вунь там мой дом,— паказвала цыгарэтай натуральная бландзінка на далягляд, дзе скрозь шызую смугу праглядвалі геаметрычныя абрысы.

— Дзе? — перапытала яе сяброўка, згарнула лісты сцэнарыя і пачала ўглядацца ў бляклы зімовы краявід.

— За полем. Высокія карпусы бачыш? — бландзінка збівала доўгім пазногцем попел, які церушыўся цёмным снегам па краявідах за чыстым шклом.

— Далёка...— жанчына крыху памаўчала, ізноў разгарнула стос папер.— Сёння апошняя рэпетыцыя, а акцёр «не цягне». Рэжысёр не задаволены. Не ведаю, што з гэтага будзе...

— Табе добра, цябе сустрэнуць, ды і жывеш ты побач са студыяй, а мне амаль гадзіну ехаць,— бландзінка адвярнулася ад акна.— А што вы цікавае ставіце?

— Прыходзь заўтра ў павільён, паглядзіш. Псіхалагічны дэтэктыў. Жахі...— Яна паказала тытул сцэнарыя.

— А... Такога зараз у газетах хапае,— бландзінка адкінула доўгія валасы за спіну.

— Не веру я ва ўсе гэтыя чуткі пра маньякаў...

Лепш я цябе з акцёрам пазнаёмлю, а то забіваеш галаву абы-чым.

— Я не супраць,— бландзінка расшпіліла сумачку і пачала падфарбоўваць вусны.— Але газеты яго прыкметы далі: высокі, у чорным штучным футры і лыжнай шапачцы, узрост — год дваццаць пяць,— яна кінула недапалак.

* * * У вялікім павільёне, дзе ўжо стаяла частка пашарпаных дэкарацый, ішла апошняя рэпетыцыя тэлеп'есы.

— Ты павінен адчуваць героя. Павінен пераўтварыцца ў яго. Разумееш — пераўтварыцца, а я пакуль не веру ніводнаму твайму слову. Чаму вас вучаць? — рэжысёр цяжка падняўся з нізкага крэсла і прайшоў праз асветлены круг у цемру...— Ты і ён — адна асоба,— прагучаў яго голас з цемры.

Рэжысёр быў немалады, з маленькай, як прыклеенай, сівой расчасанай бародкай і доўгімі валасамі. Ён стаяў, абапіраючыся на тонкую кавеньку ў яркім святле пражэктара і глядзеў на разгублены твар акцёра:

— Зразумеў? Пачалі з першай рэплікі.

Рэжысёр сеў у крэсла, паправіў гальштук, працёр акуляры.

— Можна? — акцёр выйшаў на святло і падняў руку.

— Я ахвяра, яна следчы, ты злачынца. Пачынай! Пазнач рэпліку,— стомлена кінуў рэжысёр сваёй асістэнтцы...

У акцёра сеў голас. Рэжысёр пастукаў кавенькай па штучнаму бруку і выцер твар. Рэжысёр выглядаў пастарэлым і стомленым, ён камечыў бародку і слухаў шэпт акцёра. Акцёр прыціснуўся да дыкты, расфарбаванай пад чырвоную цэглу, і перагортваў пакамечаныя лісты сцэнарыя.

— Ты завучыў. Разумееш, завучыў. Гэта пакуль

не тваё. У цябе засталася ноч і ранне — заўтра пачынаем запісваць п'есу. Трэба сабрацца,— рэжысёр выцягнуў з кішэні гадзіннік і, незадаволены, закрыў яго.

У цёмным павільёне, пад святлом адзінага пражэктара, стаяў акцёр і шэптам звяртаўся да пустых крэслаў рэжысёра і асістэнткі.

— Гэта памылка. Я не вінаваты...

* * * Аўтобус хутка мінаў прыпынкі ля цёмных новабудоўляў. На прыпынках ніхто не сыходзіў і не заходзіў.

Мужчына глядзеў на маладую жанчыну з доўгімі светлымі валасамі. Жанчына сядзела ля першых дзвярэй і спіною адчувала цяжкі позірк. Яна суцяшала сябе думкаю, што на яе прыпынку будуць людзі, і тым, што да дома не вельмі далёка, трэба толькі перайсці дарогу і прабегчы па сходах да пад'езда, дзе стаяў дванаццаціпавярховы дом.

Постаць мужчыны адлюстроўвалася ў ветравым шкле. Ён трымаўся за парэнчу і нешта шаптаў. Яна бачыла яго тонкія вусны. Вочы хаваў глыбокі цень ад шэрай кепкі. Жанчыне падалося, што яна бачыла і ведае гэты твар, толькі дзе і калі, яна не магла прыгадаць. Дом, дзе яна атрымала кватэру, засялілі нядаўна, і, магчыма, мужчына жыў у ім...

Аўтобус мінуў яшчэ прыпынак, і на наступным жанчына і мужчына выйшлі.

Жанчына праслізнулася і адразу заспяшалася па бетонных сходах да цёмнага дома.

Ля пад'езда яе дагнаў мужчына. Дзверы ліфта не паспелі зачыніцца. Жанчына прыціснулася да сцяны.

— Мне дванаццаты,— шэптам вымавіла яна.

Мужчына глядзеў ёй у твар.

— Я закрычу... Я вас ведаю! Вы акцёр. Вы. Я ўспомніла! Вы зусім не падобны да забойцы!

Яна памкнулася націснуць на кнопку. Ён вырашыў, што жанчына хоча выскачыць з кабіны, і схапіў яе за руку. Яна закрычала. Ліфт крануўся. Мужчына ў чорнай куртцы заціснуў ёй рот.

На дванаццатым паверсе дзверы ліфта адчыніліся. На падлозе тварам да сцяны ляжала жанчына. Мужчына нагой адкінуў у кабіну сумачку, з якой выпалі ключы і памада, і дзверы зачыніліся.

— Гэта памылка. Я не вінаваты...— фраза гучала натуральна і пераконвала.

* * *

У павільёне, ярка асветленым сафітамі, рабочыя ў сініх халатах разбіралі гатовую дэкарацыю. Яны выносілі штучныя сцены, падымалі і грузілі на тачкі штучную брукаванку і бардзюры. Яны сварыліся між сабой, але працавалі спрытна і хутка. Вялікае памяшканне зрабілася пустым. Святло патушылі і ў павільёне запанавала гулкая цемра.

Рэжысёр, моцна пастарэлы за два дні, сядзеў перад маладым чалавекам у шэрым акуратным гарнітуры, трымаў на каленях тонкую кавеньку і паціскаў плячыма.

— Хто мог ведаць? Разумееце, гэта яго прафесія, яго хлеб: ён павінен пераўтварацца, каб пераконваць. Ён пераблытаў мастацтва з жыццём. Вы разумееце?

Чалавек глядзеў на старога, нешта запісваў і праглядаў пакамечаныя і зачытаныя лісты сцэнарыя.

На лесвічнай пляцоўцы, ля вялікага, ва ўсю сцяну акна стаяла асістэнтка рэжысёра і два акцёры: мужчына ў шэрым акуратным гарнітуры, які павінен быў выконваць ролю следчага, і актрыса, якая перафарбавалася ў бландзінку, каб стасавацца да ролі ахвяры.

Яны палілі, глядзелі на панараму горада і маўчалі.

# «На доўгую памяць»

Над кварталам лунаў пах старой скрышанай цэглы. Пыл, які абсыпаў лістоту дрэў, траву, асфальтаваныя сцежкі, быў чырвоным і непрыемна рыпеў на зубах.

Чыгунная баба — гэты маятнік разбурэння — яшчэ не хіснуўся каля дома, што стаіўся паміж паламаных яблынь і шэра-чырвоных таполяў, яшчэ не адлічыў апошнія хвіліны яго каменнага жыцця. Дом існаваў, хоць і быў пакінуты гаспадарамі. Побач стаяў амаль скончаны шэра-бетонны шматпавярховік, які, здавалася, уціскаў маленькі дом у зямлю.

Двое хлопцаў пастаялі каля дома, паглядзелі на яго абсцены, скрозь у рознакаляровых пасках і плямах аблупленай тынкоўкі, на выбітыя вокны, на прачыненыя сінія дзверы і ўвайшлі ў калідор. Драўляная лесвіца ад невялікай пляцоўкі вяла на другі паверх.

— Пачнем зверху? — спытаў адзін з хлопцаў.

— Давай зверху,— адказаў другі.

Старэйшаму з хлопцаў, яго звалі Віталік, было семнаццаць гадоў. Ён быў невысокі, шырокі ў плячах, чорнавалосы, апрануты ў зліnялыя джынсы і шэрую палатняную куртку. Яго сябар, рухавы Арсень, выдаваў вышэйшым за Віталіка, хоць ростам яны былі аднолькавыя. У Арсеня былі доўгія рудыя валасы, празрыстыя сінія вочы і вельмі белы твар, які крыху псавала рабаціnне. Апрануты Арсень быў у джынсы і сінюю майку з ярка-чырвоным малюнкам. Хлопцы вучыліся на другім курсе мастацкага вучылішча.

— Глядзі, што гэта? — сказаў Арсень і паказаў на рэчы, зваленыя пад лесвіцай калідорчыка.

— Гэта ўжо нешта.
— Чаму нешта? — імкліва перапытаў сябар.
— А каму гэта патрэбна?
— Давай паглядзім, можа, што знойдзем.
— Потым, а цяпер пойдзем наверх,— сказаў Віталік і рушыў па рыпучай лесвіцы.

На другім паверсе ўсе дзверы былі адчынены. Віталік прыгнуў галаву, паглядзеў пад ногі, прайшоў у пакой, Арсень застаўся ў калідорчыку.

У пакоі скразняк хістаў лахманы блакітных шпалераў. Пад блакітнымі, у дробную клетачку былі ружовыя шпалеры, пад ружовымі зноў блакітныя, з-пад блакітных выглядалі кавалкі зжаўцелых газет і шэрая атынкоўка.

— Ведаеш, за які год? — у пустым пакоі гучна спытаў Віталік.
— Што за які год?
— Газета пад шпалерамі — за сорак сёмы.

— А што за газета? — Арсень стаў на парог і зазірнуў у пакой.
— Відаць толькі малюнак і тэкст.
— А што за малюнак?
— Завод у горадзе... Назву не разабраць. Ды гэта і не малюнак, а фотаздымак.

— Ты нарадзішся праз адзінаццаць год пасля гэтай газеты,— сказаў Арсень і адкінуў з ілба кучаравыя валасы.
— Мы ўжо нарадзіліся і выраслі.
— Я пра тое, што нас тады не было.
— Зразумела. А што тады было?

— Магу сказаць дакладна: дом, газета, завод на здымку — нас не было,— з гэтымі словамі Арсень увайшоў у пакой і ўважліва агледзеў яго.

Пакой быў з адным невялікім акном. На падаконні ляжаў стос агульных сшыткаў у бляклых кардон-

ных вокладках. Хлопец падышоў да акна і ўзяў верхні сшытак.

— Што за сшытак? — спытаў Віталік, разглядаючы паштоўку, якую ён падняў з падлогі.

— Цікава. Сшытак па гісторыі мастацтваў. Канспект студэнта групы... Глядзі, на першай старонцы лацінскі выраз.

— Адкуль ты знаеш, што лацінскі?

— Я збіраў манеты, таму і ведаю, што гэта па-лацінску напісана.

— І што там напісана? — Віталік падняў з падлогі яшчэ адну паштоўку.

— Арс лонга, віта брэвіс! — павольна прадэкламаваў Арсень.

— А што гэта азначае?

— Азначае гэта, што жыццё кароткае, а мастацтва вечнае. Вазьму сшытак сабе, пачытаю.

— «Арс» — гэта мастацтва,— сказаў Віталік.

— Мастацтва, а што дзіўнага?

— Нічога. Атрымліваецца: Арсень — мастак?

— Арсень, гэта імя майго дзеда, мяне назвалі па дзеду.

— А за які год сшытак? — спытаў Віталік.

— За шасцідзесяты.

— Ты памятаеш што-небудзь за шасцідзесяты год?

— Што я павінен памятаць, мне яшчэ не было года.

— А мяне ў гэтым годзе пчала ўджаліла. Уяўляеш, я еў яблык, і разам з яблыкам пчала трапіла ў рот. Пра яблык расказвала маці, а вось як балеў язык, як ён распух на ўвесь рот — памятаю дакладна.

— Можа, ты яшчэ памятаеш, як нарадзіўся? — спытаў Арсень і пачаў праглядаць адзін за адным сшыткі.

— Гэта толькі ты памятаеш усё,— злуючы, сказаў Віталік і нагнуўся па новую паштоўку.

— Не злуйся, я пажартаваў.

— Лепш ідзі ў другі пакой, там шмат чаго засталося. Будзе што цікавае — пакліч.

— Добра! — Арсень выйшаў у другі пакой.

— Тут кот! — пачулася праз некалькі хвілін.

У пакоі, куды ўвайшоў Арсень, сядзеў вялікі шэры кот. Хлопец дайшоў да сярэдзіны пакоя і спыніўся. Кот ускочыў на падваконне і некалькі разоў каўкнуў.

— Які кот?

— Паглядзі, вялікі кот і не ўцякае,— у голасе Арсеня было здзіўленне.— Відаць, ён тут жыў...

Віталік з парога скіраваў да ката. Кот прыціснуўся да падваконня і ўважліва сачыў за чалавекам. Калі хлопец амаль падышоў, кот скокнуў на яблыню і знік. Віталік выглянуў на вуліцу.

— Збег гаспадар пакінутых рэчаў.

— А мне каты падабаюцца больш, чым сабакі,— сказаў Арсень.

— У нас быў сабака. Вялікі, белы, а звалі яго Рудзік,— сказаў Віталік.

— А чаму Рудзік, калі ён быў белы?

— Таму што папярэдняга звалі Рудзік: імя перайшло ў спадчыну.

— У маёй бабы быў кот. Ён спаў разам са мной. Яму падабалася спаць са мной.

— Нашага сабаку суседзі знішчылі.

— Як знішчылі? — Арсень здзіўлена паглядзеў на сябра.

— Далі іголку ў сале. Сабака з'еў, а потым здох.

— Каты лепш, чым сабакі, яны больш незалежныя. Сабакі прывыкаюць да гаспадара, а каты да дома.

— Хатнія жывёлы — каты, хоць сабакі таксама лічацца хатнімі.

Хлопцы хадзілі па пакоі, падымалі з падлогі кніжкі, у большасці падручнікі, часопісы, гарталі, знаходзілі паштоўку ці ліст, некалькі хвілін разглядалі, клалі на падваконне. Скразняк скідаў паперы на падлогу і

гнаў па засмечаным пакоі з кута ў кут. Гутарка то замаўкала, то пачыналася зноў.

— Відаць, гаспадары не ўзялі яго ў новую кватэру — вось ён і жыве ў гэтым доме,— сказаў Арсень.

— А можа, ён збег і вярнуўся на старое месца? Ты ж казаў, каты прывыкаюць да дома, а не да гаспадара.

— Не, відаць, яго не ўзялі.

— А як ты думаеш, чалавек да каго больш падобны: да ката ці да сабакі?

— Людзі падобны да сваіх бацькоў.

— Гэта я без цябе ведаю. Я падобны да маці, а брат да бацькі. А ты заўважаў, што каты і сабакі падобныя да гаспадароў?

— Уяўляю ката, падобнага да цябе,— сказаў Арсень і паглядзеў на Віталіка.

— Што табе даліся гэтыя каты?

— А ведаеш, каты і сабакі, калі прыходзіць час паміраць, збягаюць з дому.

— А людзі наадварот... А твой Рудзік збег з дому? — пасля паўзы спытаў Арсень.

— Куды ён збяжыць, ён быў на ланцугу.

— Каб быў ненавязаны, то збег бы.

— Абавязкова. Але гэта цікава, так?

Ля сцен стаялі буйныя рэчы: паламаная дзіцячая калыска, шафа без дзверцаў і шуфлядаў, крэсла з прабітай плеценай спінкай, дзіцячы столік без ножкі. Дробныя рэчы ляжалі на падлозе. На сценах былі цёмныя прамакутнікі зялёнага колеру — там шпалеры не злінялі і не змянілі свой сапраўдны зялёны колер на салатны.

— Добра было б знайсці рамы,— сказаў Арсень.

— Якія рамы?

— Тыя, што віселі на сценах. Бачыш, засталіся цёмныя плямы.

— Рамы, відаць, забралі — патрэбная рэч.

— Асабліва нам з табой.

Віталік падняў з падлогі невялікі пакуначак, загорнуты ў газету і перавязаны шпагатам.

— Фотаздымкі.

— Пакажы.

У газеце былі загорнутыя фотаздымкі: старыя, карычневыя, на цвёрдым кардоне ў шэрых шурпатых рамках. На першым здымку быў малады чалавек ля белай пукатай вазы, з вазы тырчэла з растапыраным доўгім лісцем паўднёвая расліна. Чалавек глядзеў у аб'ектыў, і выраз твару атрымаўся вельмі сур'ёзны. Шырокія запрасаваныя галіфэ, бліскучыя боты, белая кашуля, зашпіленая на ўсе гузікі, на левай руцэ вялікі гадзіннік, у правай — чорная кепка з белай кветкай. На рамцы выціснуты знак «Івацэвічы». На адваротным баку вучнёўскай ручкай надпіс: «На доўгую памяць лепшаму сябру ад...» Далей быў выкручасты неразборлівы подпіс і дата.

— Добрая звычка адзначаць фотаздымкі датамі,— сказаў Віталік і перадаў картку Арсеню.

— Я таксама зараз адзначаю.

— Ты як сапраўдны мастак.

— Ты ж таксама адзначаеш...

— Я пра чалавека ў галіфэ, зразумеў?

— На доўгую памяць, а фотаздымкі на падлозе. Як табе памяць гаспадара? — спытаў Арсень.

— Гэта, можа, не гаспадар, а яго дзеці? Гаспадар мог даўно памерці.

— А дзецям што, не патрэбна «доўгая памяць»?

— Маглі выпадкова забыцца на здымкі?

— І хата забылася, і здымкі? Не. Гэта ўсё кінулі як непатрэбнае.

Хлопцы пераглядалі здымкі, пераварочвалі і чыталі надпісы з адваротнага боку. На адным здымку быў партрэт хлопчыка з букетам чаромхі. На двух маладая

жанчына: на першым з дзіцем пад дрэвам, на другім побач з высокім мужчынам ў вайсковай форме.

— Як ты лічыш, хто гэта? — спытаў Віталік.

— Жонка гаспадара ці сястра.

— Каб гэта была сястра, то яна, відаць, падпісала б, што здымак брату.

— Брату можна і не падпісваць.

— А вайсковец хто — гаспадар?

— Мне здаецца, што гэта знаёмыя гаспадара, таму і засталіся фотаздымкі тут. Дзеці не кінуць здымкі бацькоў, а знаёмых маглі пакінуць.

— Пакінуць ці выкінуць?

— А якая розніца, зараз яны нашы,— сказаў Арсень і пайшоў у кут пакоя, дзе стаялі дзверцы шафы з пабітым люстэркам. Віталік застаўся разглядаць фотаздымкі.

Арсень падышоў да люстэрка і паспрабаваў зазірнуць у яго. Глядзецца было нязручна, ён падняў дзверцы і паставіў на падваконне.

— Глядзі! Гэта тое, што нам трэба. Рамы. Без шкла, але добрыя. Вось пашанцавала!

Ля сцяны стаялі тры рамы. Дзве большыя — прамакутныя і адна невялікая — круглая. Усе яны былі вішнёвага колеру, лакіраваныя, шырокія, з высокім профілем. На іх адчуваўся цяжкаваты форс. Дрэва было крыху паточанае шашалем, але крэпкае і прыгожае.

— У гэтых рамах, відаць, былі партрэты гаспадароў,— сказаў Віталік і агледзеў адну з рам.

— А навошта ў новай кватэры старыя рамы, тым больш паточаныя шашалем?

— Такія прыгожыя рамы — гэта памяць,— Арсень трымаў і аглядаў з розных бакоў круглую раму.

— Памяць — фотаздымкі, а рамы — якая памяць?

Хлопцы круцілі рамы, пагладжвалі лакіраваную паверхню, выціралі пыл, спрабавалі выцягнуць іржавыя цвічкі, якія некалі трымалі шкло.

— А што будзем рабіць з фотаздымкамі?

— А што ты прапануеш? — Віталік праз раму паглядзеў на Арсеня.

— Прапаную ўзяць. Прыгожыя фотаздымкі. Спатрэбяцца для працы.

— Добра. Давай падзелім. Я вазьму два з жанчынай і чаромху, а табе вось гэтыя. Згодзен?

— Навошта табе два з жанчынай, дай адзін мне.

— Жанчына падобна да маёй маці.

— Пакажы. Гэта табе здаецца, што яна падобна. Твая маці зусім іншая,— Арсень скептычна пераводзіць позірк з Віталіка на фотаздымак.

— Я памятаю сваю маці маладой.

— Маці немагчыма памятаць маладой. Яна заўсёды такая, як зараз. Я не магу ўспомніць сваю маці маладой.

— Не можаш, а я памятаю, вось таму і забяру. Тым больш я іх знайшоў.

— Добра, бяры, толькі не крыўдуй,— твар Арсеня пачырванеў, і вочы зрабіліся зусім сінімі.— А рамы як падзелім?

— Як хочаш, ты іх знайшоў.

— Кожнаму па вялікай, а як круглую?

— Мне не падабаецца круглая, можаш яе пакінуць сабе.

— Дзякуй, Віталь Аляксандравіч, а мне круглая вельмі даспадобы. Трэба яшчэ паглядзець, можа, знойдзем іншыя — бачыш, колькі плям на шпалерах.

Хлопцы пахадзілі па другім паверсе і сышлі ўніз. Мінулі маленькі пакой кухні і апынуліся ў вялікім, на два акны памяшканні. Кот сядзеў на падваконні і глядзеў у пакой. На падлозе былі рассыпаны цвікі, параскіданы кансароўкі і кавалкі бітага шкла.

— Асцярожна, не прабі падэшву,— сказаў Віталік.— Бачыш, колькі шкла.

— Я гляджу пад ногі, не хвалюйся.

На круглым стале з точанымі ножкамі ляжала вопратка, перапэцканая фарбай. Каля сцен стаялі бутэлькі розных памераў і з рознага шкла, слоікі, амаль усе колатыя, эмаліраваная міса, начоўкі, паедзеныя ржой, шкапчык, крэсла без спінкі, паламаныя скрыні і шмат іншых вялікіх і дробных рэчаў.

— Як шмат збіраецца непатрэбных рэчаў, а іх трымаюць няведама на што,— сказаў Арсень і паправіў рамы, што віселі на плячы.

— Асабліва не захоўваюць. Рэчы існуюць, і іх не заўважаюць, калі людзі пераязджаюць — рэчы робяцца бачнымі, а многія непатрэбнымі ў новай кватэры.

— Уяві, што мы не першыя, хто наведаў гэты дом. Частка знікла, частку ўзялі мы. Вакол людзей адны рэчы.

— А другія?

— Якія другія?

— Ты кажаш адны, а я кажу другія.

— Не чапляйся за словы.

— Слова — не рэч, і зачапіцца за яго немагчыма,— сказаў Віталік.

— Цікава... Рэч можна забыць, а слова?

— Слова? Можна забыць і слова.

— Адмыслова.

— Нічога адмысловага, усё проста.

— Спрошчана і заблытана,— сказаў Арсень.

— Пойдзем...

* * *

Хлопцы выйшлі на вуліцу, крыху пастаялі пад крывымі яблынямі і таполямі. З акна на іх пазіраў вялікі шэры кот. Нападалёк глуха стукала чыгунная баба і чуўся смех рабочых. Над кварталам лунаў пах скрышанай цэглы.

— А што ты намалюеш у вялікую раму, Віталік?

— Намалюю гэты дом, дзе мы іх знайшлі. А ты?

Арсень прыставіў раму да свайго твару, зрабіў сур'ёзны выгляд і спытаў:

— А табе падабаецца мой партрэт на фоне сцяны?

— Падабаецца.

— Гэта табе падарунак на доўгую памяць.

Яны ішлі па асфальтаванай сцежцы, потым разам азірнуліся на двухпавярховы дом, што стаіўся між крывых яблынь побач з вялікім шэра-бетонным шматпавярховікам.

## Вонкавае святло

У памяшканні цырульні два крэслы. У адным сядзіць дзяўчына год дваццаці пяці ў халаце са штучнага шоўку і фарбуе бэзавым лакам доўгія пазногці. Перад ёй ляжыць замежны каталог з каляровымі глянцавымі старонкамі. Яна паварочваецца да мяне, папраўляе далонню халат і паказвае на вольнае крэсла.

— Праходзьце і сядайце,— запрашае яна нізкім грудным голасам. У яе бэзавая, знарок пабэрсаная хімічная прычоска, чорныя бровы і вялікія прыпухлыя вусны колеру перaспелай слівы.

— Вам зрабіць прычоску? — яна закідвае нагу на нагу і вострым наском невысокага чаравіка зачыняе дзверцы шкапчыка.

Я ківаю галавой і адкідваю з вачэй доўгія валасы.

— Вы хочаце, каб я зрабіла вам прычоску? — яна, ацэньваючы, аглядае мяне.— То вам прыйдзецца крыху пачакаць.

— Мне ўсё адно,— кажу я і абводжу позіркам памяшканне салона.

Яна кідае на мяне кароткі позірк і рэзка адварочваецца.

— Тэрэза! Тэрэзачка! Замяні, калі ласка, а то мне няма як.

У невялікім памяшканні салона, запоўненага роўным белым святлом, блытаюцца і хістаюцца скразняком тонкі пах парфумы, тупы пах клею і алейнай фарбы.

Адхіляецца штора, і з суседняга памяшкання выходзіць высокая мажная жанчына год на сорак. На ёй белы шаўковы халат, з кішэні якога тырчаць нажніцы

і металічны грабеньчык з доўгім дзяржаннем, праз руку перакінута прасціна, складзеная ў некалькі столак. Жанчына нягучна ступае на тонкіх нізкіх абцасах да мяне. У яе ярка-карычневыя, перафарбаваныя валасы і маленькія падведзеныя вочы няпэўнага колеру. Яна трымае сябе вельмі ўпэўнена, адчуваючы сваю значнасць у гэтым невялікім салоне.

— Распранайцеся,— кажа яна і паказвае ў кут, дзе стаіць вешалка.

Распранаюся і чапляю сваю куртку побач са скураным паліто і ружовай курткай з вялікімі кішэнямі і бліскучымі кнопкамі.

— Сядайце.

Папраўляю валасы і саджуся ў вольнае крэсла. Перада мной вялікае авальнае люстра ў раме, абцягнутай скуразаменнікам у тон светлых сцен, пафарбаваных пад ружовы мармур. Паўкруглая парцалянавая ракавіна з бліскучым кранам. На два бакі ад ракавіны на невысокіх шкапчыках паблісквае інструмент і разнастайны шкляны посуд з яркімі налепкамі, у большасці замежнымі.

У люстры адбіваецца мая постаць і процілеглае крэсла, перад якім вісіць такое ж люстра. Над адным шкапчыкам прымацаваныя каляровыя здымкі мужчынскіх прычосак. На ўсіх здымках абыякава ветлівыя твары і робленыя рэкламныя ўсмешкі. Ва ўсіх гальштукі і чорныя бліскучыя валасы, у некаторых акуратныя бароды. Над другім шкапчыкам вісіць прэйскурант. Я чытаю слова «прэйскурант», адбітае ў процілеглым люстры, потым у тым, што перада мной.

— Малады чалавек, галаву будзем мыць? — да мяне наблізілася адлюстраванне дагледжанай цырульніцы з перакінутай праз руку прасцінай. Яна паглядзела на медальён гадзінніка, потым на маё адлюстраванне.

— Можна,— адказваю ў люстра.

— Можна ці будзем?

— Будзем.

— Вы ў нашым салоне ўпершыню? Я не памыляюся? Зараз да нас мала хто заходзіць. Яшчэ толькі два тыдні, як мы пасля рамонту. Бачыце, які зараз інтэр'ер,— у голасе цырульніцы задаволенасць.

— Адчуваю.

Яна з шумам распраўляе перакрухмаленую прасціну і агортвае яе вакол маёй шыі. Галава пачынае існаваць асобна ад цела, схаванага ў белы каляны корпус. З цікаўнасцю ўзіраюся ў свой твар. Думаю аб тым, што я сябе добра ведаю, і аб тым, што цяпер я непадобны да самога сябе.

Цырульніца пускае ваду, потым пераключае, і з металічнага распырсквальніка шуміць дожджык. Схіляюся да ракавіны і заплюшчваю вочы. Цёплыя струмені падаюць на патыліцу і бягуць па твары. Вада трапляе на шыю, я ўздрыгваю.

— Не круціце галавой,— разам з шумам вады чую голас. Цырульніца кладзе распырсквальнік у ракавіну і хуткімі спрактыкаванымі рухамі намыльвае валасы. Праз шум вады чую голас. Адкрываю рот, каб перапытаць. Мыльная вада трапляе на язык. Выплёўваю ў вiруючы струмень. Разам з шумам вады даносяцца галасы, якія закручваюцца і прападаюць у адтуліне ракавіны. Вада спыняецца, і галаву абгортвае сурвэтка.

Адкрываю вочы. Разбэрсаныя валасы тырчаць у розныя бакі. Мой адбітак запырсканы мутнымі кроплямі. Цырульніца няспешна праціpae люстра вільготнай сурвэткай. Потым абмывае ружовую ракавіну і рукі. Я разглядаю фотаздымкі.

— Аля, а што ён доўга не наведваецца?

Яны працягваюць размову, пачатак якой я не чуў за шумам вады.

— Я дамовілася.

— На сёння?

— На вечар.

— А фарбавацца пачала да абеду. Дык ён зможа дапамагчы? — Тэрэза паварочваецца і глядзіць на Алю.

— Я сказала, што ты вельмі прасіла.

— Пры чым тут я? Ты што, не ведаеш, як робяцца такія справы. Магла не казаць, што гэта для мяне.

— Якая розніца, калі зможа, то дастане.

— Табе ніякай розніцы, а я буду павінна.— Тэрэза акуратна расклала інструмент, прыбрала сурвэтку, выцягнула з нагруднай кішэні грабеньчык і пачала прычэсваць мне валасы.

— Тэрэза, а ты ведаеш, у яго жонка і дзіця? — гучыць грудны голас за маёй спінай.

— Адкуль?

— А добры лак, зірні,— над крэслам з'яўляюцца рукі з доўгімі бэзавымі пазногцямі.

— Няблага. Ён прынёс?

— У гэтым нешта ёсць.

— А ты пайшла б за яго?

— Не трэба рабіць з гэтага праблему. Замуж я паспею.

— Паспееш... Ён, відаць, не прапануе? Усе яны аднолькавыя...

Аля не адказвае.

У люстры я сустракаюся позіркам з Тэрэзай.

— Як будзем стрыгчыся? — грабеньчык трапляе ў нагрудную кішэню.

— Акуратна.

— Шмат здымаць?

— Не вельмі.

— Разумею, што вы хочаце.

У руцэ з'яўляюцца нажніцы. Яны некалькі разоў ляскаюць у паветры, і валасы, падхопленыя грабеньчыкам, пачынаюць церушыцца на твар. Я закрываю вочы.

— Тэрэза, ты яшчэ працуеш там?

— Працую. А што зробіш — дачка...
— І колькі атрымліваеш?
— Мала. Паўстаўкі.
— Мне б куды ўладкавацца.
— Не круціся, а выходзь замуж за афіцэра ці...
— Адзін раз ужо выйшла за інжынера.
— І не кажы...
— Тэрэза! Відаць, непрыемна там працаваць? — нізкім голасам пытае Аля.
— Прыемнага мала.
— Я не змагла б.
— Чаму? Розніцы ніякай, і кліенты ніколі не крыўдуюць.
Адчуваю салодкі пах парфумы, рукаў халата касыча твар. Непрыемна.
— Там, відаць, трапляюцца і не зусім хворыя?
— Розныя.
— Можа, апошні раз. Заляцаюцца...— Аля смяецца нізкім грудным смехам.
Адкрываю на імгненне вочы. У люстры хістаецца бэзавы чуб. Аля ўстае з крэсла і, трымаючы рукі перад сабой, падыходзіць да маёй цырульніцы і кажа нешта на вуха.
— Табе жарцікі. Нафарбавалася і пабегла,— Тэрэза смяецца прыглушаным смехам.
Аля паварочваецца і ідзе ў другое памяшканне: «Так, я пастаўлю каву, хутка абед...»
— У вас прыгожыя валасы, толькі злёгку непаслухмяныя. Зверху здымем крыху.
Нажніцы клацаюць. Зноў закрываю вочы.
— Вы, відаць, шмат пакінулі?
— Што вы. Я раблю сучасную прычоску. Будзеце модным маладым чалавекам. Зноў прыйдзеце да мяне. Усе дзяўчаты...
— Не трэба,— перапыняю цырульніцу.— Мне не падабаюцца модныя прычоскі.

— Не круціце галавой. Я жанчына і ведаю, што вам патрэбна.

Яна прапускае мае словы, быццам недачула. Нажніцы і грабёнка раўняюць валасы. Тэрэза абыходзіць вакол мяне. Яе вочы напалову прыкрыты падмаляванымі павекамі. Яна з розных бакоў аглядае маю галаву. У яе на твары прафесійная задаволенасць.

Нажніцы ўсунуты ў кішэню. Цырульніца старанна прычэсвае мае вільготныя валасы. Мой твар зрабіўся асіметрычным.

— Ведаеце, што я вам скажу. У мяне самой дачка, і таму я разумею, што ім даспадобы. Музыка, адзенне, прычоскі — разумееце, пра што я кажу?

Побач з маім адлюстраваннем фотаздымкі. Мая прычоска падобная да прычосак гэтых «бутафораў».

— Ну вось, выдатна пастрыглі,— нажніцы высока падразаюць скроні.

За шторай гучыць тэлефонны званок. Тэрэза глядзіць на свой залаты медальён-гадзіннік.

— Прыгожа і сучасна. Вам падабаецца? — пытанне атрымліваецца сцвярджальным.— Нават лепш, чым я спадзявалася.

Уключаецца фен. Цырульніца шчоткай падкручвае і ўкладвае валасы.

Адпаведнасць з фотаздымкамі поўная. Толькі валасы ў мяне не такія чорныя, а так — «рэкламны бутафор». Цырульніца бярэ квадратнае люстэрка і дэманструе мне патыліцу і скроні. Кладзе люстэрка і пэндзлем пачынае абмахваць шыю і твар.

— Хоць на спатканне. Задаволены? Хвілінку...

Тэрэза падхоплівае брытву, спрытна шморгае па рэмені і папраўляе адну, потым другую скронь.

— А зараз адэкалон, і ўсё.

У руках цырульніцы з'яўляецца прыгожая бутэлька з залатымі лацінскімі літарамі.

— Пачакайце.

— Слухаю вас.

«Позна ты сабралася мяне слухаць»,— думаю я і гляджу на сваё адлюстраванне.

— Мне здаецца, што трэба яшчэ зняць.

— Не зразумела, што зняць?

— Па ўсёй галаве. Зрабіць валасы карацейшымі.

— Навошта?

— Мне так хочацца. Я казаў, што мне не падабаюцца модныя прычоскі. Я хачу, каб усе валасы былі аднолькавай даўжыні. Разумееце — аднолькавай. Без «новых хваль».

— Я зрабіла...— у голасе разгубленасць.

— Я згодны. Зрабіць валасы як былі, немагчыма, а карацейшымі можна.

Маўчанне. Некалькі імгненняў цырульніца вагаецца. Памалу нажніцы робяць валасы карацейшымі.

— Тэрэзачка! — парушае напружаную цішыню грудны голас з-за шторы.— Ён пазваніў, што хутка будзе.

Я не гляджу на сваю прычоску. Я разглядаю адбіткі шклянога посуду ў вялікім авальным люстры. Павольна падымаю вочы: белая, засмечаная прасціна ў ломкіх складках, шыя, цяжкаваты падбародак, сціснутыя вусны, цёмныя цвёрдыя вочы, зведзеныя да пераносся бровы, прычоскі як не было.

— Тэрэза! Ён прынясе касеты для тваёй дачкі і ўсё астатняе. Ён хоча ■ ёй пазнаёміцца. Гэта я жартую. Разлічвацца будзеш сама.

— Прабачце, але гэта не тое. Давайце здымем усе валасы поўнасцю.

— Тэрэза! Ён яшчэ пытаў пра тваё здароўе. Ты што, заснула ці закахалася ў маладога чалавека? — прыглушаны смех.

— Вы што, здзекуецеся? — дрыготкім голасам кажа Тэрэза.— Я зрабіла вам прычоску, потым другую. Я не разумею, што вам патрэбна.

— Яны мне не да твару. Давайце здымем поўнасцю.

— Тэрэза, ён хутка прыйдзе, а ўвечары мы едзем на дачу — нарэшце прапанаваў. Я, зразумела, спачатку зрабіла выгляд... Тэрэза!

Між штораў з'яўляецца постаць Алі з нафарбаваным тварам.

Машынка пакідае белую палосу на тым месцы, дзе быў прабор.

— Што ты робіш, Тэрэза?!

— Не ведаю...

Адна палоса, другая. Праз мінуту мая галава робіцца светлай. Адразу заўважаюцца загар на твары і вушы, раней схаваныя валасамі.

— Такія валасы...

— Валасы адрастуць, я не хвалююся.

Тэрэза дакранаецца да свайго лба.

— Усё, малады чалавек.

Я маўкліва пагладаю на сваё аблічча. Цяпер я зусім непадобны да «рэкламных бутафораў». У тых, на здымках, чорныя густыя валасы.

— Вы забыліся? — кажу я і паварочваюся да цырульніцы.— Адэкалон.

Тэрэза пакорліва бярэ бутэльку. Я заплюшчваю вочы і ў адэкалонным тумане чакаю, пакуль яна перастане націскаць на залаты распырсквальнік.

— Колькі з мяне за прычоску?

Каля прэйскуранта здзіўленая стаіць Аля.

Апранаюся і, яшчэ раз зірнуўшы ў вялікае авальнае люстра, аздобленае скуразаменнікам у тон малянага мармуру сцен, выходжу з салона. На ганку сутыкаюся з мужчынам няпэўнага ўзросту, з моднай прычоскай і ў цёмных акулярах. У яго руках вялікая балоневая сумка. Ён падымае на мяне галаву і саступае дарогу.

# Швэдар

Цёплым красавіцкім днём ён вяртаўся дамоў. Святлафор на скрыжаванні вуліц успыхнуў жоўтым святлом. На сярэдзіне вуліцы ён сутыкнуўся з дзяўчынай. На імгненне яны спыніліся. Святлафор успыхнуў чырвоным святлом, і яны засталіся ўдваіх між машын, на белай крэсе, што падзяляла дарогу. Яго звалі Максім, яе — Грэта. На зялёнае святло яны рушылі разам. Ён паабяцаў прыехаць да яе.

Каб не залежаць ад гарадскога транспарту, які працуе да гадзіны пасля поўначы, ён ездзіў да яе на ровары.

Яна жыла на ўскраіне горада. На транспарце, з перасадкамі і чаканнем на прыпынках, шлях займаў амаль гадзіну, на ровары ён даязджаў раней.

Ён выносіў ровар у двор і аглядаў яго. Шчоўкаў нікеляваным пераключальнікам хуткасці. Кратаў тонкія бліскучыя спіцы, прыўзнімаў ровар і круціў педалі. Націскаў адну ручку храпавіка, потым другую. Ад лёгкага націску колы рэзка спыняліся, і бліскучыя спіцы заміралі. Ён садзіўся на ровар і рабіў невялікі круг па двары. Ровар спачатку парыпваў, потым ішоў мякка, з аднастайным шоргатам па шурпатым асфальце. Максім пераключаў хуткасць і выязджаў на вуліцу.

Вокны высокіх будынкаў адбівалі захад. Шкло чырванела ў халодным паветры, і здавалася, што яно плавіцца. Вуліцы шарэлі і страчвалі ахутаныя папяловым змрокам свае геаметрычна акрэсленыя абрысы. Запаль-

валіся ліхтары, лямпачкі, падфарнікі машын, неонавыя рэкламы — і вуліца пачынала плыць зіхоткай ракою.

Ён не любіў ехаць услед за аўтобусам ці тралейбусам. Вялікія, з асветленымі салонамі, яны нагадвалі акварыумы, а пасажыры — рыб, што ўтаропіліся ў шкло і пазіраюць на яго з цікаўнасцю і непаразуменнем. Аўтобусы і тралейбусы спыняліся, адчынялі дзверы, расплёсквалі жоўтае святло, прымалі новых пасажыраў. Ён прыгінаўся, мацней націскаў на педалі, абмінаў асветленыя скрыні і з палёгкай уздыхаў.

Паступова ён звыкаўся з плынню вуліцы, не палохаўся рэзкіх сігналаў і ўспрымаў яе сваёй тэрыторыяй. Ён адчуваў, як трэба ехаць да святлафора, каб не спыняцца і заўсёды трапляць на зялёнае святло.

На стыках рэек цяжка грымелі перапоўненыя трамваі. З-пад дуг ляцелі сінія іскры і на момант выхоплівалі нежывым святлом яго постаць на лёгкім спартыўным ровары. Ён паспяваў заўважыць сваё адлюстраванне, імгненнае і падобнае да негатыва.

Вуліца павольна ўздымалася на мост. Цёмная перспектыва дарогі ўпіналася ў халоднае, ужо згаслае неба. На мосце было ветрана. Ровар рухаўся марудна і цяжка побач з тратуарам.

З моста быў бачны яе дом, што бетонным кубам узвышаўся над купамі абляцелых таполяў і нізкімі будынкамі.

Ён пераставаў круціць педалі, прыгінаўся, і ровар сам набіраў хуткасць. Сапсаваная маланка скуранай курткі разыходзілася, халоднае паветра ахапліваў цела, і з'яўлялася пачуццё палёту над шурпатай плоскасцю асфальту.

— Ты зноў на ровары? — пытала яна замест прывітання.

— На ўласным транспарце.

— Праходзь, калі ласка.

Ён пакідаў ровар у калідорчыку, зачыняў дзверы і

праходзіў у кватэру. Здымаў старую выцертую куртку. Развязваў доўгі трохколерны пасясты шалік, глядзеў у вялікае авальнае люстра на свой абветраны твар і чырвоныя рукі.

— Ты пахнеш ветрам,— гаварыла яна і цалавала яго ў халодныя вусны.

— Добры вечар, Грэта.

— Я чакала цябе, Максім.

Яна патушыла святло. Ён павярнуўся і прайшоў праўз зачыненыя асветленыя дзверы залы ў яе пакой. Адразу сеў у мяккае скуранае крэсла і ўзяў кніжку, што ляжала пад настольнай лямпай на стале.

Яна зайшла ўслед за ім і села насупраць у такое ж вялікае і мяккае крэсла.

— Чытала?

— Чакала.

— Ты ўжо даўно чытаеш гэту кніжку.

— Мне падабаецца чытаць доўга.

— Давай раскажу, чым яна скончыцца.

— Не трэба — будзе нецікава чытаць.

— Затое будзе цікава слухаць.

Яна паднялася, падышла да яго, узяла кніжку і паклала на стол.

— Максім, гэта блага скончыцца, калі ты не кінеш ездзіць на ровары.

— А кніжка скончыцца добра.

— Мы зараз не пра кніжку, а пра цябе.

— Ты ўвесь час гаворыш пра ровар, быццам няма пра што іншае. Мне гэта надакучыла,— сказаў ён і ўзяў кніжку.

Яна падышла да акна і адсунула цяжкую барвовую штору. Залатыя кветкі на барвовай тканіне варухнуліся.

Ён падняў вочы. Яна ўзіралася ў чорнае шкло і малявала нябачнае на бліскучай паверхні. Звонку вертыкальнымі рыскамі беглі кроплі дажджу. Яна адной

рукой трымала крухмальнае крыло белай гардзіны, другой вяла па шкле. У яе прыгожыя рукі з доўгімі маціцовымі пазногцямі. На яе вязанай срэбна-карычневай кофце вялікія маціцовыя гузікі. З такою ж спражкаю вязаны пояс мякка перахоплівае талію. У яе правільны твар з ясна акрэсленымі вуснамі. У яе тонкія чорныя бровы і блакітныя празрыстыя вочы, але зараз яны чорныя, таму што адбіваюць цемру за шклом.

Яна маўчыць. Ён перагортвае старонкі.

— Калі выпадзе снег, ты не зможаш ездзіць на ровары.

— Я прыеду на лыжах. Табе гэта больш падабаецца?

— Ты аддаляешся.

— Табе здаецца.

Ён паклаў кніжку на стол.

— Я чакала цябе.

— А каб я не прыехаў?

— Ты прыехаў.

— Дзякуючы ровару.

— Каб ты прыехаў на аўтобусе, можна было б пайсці ў кавярню.

— Мы можам пайсці і зараз.

— У цябе такі выгляд, што лепш сядзець дома.

— Там цёмна. Каму ёсць справа да майго выгляду?

— Табе будзе халодна,— сказала яна і павярнулася да яго. Крухмальнае крыло гардзіны хіснулася і знерухомела. Па чорным шкле беглі вертыкальнымі рыскамі кроплі дажджу.

— Пайшоў дождж.

— Максім, а ты памятаеш снег, які быў мінулай зімой?

— Я памятаю снег, які быў у красавіку.

— Красавіцкі снег — гэта немагчыма.

— Гэта праўда. Я таму і запомніў, што гэта немагчыма. Ён хутка выпаў і да вечара знік.

— А чаму я не памятаю?

— Кожны памятае тое, што яго здзівіла. Мяне здзівіў той раптоўны снег.

— Мне падабаецца зіма, падабаецца снег, але красавіцкі я не памятаю,— сказала яна, павярнулася і пачала глядзець праз белую крухмальную гардзіну.

— Я магу расказаць пра той снег.

— Максім, ты не адчуваеш, што мы гаворым пра рознае.

— Мы гаворым пра снег.

— Мы гаворым пра розны снег.

— А якая розніца?

— Я памятаю снег, што быў зімой. Ты памятаеш красавіцкі. У нас розныя ўспаміны.

— У нас ёсць і агульныя.

— Ёсць, але ты ўспомніў красавіцкі снег.

Ён пазіраў на зашклёную шафу. На акуратныя рады кніжак з залатымі літарамі на скураных карэньчыках. Побач з шафай пакрытая пледам у буйную чырвона-карычневую клетку распласталася нізкая канапа. Плед быў колкі. Ён успомніў, што, калі пазіраць з канапы на крыштальную люстру, робяцца бачнымі тры лямпачкі, і цень ад люстры нагадвае кветку на доўгай сцяблінe. Кветку, якая ляжыць на белай плоскасці столі.

Ля канапы на барвовым дыване ляжаў вялікі клубок шэрых ваўняных нітак. З клубка тырчэлі два бліскучыя нікеляваныя пруткі. Ён успомніў, што яна хадзіць у сваім пакоі босая.

— Да чаго гэта падобна? — спытала яна, перахапіўшы яго позірк.

— Што?

— Клубок са спіцамі.

— Не ведаю.

— А я ведаю, што з гэтага атрымаецца.

— А да чаго падобныя аўтобусы і тралейбусы ў начным горадзе?

— Самі да сябе,— сказала яна і зноў паглядзела ў акно.

— А мне яны нагадваюць акварыумы, а людзі — рыб, якія глядзяць на свет праз шкло.

— Лепш бы ты ездзіў як усе, у «акварыумах»,— яна зрабіла націск на апошняе слова.

— «Акварыумы» не ездзяць пасля апоўначы.

— Хопіць пра гэта. Пойдзем вячэраць, нейкая бясконцая размова.

Грэта падышла, дакранулася да яго рукі. Максім падняўся і пайшоў за ёй на кухню.

— Табе падабаюцца гэтыя ніткі? — яна падняла шэры клубок, як толькі яны вярнуліся з кухні.

— Ніткі шэрыя,— ён сеў у крэсла.

— Я вырашыла звязаць табе світэр з гэтых нітак.

— Калі шэры — дык швэдар. Швэдар гучыць больш утульна.

— Гэта сапраўдная свойская воўна, табе будзе ў ім цёпла. Швэдар, ровар — прыгожыя словы. Табе патрэбен швэдар, хутка зіма. Мне будзе прыемна яго вязаць.

Яна паклала клубок у крэсла. Адчыніла стол, выцягнула шуфлядку, дзе ляжалі невялікія клубкі сініх нітак, і знайшла цыратовую стужку-метр.

Цыратовая стужка аперазала яго. Дакранулася халодным металам да шыі, крутанулася вакол рукі і, кінутая на стол, знерухомела.

З другой шуфлядкі яна дастала ліст паперы і аўтаматычную трохколерную ручку. Потым намалявала швэдар.

— Твой малюнак не падобны да мяне.

— Швэдар будзе па табе. Не перашкаджай, я запішу некалькі лічбаў.

Яна напісала лічбы, узяла клубок, села ў крэсла. Ён узяў кніжку і пачаў перагортваць па некалькі старонак. Яна паблісквала пруткамі і набірала петлі.

— Гэта цяжка і доўга,— сказаў ён.

— Гэта цёпла і прыгожа.

— Мне шкада твайго часу.

— Мне шкада цябе.

— Грэта, я магу абысціся без швэдара.

— Я не магу,— яна спынілася.— Не перашкаджай, я лічу.

— Мы перасталі разумець адно аднаго.

Яна маўчала і лічыла петлі. Галава была нахілена. Вачэй ён не бачыў. Вусны рухаліся — яна лічыла петлі.

— Раней мае паводзіны не былі дзіўныя для цябе. Табе падабалася, што я прыязджаю на ровары.

— Ты гэтага не заўважаў.

— Але чаму я заўважаю гэта зараз?

— Таму, што ты параўноўваеш мяне з іншымі.

— Я не ведаю іншых.

— Мне цяжка пра гэта гаварыць.

— Цяжка, але ты сама вымушаеш весці такую размову.

— Прабач, Максім, я больш не буду.

Яна паклала клубок і пруткі на падлогу. Потым устала з крэсла і зачыніла стол. Ён схіліўся над кніжкай.

Грэта стаяла перад акном. Дождж перастаў. У чорнай вугальнай цемры гарэлі рэдкія ліхтары. Вокны дамоў былі цёмныя. Прыпынак ля дарогі пусты. Апошнія аўтобусы не спыняліся ля прыпынку — яны вярталіся ў парк. Спічастая тэлевежа гарэла дзвюма чырвонымі кроплямі святла. Вецер хістаў вяршаліны таполяў. Праехаў тралейбус, сыпануў сінія іскры. Святло выхапіла кавалак дарогі ў бліскучых калюгах. Яна ўспомніла яго сагнутую постаць, калі ён уз'язджае на мост.

Над мостам неба было чорнае і глыбокае. Тралейбус зноў сыпануў сінія іскры і знік за мостам. Дождж перастаў, па шыбцы не беглі кроплі.

— Сіняе святло ўначы палохае.

Ён зірнуў на яе.

— Палохае, як яно пульсуе.

— Калі ты едзеш ад мяне, я заўсёды гляджу ў акно, пакуль ты не схаваешся за мостам.

— Я колькі раз аглядаўся, але тваё акно было цёмнае.

— Я не буду тушыць святло, пакуль ты не схаваешся за мостам.

— Я азірнуся.

— Лепш не азірайся.

Яна занялася вязаннем. Ён чытаў кніжку.

— Грэта, цябе ніколі не цікавіла тое, што я раблю.

— Як і цябе не цікавілі мае заняткі.

— Ты не расказваеш пра іх.

— Я ведаю, табе гэта нецікава.

— Можа, і так. А мае справы?

— Я нічога ў іх не разумею. Гэта цікава тваім сябрам, табе самому.

— Хочаш, я раскажу, чым займаюся зараз?

— Лепш другім разам.

— Мы заўсёды пакідаем цяжкія размовы для другога разу. А калі яго не будзе?

Яе пальцы спыніліся.

— Я звяжу табе швэдар з сіняй паскай, ты згодзен?

— Ты звяжаш швэдар, я ў гэтым упэўнены.

— Максім, ты ездзіш на ровары, каб не залежаць ад мяне.

— Зноў ровар. Я езджу на ім, каб не залежаць ад транспарту.

— Я не пра ровар. Я пра тое, што мы не разам. У нас розныя справы, розныя ўспаміны, рознае жыццё.

— Ты перабольшваеш, Грэта.
— Я недагаворваю.
— Кажы.
— Гэта немагчыма.
— На спартыўным ровары ўдваіх.
— Ты не хочаш мяне зразумець.
— Я разумею.
— Я хачу быць побач.
— Я магу цябе везці.
— Ты жартуеш, калі трэба гаварыць сур'ёзна.
Яны некалькі хвілін маўчалі.
— Ты можаш ездзіць на ровары. Я не супраць,— прагаварыла яна і глянула на яго.
— Я падумаю, я ўсю дарогу буду думаць...
Пасля цеплыні кватэры ў двары было холадна. Ён удыхнуў паветра і скалануўся. Паправіў шалік, тужэй зацягнуў яго вакол шыі. Прыўзняў ровар, крутануў педалі. Сеў, адштурхнуўся ад бардзюра і выехаў на вуліцу.

Дарога была ў калюгах, якія адбівалі святло рэдкіх ліхтароў. Дарога пачынала ўздымацца на мост. Над дарогай, крыху асветленай, адразу пачыналася чорнае неба. Яму здалося, што там, дзе дарога сутыкаецца з небам,— строма. Ён цяжка круціў педалі. Ровар рухаўся, набліжаўся да чорнага неба, якое рабілася адчувальна халодным.

Ён ледзь уз'ехаў на мост і застыў на самай высокай кропцы. Некалькі імгненняў ён трымаў раўнавагу, супраціўляўся сустрэчнаму ветру. Ён хацеў азірнуцца на яе акно. Ровар зрушыў уперад, перасек вяршыню моста.

Ён націснуў на педалі і пачаў круціць іх хутчэй і хутчэй. Ровар імчаў па белай крэсе. Ён не шкадаваў ровара і не зважаў на калюгі і вецер. Ён імчаў насустрач святлафорам, што пульсавалі жоўтым святлом.

Ён разагнаў ровар, не адчуваючы хуткасці. Дамы

ператварыліся ў чорна-шэрую сцяну. Ровар імчаў, але Максіму здавалася, што ён стаіць на месцы, на самай высокай кропцы моста, на белай крэсе, што падзяляе дарогу.

Цёплым красавіцкім днём ён вяртаўся дамоў. На скрыжаванні вуліц яго спыніў святлафор. Па другім баку вуліцы ішла Грэта поруч з хлопцам, апранутым у шэры швэдар з сіняю паскай. Максім паглядзеў на іх, і яму стала няёмка. Святлафор успыхнуў чырвоным святлом. Максім падумаў, што і ў красавіку бывае снег.

# Зімны лёс

Шпітальная палата з кафлянымі сценамі была на адно акно. Алег мог гадзінамі глядзець на яго і сачыць колкае зіхценне крупчастых крышталяў, якія складаліся ў дзіўныя кветкі. Алег забываўся на боль. Думкі блыталіся, наплывалі ўспаміны. Белыя шурпатыя кветкі змянілі абрысы, і сузіранне іх прыносіла часовую палёгку і спакой. Алег засынаў. У сне звычайна вяртаўся боль, і ён прачынаўся. Малюнак на шыбах быў неверагодна вытанчаны і дакладны пры ўсёй фантастычнасці і неадпаведнасці рэальнаму жыццю.

Хлопцы ляжалі і глядзелі на спрэс замерзлае акно.

— Прыеду дахаты — яшчэ снег будзе. Пайду на лыжах на паляванне,— сказаў Міця і паглядзеў сваімі вялікімі празрыстымі вачамі на Алега.

— Ты што, тут не настраляўся?

— На паляванні іншае... Мы з бацькам ходзім. Прыязджай да мяне, з табой пойдзем. Куды-небудзь далёка. Я ўсю пушчу ведаю.

— Добра, толькі я на лыжах не ўмею,— Алег прыўздымаецца і папраўляе падушку.

— Гэта проста, я цябе навучу.

— Навучыш?

За акном пацямнела. Сонца схавалася. Кветкі на шкле пачалі нагадваць пакамечаны бінт.

— Алег, а ты як сябе адчуваеш?

— Не вельмі. Асабліва, як павярнуся ці хадзіць паспрабую.

— А ты не хадзі, калі што трэба, я прынясу. Скажы толькі.

— Скажу, не хвалюйся.

— Ведаеш, Алег, а мая нага ўжо тыдзень як не баліць. Я яе не адчуваю. Мне нават здаецца, што яе няма,— сказаў Міця і моцна пастукаў па тым месцы, дзе пад гіпсам было калена.

— Што ты робіш?

— Неяк дзіўна. Не адчуваю, і ўсё. Што ты скажаш?

Алег не ведаў, што можна сказаць.

— Калі пачынаеш прыслухоўвацца, то здаецца, што пад гіпсам мурашкі бегаюць.

— Маёр ведае! — падае голас сусед.

— Доктар кажа, што гэтак і павінна быць.

Алег адвёў вочы ад акна і ўтаропіўся ў бліскучы квадрат кафлі. Міця працягваў абмацваць загіпсаваную нагу.

— Слухай, герой, дастань цыгарэту і запалкі.

— Што, моцна баліць? — вінавата спытаў Міця.

— Ідзі, не разважай!

— Можа, сястру паклікаць?

— Ты што, дурань? Я прашу: схадзі па цыгарэту.

Міця спалохана падхапіўся. Абапёрся на мыліцы і нязграбна выйшаў з палаты. Алег пачуў стук мыліц, сухаваты і непрыемны.

Акно ўяўляла сабой дзіўны зімовы краявід. Алег закрыў вочы. Перад вачамі быў лес. Вялікія сосны, з камлямі колеру стрэляных гільз, стаяць маўкліва і непахісна. Пад дрэвамі ішоў хлопчык, тварам падобны да Міці...

З калідора пачуўся стук мыліц.

— Трымай.

Алег адкрыў вочы. Над ім схіліўся Міця, трымаючы на далоні запалкі і цыгарэты.

— Мне не давалі. Потым я сказаў, што для цябе, і далі. Зараз можна: на калідоры нікога, сястра сядзіць ля тэлефона.

Алег узяў цыгарэту. Падумаў. Чыркнуў запалкай,

але прыкурваць не стаў. Ён глядзеў на запалку, якая згіналася, ахопленая полымем.

— Я прыеду да цябе.

— Прыязджай. Мае ўсе ўзрадуюцца. Прыедзеш летам — пойдзем на раку. У нас такая рака... Калі хочаш, тады і прыязджай.

Алег кінуў пад ложак запалку і запаліў наступную.

— Слухай, ты што збіраешся рабіць, як прыйдзеш дахаты?

Міця задумаўся.

— Пайду на паляванне. Адразу,— ён схамянуўся і пайшоў да акна.

— Я не пра тое... Ты вучыцца думаеш?

— Можна. У тэхнікум пайду. Хачу быць лесніком.

— А калі не атрымаецца?

— Мне заўсёды шанцуе. Тым больш да войска я працаваў памочнікам у бацькі.

— Шанцуе? Дурням шанцуе! — Алег закрыў вочы.

Міця стаяў ля акна. Адчыніў вузкую фрамугу і пачаў прахукваць вочка. Потым прыладкаваўся і стаў глядзець у шпітальны двор, безнадзейна пусты і казённы. Нішто не парушала геаметрычнасць халоднай планіроўкі.

Алег заварушыўся і зябка павёў плячамі.

— Ну, як вы тут? — бадзёра спытала медсястра.

— Нічога. А ты як? — адказаў Алег.

— Мароз на вуліцы,— яна стаяла спінай да халоднага іскрыстага шкла, на якім ззялі нежывыя кветкі.

Алег маўкліва пазіраў на сцяну. Дзяўчына папраўляла валасы, што выбіліся з-пад каўпака з чырвоным крыжам.

— А што, на калідоры ёсць хто? — Міця падняўся і, грукаючы мыліцамі, выйшаў.

— Ну, як ён? — сястра кіўнула на Міцяў ложак.

— На паляванне збіраецца,— злосна сказаў Алег і, ухапіўшыся за біла, падцягнуўся.

— Значыць, ты яму не сказаў.
— А чаму гэта павінен рабіць я, чаму?
— Не ведаю.
— Скажы сама.
— Я думаю, лепш...
— А што вы думаеце за мяне. Я не ведаю, як такое сказаць. Не ведаю. Хто я такі, каб абвяшчаць прысуд? Хто мне даў такое права? Маёр? Палкоўнік?
— Так. Усё так,— яна адышла ад акна і села на пусты ложак.— Я цябе разумею.
— Уяўляеш, ён лічыць, што яму шанцуе. Шанцуе... Інвалід. Як можна сказаць гэтаму дзіцёнку, што ён інвалід. Я не магу.
— Табе прынесці кніжку?
— Прынось.
— Добра. Толькі ты не хвалюйся.
— А што мне хвалявацца, мяне праз два тыдні выпішуць.
— Яму гіпс здымуць праз два дні. Потым будзе камісія.
— Ён ведае.
— Сітуацыя.
— Лепш бы мяне паклалі ў другую палату. Я ўжо не магу з ім.
З калідора пачуліся галасы.
— Ну, я пайду. Да вечара.
— Слухай, няўжо нічога нельга зрабіць?
— Маёр сказаў — безнадзейна,— сястра кіўнула і, не падымаючы галавы, хутка выйшла.
Алег закурыў. Цыгарэта была з медыцынскім прысмакам. Замерзлае акно нагадвала зімні лес. Вочка, што прахукаў Міця, вісела над шатамі вялікіх рэліктавых дрэў, як цёмнае сонца. Яно павольна зацягвалася слюдой ільда, рабілася меншым і цьмяным. Алег выдыхваў сіні дым, які скразняком цягнула да акна.

# Спёка

Я спадзяваўся на парк, але спёка панавала і там. Натужна трашчалі касілкі. Востра пахла бензінавым дымам, які цягнуўся сіняватымі шлейфамі за чырвонымі касілкамі і расплываўся над шчацiністымі траўнікамі. Я сядзеў на санцапёку, бо лаўкі ў засені алеі былі занятыя. Ля ног, на ходніку, уздымалі гарачы пыл млявыя шызыя галубы. Паралельна алеі была вуліца. Калі святлафор успыхваў чырвоным, вуліца напаўнялася машынамі. На свежапафарбаваныя тэлефонныя будкі і стракатыя кіёскі глядзець было балюча.

— У вас не будзе запалак? — побач села жанчына.

Я падаў запальнічку.

— Не працуе,— жанчына некалькі разоў бездапаможна шчоўкнула спружынай.— Дапамажыце,— вінавата і адначасова дапытліва яна зірнула на мяне.

Агеньчыка не было відаць.

Жанчына была апранута ў лёгкую стракатую спадніцу і белую паўпразрыстую кашулю. Я адвёў вочы ад ярка асветленай тканіны.

— Я спадзяюся на вашу дапамогу,— яна глыбока зацягнулася. Тонкі струменьчык дыму павольна ўздымаўся ад цыгарэты.— Вы мне дапаможаце?

Я назіраў, як яна ішла да мяне па алеі, у залацістым контрсвятле, якое дакладна абмалёўвала яе зграбнае цела. Мне падабаліся доўгія ногі і высокія абцасы, мне падабалася яе раскаванасць.

— Ведаеце, я не магу больш. Я зусім знервавалася. Ён мне здраджвае. У яго ёсць жанчына. У яго ёсць ка-

ханка. Я ўпэўненая ў гэтым! — яна гаварыла і ўвесь час пазірала халоднымі сінімі вачамі на літую чорнаалейную агароджу парку, на чараду машын, на тэлефонныя будкі.— Дапаможаце?

Было горача. Сухое нерухомае паветра напаўнялася трэскам блізкай касілкі.

— Пры чым тут я? Адкуль вы ўсё гэта ўзялі? — я разгубіўся.— У мяне тут прызначана сустрэча.

— Мне трэба пагаварыць з ёй. Зразумейце мяне. Я спадзяюся на вас,— яе просьба і голас поўнасцю не стасаваліся з яе ўпэўненым, нават экстравагантным выглядам.

— Нічога я не разумею.

— Вясной ён трапіў у аварыю. У машыне з ім была жанчына — гэта яна. Не пераконвайце мяне. Вы, відаць, падумалі, што я...— яна паспрабавала ўсміхнуцца.

— Я слухаю,— я глядзеў на яе ногі, на цёмна-вішнёвыя акуратныя пазногці.

— Я больш не магу так. Гэта немагчыма трываць. Прасачыце, куды ён пойдзе — мне неабходна пагаварыць з ёй,— яна кінула недапалак на скошаны траўнік.

Мне падалося, што ад гэтай цыгарэты можа загарэцца жнівеньскі парк. Да спаткання было яшчэ больш за гадзіну. Я не змог адмовіць.

— Чакаю вас тут,— яна хвалявалася, калі паказвала на мужчыну, які крочыў па другім баку вуліцы ля гарача-жоўтых тэлефонных будак.

* * *

...Спачатку я ішоў за ім на даволі значнай адлегласці. Больш за ўсё я баяўся яго згубіць ля прыпынкаў, дзе з аўтобусаў і тралейбусаў выходзілі людзі...

...Мужчына быў не надта прыкметны. Выглядаў гадоў на трыццаць пяць. Калі прыспешваў хаду, нахіляў

каротка пастрыжаную галаву ўперад. Высокі, прыкладна майго росту ці крыху ніжэйшы. Нервовы — гэта было відаць па тым, як ён абганяў прахожых.

Калі ён спыняўся, я рабіў выгляд, што ў мяне разбэрсаліся красоўкі, ці пачынаў разглядаць замежныя стракатыя аўтобусы. Я ўвесь час прымушаў сябе трымацца далей і не парушаць адлегласці паміж намі.

...Спачатку было непрыемна сачыць за ім, а потым гэты занятак захапіў мяне. Мужчына спыняўся — мне давялося хавацца за купку турыстаў, што фатаграфаваліся на фоне праспекта. Шчоўкалі фотаапараты, і я, відаць, трапляў у кадр.

Мужчына стаў у чаргу па газіроўку, але шклянкі занятыя. Няўважлівы — шклянкі наверсе аўтамата.

— Вам шклянку? — цікава, які ў яго голас.

— Цёплая? — стомлена пацікавіўся ён.

Дарэмна я гэта зрабіў, ён мог здагадацца. Я суцешыў сябе думкаю, што нам проста па дарозе. Асфальт мяккі. На ім шмат слядоў, асабліва ад тонкіх жаночых абцасаў. Відаць, непрыемна на такіх абцасах па мяккім асфальце — знікае цокат...

Я задумаўся і згубіў мужчыну. Куды ён мог падзецца? Вочы шукалі знаёмае спалучэнне белай кашулі, шэрых портак і чорнага дыпламата...

Дыпламат стаяў ля сцяны. Мужчына тэлефанаваў з таксафона. Ён ківаў галавой, быццам той, з кім ён гаварыў, мог яго бачыць. Я быў змушаны прайсці побач і павярнуць за рог дома...

...Белая, як цукровая, балюстрада ўздоўж праспекта з пукатымі вазамі нагадвала перфарацыю фотастужкі. На ёй быў адзіны герой — мужчына ў белай кашулі, усё астатняе праходзіла фонам. Не заўважыць мяне на гэтым, даволі нешматлюдным месцы праспекта было немагчыма.

Мужчына пачаў азірацца. Яго хада то запавольвалася, і здавалася, што ён спыніцца, то ізноў ён пачынаў

спяшацца. Ён азірнуўся, мне няма куды збочыць. Вада пад мостам калюча зіхацела.

На мосце ў мяне з'явілася думка падысці да яго і ўсё растлумачыць. Ён мне падабаўся, і я нават спачуваў яму. Потым падумалася, што можна развярнуцца і пайсці ад яго — і хай яны самі разбіраюцца ў сваіх адносінах.

Але я ішоў, крок у крок, за ім.

У падземным пераходзе было прахалодна. Скразняк ганяў пыл і пах бітума.

— Стойце! Што вам ад мяне патрэбна? — яго рука сціснула мой локаць. Мужчына заступіў мне дарогу.

Я не вырываўся.

— Нічога. Што здарылася? — я адчуваў недарэчнасць свайго пытання.

Ён адпусціў маю руку.

— Хачу пагаварыць з вамі,— я сапраўды спачуваў яму.

У мужчыны на твары была разгубленасць і спалоханасць.

— Дзеля гэтага абавязкова сачыць за мной? — ён злаваўся.

— Я хацеў падысці раней. Ведаеце, так атрымалася.

— Я вас не ведаю. Хто вы такі? — даволі рэзка перапыніў ён.

— Вы ўсё зразумееце. Я...

— Так! Так! — ён паставіў свой чорны дыпламат да сцяны.

— Мяне папрасіла прасачыць за вамі ваша жонка. Яна хоча ведаць адрас.

Мае словы яго не здзівілі. Ён паспакайнеў.

— Я так і ведаў,— ён пахітаў галавой.

— Не хвалюйцеся...

— Я не хвалююся. Хто яна вам? Каханка? — яго тонкія вусны з'едліва скрывіліся, і ён агледзеў мяне.

— Ніхто... Гэта спёка, разумееце, спёка. Я сустрэў яе ў парку, насупраць вашай установы, і яна папрасіла мяне... Паверце, мяне не цікавяць вашы адносіны.

Некаторы час мы маўчалі і глядзелі адзін на аднаго. Ён вышэйшы за мяне, калі мы побач — гэта было відавочным.

— Навошта?.. Навошта ёй гэта ведаць?

— Яна вельмі прасіла.

— Я не жыву з ёй год. Яна тэлефануе на працу, сочыць за мной. Я стаміўся ад гэтага. Стаміўся.

— Яна хоча перагаварыць з вашай жанчынай.

— Дайшла. Просіць людзей сачыць за мной. Ёй цяжка адмовіць, я разумею... Гэтага ніколі не будзе. Перадайце ёй — ніколі! — мужчына ўзяў дыпламат.

— Што ёй сказаць?

Мужчына паглядзеў на гадзіннік.

— Можа, я магу вам дапамагчы?

— Я сам вінаваты...

Мы стаялі ля прахалоднай мармуровай сцяны. Маўчанне рабілася невыносным.

— Я не магу вярнуцца да яе. У мяне жанчына, і ў нас хутка будзе дзіця. Мы памянялі кватэру.

— Мне не трэба адрас. Я скажу, што згубіў вас. Вы селі ў таксі, і я згубіў вас.

— Што гэта зменіць? — у голасе бездапаможнасць і разгубленасць.— Мне нічога не аставалася зрабіць... Яна сачыла за кожным маім крокам. Жыццё ператварылася ў пакуту. Яе падазронасць не ведала межаў. Гэта немагчыма зразумець... Кожны дзень падазронасць.

— Даруйце, я не ведаў.

— Нічога. Бывайце... Я пайду.

Я застаўся ля мармуровай сцяны. Знаёмая постаць аддалялася. Па звычцы я працягваў сачыць за белай кашуляй, пакуль мужчына не збочыў да метро. Мая прыгода скончылася.

* * * Да спаткання было чвэрць гадзіны. Пад зямлёй я перайшоў плошчу і выйшаў на гарачы праспект. Я няспешна набліжаўся да парку і думаў пра тое, што гэтыя дзве жанчыны вельмі падобныя.

Перфарацыя балюстрады. Пыльная лістота парку. Настрой быў сапсаваны. Горад успрымаўся фундаментальна.

Я быў упэўнены, што яна прыйшла на спатканне і чакае мяне. Хто яна мне? Спім. Яна кажа, што кахае. Я маўчу. Нашы адносіны простыя. Здаецца, пакуль ніхто ні за кім не сочыць. З такімі думкамі я збочыў у парк.

Трава, якую скасілі гадзіну таму, сухая. Я пайшоў цэнтральнай алеяй.

Яна заўважыла мяне першая.

— Прывітанне! — адначасна сказалі мы.

— Даўно чакаеш?

— Даўно.

Я глядзеў праз парк у бок вуліцы.

— Там была аварыя. Жанчына трапіла пад машыну. Спяшалася ад тэлефона ў парк.

— Ты яе бачыла?

— Не, я не падыходзіла. Казалі, маладая.

— Даўно?

— З паўгадзіны. А чаму ў цябе такі голас? — яна ўважліва паглядзела мне ў вочы.

— Спёка,— адказаў я і шчоўкнуў запальнічкай.

# Нагода

Ішоў дождж. Аднастайны, халодны і шэры, як цынк. Мокрыя будынкі цямнелі, асфальт шкляніста імжыў пад нагамі каляровымі адбіткамі ліхтароў і хімічна-яркай рэкламай.

З-пад аркі, за якой была суцэльная цемра двара, выйшаў мужчына і зябка знізаў плячыма.

— Касцюкевіч, прывітанне! — без радасці і хвалявання звярнуўся мужчына да прахожага пад парасонам.— Што, сяброў не пазнаеш?

Высокі мужчына паспеў збочыць ■ асветленай вуліцы пад арку, але ад голаса, а хутчэй ад пачутага ўласнага прозвішча спыніўся, быццам перад нябачнай сцяной. Ён нахіліў галаву набок і агледзеў знаёмага.

— А... Буднік, прывітанне! — высокі склаў парасон.

— Ведаеш, Клім загнуўся?

— Клім? — высокі зрабіў крок назад.— Ты гэта сур'ёзна, Буднік?

Буднік стаяў пад сцяной і паціраў рукі. Брызентавая куртка, некалі модная, а цяпер заношаная і мокрая, цяжка вісела на вострых плячах. Вакол худой шыі быў павязаны чорны шалік. Старыя джынсы з абтрапанымі калашынамі і пабітыя размяклыя красоўкі рабілі яго постаць нязграбнай і недарэчнай пад груваста-ўрачыстай ампірнай аркай.

— Ты гэта кінь, Буднік.

— Знайшлі ў сутарэнні ля труб. Там цёпла,— Буднік схаваў рукі ў кішэні.

У арку з асветленага праспекта зайшла жанчына ў

празрыстым цыратавым плашчы. Скразняк расхінуў плашч, жанчына крутанулася спінаю да ветру, прытрымала бліскучае крысо, шалёста павярнулася і знікла ў вільготнай цемры двара.

Кроплі дажджу з бліскучай цыраты трапілі на твар высокаму, і ён уздрыгнуў ад нечаканасці холаду і ад незразумелага страху.

— Эх! — кіўнуў галавой Буднік у бок цемры.

— Даўно? — Касцюкевіч стаў пад сцяну, схаваўся ад скразняку.

— Мне што, я чысты. Табе трэба думаць,— у галасе Будніка з'явілася перавага.— А ты нішто, відаць, пры грашах, а?

— Забілі? — высокі прываліўся да сцяны, адчуваючы колкую фактуру тынкоўкі.

— А ты не ведаеш? Не? Я чаму прыйшоў — папярэдзіць хацеў.

— Досыць балбатаць! Кажы!

— А ты не крычы, не крычы, бо не ў кабінеце следчага. Я па справе.

— Давай, калі па справе,— Касцюкевіч пачаў злавацць.

— Сантэхнікі знайшлі. Зразумеў? Тут і пачалося: міліцыя, следчы, сведкі... У мяне ўсё чыста — я працую. Шпрыц знайшлі. Усёк? Забралі як уліку...

— І далей...— высокі спрабаваў схаваць хваляванне, але адчуў, як прастора аркі сціскаецца ў такт удараў сэрца.

— Пайшлі. Я змерз цябе чакаць. Шпрыц быў твой — фірмовы. Следчы паказваў яго мне і пытаўся, ці пазнаю,— Буднік паправіў каўнер курткі, зацягнуў тужэй пятлю шаліка.— Пайшлі, памянуць трэба сябра. Я сказаў следчаму, што першы раз бачу і гэтым не займаюся — рукі чыстыя. Ты ж ведаеш, сваіх здаваць апошняя справа.

— Пачакай.— Сцены аркі спыніліся, праход здаў-

ся вузкім, сіняе застылае святло нерухомым.— Я, ведаеш, заняты,— няўпэўнена паспрабаваў схлусіць высокі.

— Не цісніся, пойдзем.

Касцюкевіч не крануўся з месца, ён спрабаваў асэнсаваць пачутае. Страх прыціснуў яго да сцяны.

— Ты што, завязаў? Кажы. Тады дай пару чырвонцаў.

— Ведаеш,— высокі спрабаваў успомніць імя Будніка,— я кінуў гэта ўсё.

У праёме аркі намаляваліся постаці міліцыянера і дружыннікаў. Яны спыніліся насупраць аркі ў спробе разгледзець тых, што стаялі пад сцяной. Міліцыянер паблісквай кукардай, дружыннікі — агеньчыкамі цыгарэт.

— Пайшлі ў твой двор,— Буднік узяў пад локаць Касцюкевіча, скрануў яго з месца, і яны пайшлі ў двор.

У пад'ездзе было цёпла, але Касцюкевіч адчуваў, як яго калоціць, як далоні робяцца вільготнымі і халадзеюць.

— Слухай, а шпрыц адметны. Небяспечны прэзент. Сам ты жывы, а Клім...

— Змоўкні...— нечакана рэзка перапыніў Будніка Касцюкевіч.

— Я што, я маўчу. Буду маўчаць — толькі зараз трэба выпіць,— Буднік пачаў абмацваць і выв779рочваць кішэні спачатку джынсаў, потым курткі, потым залез запазуху.— Нулі. Нічога не маю, Косцік.

Высокі глядзеў у падлогу на цёмныя рагі вады і на свой няўклюдны цень.

— Ён казаў, што ты яго сябар. Казаў, што ты яго разумееш.

— Разумеў...

Яны ішлі пад дажджом. Маленькі Буднік спяшаўся і гаварыў на хаду. Прастуджаны голас даходзіў да Касцюкевіча як праз ваду. Высокі трымаў парасон над

сабой і крочыў па калюгах. Буднік амаль бег паперадзе, раз-пораз азіраўся і гаварыў: «Я казаў — піць лепш. Піць гэта надзейна, гэта справа. Шпрыц для хворых і інтэлігентаў. Ты малайчына, што кінуў, але тут, сам разумееш, нагода — сябра трэба памянуць. Ён апошнім часам знік з горада. Казалі, ён лячыўся. А я ведаю, дзе ён быў...»

Касцюкевіч не слухаў, ён механічна пераастаўляў ногі, ідучы па бліскучых калюгах. Ён успамінаў жанчыну ў цыратавым плашчы, холад зіхцення і вострыя кроплі, што ўпалі яму на твар...

— У яго была сяброўка. Яны разам кайфавалі. Дык яе пасадзілі, а ён знік — разумны быў. Казалі, яна яго навучыла, а я ведаю, што ён сам быў «спец». А ты яму прэзент, трэба было выкінуць.

— Што? — перапыніў Будніка Касцюкевіч.— Што я?

— Я разумею, ён і без тваёй дапамогі знайшоў бы. Я казаў, але я не аўтарытэт...

— Замаўчы,— папрасіў высокі.

— Здаровы быў. Два гады цягнуў. Не! Піць лепш. А ён у адказ: «...сам пі», а потым мы не гаварылі, я яго амаль не бачыў. Ён розную дрэнь даставаў і калоўся. А ты малайчына, паважаю. Я твой тэлефон забыўся, а двор памятаю, пад'езд нават ведаю. Спачатку думаў, мо ты з'ехаў, а потым сказалі — жывеш. Хутка прыйдзем.

Яны спыніліся ў цесным двары, загрувашчаным парожнімі скрынямі. У двары пахла мокрым дрэвам і цвіллю. Высокі дастаў грошы і даў Будніку.

— Ты свой. Старыя сябры не падвядуць,— ён паглядзеў на грошы.— Ты не хвалюйся, я хутка.

Высокі застаўся стаяць у незнаёмым двары ля дзвярэй, абабітых жалезам, асветленых слабой лямпачкай. На шэрым жалезе быў надпіс: «Выхад». Ён падняў га-

лаву і паглядзеў угару. На твар сыпаліся кроплі, неба было завешана халоднай смугой.

Касцюкевіч прачнуўся на бруднай заплямленай канапе. Ён знаходзіўся між цяжкім забыццём і явай. У ранішнім святле, што напаўняла пакой, цьмяна гарэла лямпачка, ад якой па столі плылі каляровыя хвалі. Піць! Ён цяжка падняўся і ледзь не ўпаў. Гарачыня рэзка змянілася холадам. Некаторы час ён сядзеў і глядзеў у падлогу. Ля яго ног, на выцертым дыване, ляжаў Буднік. Рукі з худымі кашчавымі пальцамі ненатуральна заломліваліся за галавой. Твар быў нерухомы, і на ім колка паблісквала рудая шчэць. Мокрая куртка ляжала побач. На стале стаялі бутэлькі, адна ляжала ля ног. Касцюкевіч адчуў, што яго пачынае круціць ад выгляду парожніх шклянак і непрыбраных недапалкаў.

Ён асцярожна падняўся і, трымаючыся за сцяну з зашмальцаванымі шпалерамі, пасунуўся на кухню...

Касцюкевіч сядзеў на канапе і сціскаў далонямі скроні, перад вачамі плылі яркія плямы...

— Буднік! Буднік?! — Касцюкевіч нахіліўся і пачаў трэсці цела аднакласніка.

— Ты свой. Я маўчу,— Буднік адкрыў і закрыў вочы.— Ён сам... Ты ні пры чым...

Касцюкевіч падклаў пад галаву Будніку куртку і патушыў святло...

На вуліцы яму зрабілася лягчэй. Той учарашні страх знік, яго змяніла пачуццё шкадавання да самога сябе. Парасон матляўся на руцэ, чалавек ішоў, абыходзячы калюгі.

Касцюкевіч прыпыніўся ля таксі з уключанымі падфарнікамі. Дворнікі працавалі, і праз холад шкла ён убачыў жанчыну, твар якой змываў дождж. У таксі апусцілася бакавое шкло.

— Вам куды? — з цікаўнасцю паглядзела на Касцюкевіча жанчына.

— Што?.. Не ведаю.

— Сядайце,— машына кранулася і паехала.

* * * Ранішні горад нагадваў той, ранейшы, па якім ён, Касцюкевіч, гуляў з Клімам. І восеньскі дождж быў тым жа, нязменным. Толькі кроплі барабанілі па цынкавых карнізах трывожна.

## Разрэз будынка

— Атрымліваецца, я быў па-за гульнёй? — удакладняе той, што сядзіць у крэсле каля акна.

— Быў, але цяпер табе выпадае выдатная магчымасць,— спыняецца насупраць другі.— Больш такой магчымасці не будзе.

Між субяседнікамі розніца ва ўзросце і пасадах. Малады сочыць, як нервуецца старэйшы, як ён ходзіць ад сцяны да сцяны. Малады адчувае сябе спакойна. Кожная фраза старэйшага падмацоўваецца жэстам.

— Ты ведаеш сітуацыю? — старэйшы на імгненне спыняецца і ўзмахвае рукой.

— Усё я разумею,— малады разглядвае профіль старэйшага.— А на каго згуляць мне? — сам да сябе звяртаецца ён.

— А ты не разумееш? — старэйшы дайшоў да сцяны, на якой вісяць планшэты і калькі з выявамі аб'екта.

— А ён? — кідае малады.

— А што нам ён. Трэба думаць пра сябе. Яму месца знойдуць,— узмах і паварот.

— І што — данос? — словы спыняюць старэйшага на сярэдзіне пакоя.

— Чаму данос? Мы ж інтэлігентныя людзі... Трэба пісаць праўду,— ён адштурхоўваецца ад апошняга слова і зноў рухаецца.

— Данос не выключае праўду,— канстатуе маладзейшы.

— Згодны, не выключае. Толькі ты лепш напішы тлумачальную ад аўтара праекта. Напішы, што загад-

чык аддзела перашкаджае выконваць сацыяльны заказ і гэтак далей. Раю пісаць у вялікі будынак,— старэйшы амаль надыктоўвае.

— Атрымліваецца, усё залежыць ад майго літаратурнага таленту? — з націскам на слове «ўсё» пытае малады.

— Слухай, я пачынаў з гэтага пакоя. Цяпер у мяне кабінет. Здаецца, не высока, паверхам вышэй, а ішоў я да яго доўга. Ты можаш зрабіць гэта хутка,— фраза ўклалася ў дзве ходкі ад сцяны да сцяны.

— Калі так, то ўсё будзе добра,— малады ўстае з крэсла.

— Гэта справа. Не зацягвай. Я адчуваў, што мы паразумеемся. Заўжды цябе абараняў і падтрымліваў,— у голасе старэйшага палёгка.

— Я гэта ведаў,— малады адкрывае акно. За яго спінай зачыняюцца дзверы. Скразняк хістае калькі. Выявы будынка ажываюць.

* * *

— Калі не супраць, я да цябе буду на «ты», тым больш узрост мне дазваляе,— загадчык аддзела ўладкоўваецца ў глыбокае крэсла на бліскучым стрыжні.

— Калі ласка,— гаспадар пакоя садзіцца да стала.

— Даўно збіраюся пагаварыць з табой, але ўсё клопаты, мітусня, абавязкі службовыя, а трэба, мусіць, прасцей, па-чалавечы. Ты згодны? — загадчык прагаворвае кожнае слова.

— Я слухаю,— запэўнівае малады.

— Справа вось у чым,— загадчык аглядае пакой, спыняецца на планшэце з разрэзам будынка, позіркам праходзіць па калідорах і лесвічных маршах і спыняецца на прозвішчы аўтара ў правым ніжнім рагу план-

шэта.— Я лічу, што прыйшоў час заняць табе іншы кабінет,— загадчык вымаўляе словы няспешна, надае кожнаму вагу і мацуе іх, як цагліны ў сцяну.

Малады ў думках робіць разрэз будынка. Уяўная плоскасць рассякае паверхі: першы, дзе знаходзіцца яго пакой, і другі — з кабінетамі намесніка і загадчыка.

— Пасаду і кабінет майго намесніка. Паверхам вышэй.

— Мне? — здзіўленне атрымліваецца натуральным.— Але ж у вас ёсць намеснік...

— Так,— перапыняе загадчык.— Пакуль ён мяне задавальняў. Але цяпер іншы час і патрабаванні іншыя. Адбыліся некаторыя істотныя змены, там... Ён больш не можа тут працаваць,— загадчык тлумачыць, спрабуючы звязаць словы інтанацыяй.

— Даруйце, а што адбылося? — у голасе поўная недасведчанасць.

— У двух словах. На абмеркаванні твайго праекта ён пайшоў супраць нас. Разумееш?

— Не зусім.

— Я за твой праект. А ён павярнуў так, што нібыта я супраць, быццам, я рэтраград і, забыўся слова, нічога не разумею. Ён быў не адзін. Але не ўсё так блага — з намі большасць. Яны падтрымалі,— разгубленасць знікла. Загадчык пачаў злавацца.

— А чаму не запрасілі мяне! — абураецца малады.

— Гэта ён... Але не хвалюйся, трэба думаць наперад,— загадчык паварочваецца ў крэсле.— Ён мяркуе заняць маё месца. Спадзяецца, што ў яго хопіць на гэта моцы!

— Закруцілі,— канстатуе малады і ківае на крэсла пад загадчыкам.— Але пры чым тут я?

— Цяпер усё круціцца вакол твайго праекта. Мне, скажу шчыра, падабаецца,— крэсла сапраўды заклін-

ла, і загадчык сядзіць патыліцай да маладога і гаворыць у сцяну.— Але ён усё нам сапсуе.

— Ён жа пакуль намеснік,— супакойвае малады.

— Каб закрыць твой праект, прычыны знайсці не цяжка. Калі ён будзе загадчыкам — знойдзе.

— Няўжо ўсё так сур'ёзна? — у голасе маладога недавер.

Загадчык паварочваецца разам з крэслам.

— Таму я і зайшоў. Лепшай кандыдатуры мне не знайсці. У іх да цябе прэтэнзій не будзе,— кароткае «іх» прагучала цяжка і шматзначна.

— А праект за мной? — як пра вырашанае, пытае малады.

— Што праект? — не разумее загадчык.— Якія праблемы. Хочаш займацца, калі ласка. Я падпішу загад, і вядзі далей,— спакайнее загадчык.

— І што я магу зрабіць?

— Ты напішы на маё імя пра тое, як ён замінае табе выконваць сацыяльна значны заказ.

— Данос.

— Як лёгка вы, маладыя, кідаецеся такімі словамі. Мы павінны быць інтэлігентамі. Мяне аж скаланула,— на твары загадчыка задавальненне.

— Тады тлумачальная,— удакладняе малады.

— Тлумачальная, тлумачальная. Толькі пісаць трэба праўду.

— Толькі праўду,— запэўнівае малады.— Калі мой лёс залежыць ад мяне, усё будзе зроблена.

— Я ведаў, што ты разумны. А што да ўзросту — на такіх цяпер арыентацыя.

— Безумоўна.

— Пішы і прынось. Чакаю,— у голасе ўпэўненасць.

Малады зачыняе акно. Загадчык выходзіць. Гаспадар пакоя вяртаецца да стала і глядзіць на нерухомыя выявы аб'екта.

* * * — Дык цяпер ты не працуеш? — працягвае ён дыялог з госцем.— Беспрацоўны,— удакладняе без асаблівай цікавасці.

— Надакучыла праектаваць санвузлы і дэкаратыўныя краты ў вестыбюлях,— госць разглядае планшэты.

— Ты хацеў праектаваць гарады і палацы.

— Неабавязкова. Працаваць. Узяць аб'ект і зрабіць поўнасцю,— на імгненне госць адводзіць вочы ад пячатак на планшэтах.

— І што, не бяруць?

— Надакучыла ўсё. Два месяцы шукаю. Усе абяцаюць, абяцаюць.

— Прафесія. Самі выбіралі,— гаспадар пакоя дастае са стала некалькі аркушаў паперы.

— Ведаю, што да вас не ўбіцца, але, можа, параіш што.

— Падабаецца? — іх позіркі сустракаюцца.

— Падабаецца,— госць зноў паварочваецца да планшэтаў.

— Слухай, а ты змог бы давесці гэты праект.

— Жартуеш?

— Не! — гаспадар пакоя рэзка ўстае з-за стала,— я сур'ёзна.

— Наколькі я разумею цябе...

— Прабач, вас,— перапыняе ён госця.— Ты чакаў два месяцы, пачакай два тыдні і будзеш працаваць у гэтым пакоі за маім сталом.

— На тваім месцы? — у голасе недавер.— Ты звальняешся?

— Наадварот. Бяру цябе на працу.

— Я магу спадзявацца? Гэта дакладна?

— Гарантую. А цяпер бывай, мне трэба напісаць адну паперу. Бывай.

# Зялёны мур

Раз! І пудовая скрыня вайсковага колеру на плячы. Два! Паварот і дваццаць крокаў праз усё цокальнае памяшканне да супрацьлеглай сцяны. Тры! Скрыня з трафарэтным нумарам кладзецца на шэраг такіх жа скрынь, як цагліна ў мур.

Салдат паварочваецца і няспешна, каб паспець крыху адпачыць, крочыць паўз складскія стэлажы і паліцы, паўз стол, за якім сядзіць прапаршчык. Салдат паспявае разгледзець вастраносы профіль з рэдкімі растапыранымі вусікамі, маленькія цёмныя жалудовыя вочкі, патыліцу з акуратнай паскай — адмецінай ад фуражкі і спіну ў адпрасаваным кіцелі.

Прапаршчык па-дзіцячы высалапіў кончык языка і старанна пераносіць нумары са школьнага пакамечанага сшытка ў тоўстую канцылярскую кнігу. Ён мачае вучнёўскую ручку ў бутэлечку з тушшу і выводзіць некалькі лічбаў і літар. Пасля колькі часу ацэньвае, ці роўна і прыгожа атрымалася, і пачынае чысціць пёрка, на якім паспявае засохнуць туш. Уздыхае, перасоўвае па аркушы сшытка пластыкавую лінейку і занатоўвае дробненькім почыркам наступны нумар. Салдат цягае скрыні...

— Трэба паспець да «трубы», засталося дзве гадзіны,— прапаршчык адсоўвае кнігу на сярэдзіну вялікага стала, пацягваецца, размінае тоўстыя пальцы, паварочваецца і прасочвае шлях салдата ад сцяны да сцяны.

— Цішэй кладзі, не цэглу цягаеш, а матэрыяльныя каштоўнасці, за якія я нясу поўную матэрыяльную адказнасць.

Прапаршчык уключае вентылятар і вызваляе шыю ад зялёнага гальштука.

— Так, таварыш прапаршчык, поўную адказнасць за каштоўнасці... Цікава, а што ў гэтых скрынях? Відаць, жалеза, бо вельмі цяжкія,— кажа салдат і выцірае рукавом лоб.

— Вам гэта ведаць неабавязкова,— з пэўнай перавагай у голасе кажа прапаршчык.— Скрыні нумарныя, вайсковыя — колькасцю... Трэба будзе пералічыць, а то крый бог!

Прапаршчык і салдат глядзяць на акуратны мур зялёных скрынь.

— А каб не адказнасць і дысцыпліна?.. Усё развалілася б... Толькі ў войску і ёсць яшчэ нейкі парадак, ці не так?

Салдат стомлена разглядае пыльныя вокны, забраныя сеткай-«рабіцай», і пытанне застаецца без адказу. Там, за шэрым шклом, пляц. Там аднастайна падымаюцца і апускаюцца сотні наваксаваных ботаў, чуюцца каманды, гучыць песня, грукоча барабан.

Шыхт на імгненне застывае, і здаецца, што салдаты скамянелі. Толькі барабан працягвае грукатаць дробна і надакучліва.

Акно нагадвае вялізны фотаздымак з буйным растрам. Фотаздымак з газеты: шэры, няякасны, але праз гэта выразны сваёй дакументальнасцю. Батальён паварочваецца — новы здымак, яшчэ паварот — здымак. Дзесяць крокаў наперад — фотаздымак, на якім можна разгледзець твары — такія ў газетах не друкуюць. Загад — і батальён знікае. Застаецца шэрая архітэктура з яркімі плямамі плакатаў, на якіх салдаты ў летняй вопратцы з трафарэтна-вясёлымі тварамі выконваюць практыкаванні, застаецца снег, які павольна падае на раскрэслены бетон.

Салдат разумее, што ў акно можна і не дзівіцца, бо ўсё, што адбываецца на вуліцы, лёгка ўявіць па гу-

ках, якія трапляюць праз тоўстыя шкліны ў склад. Ён разумее, што праца на складзе не горшы варыянт на сённяшні дзень. Там — на пляцы: холад і снег, барабан і загады, тая ж надакучлівая, механічная праца. Салдату горача, ён расшпільвае пагнутыя гузікі бруднай «падменкі», выцірае далоні, хукае на іх і бярэ наступную скрыню. Адчувальна пачынаюць балець плечы і ногі.

На пляцы гучыць труба. Салдат ведае, што там з'явіўся аркестр: зіхціць начышчаная медзь інструментаў, музыкі пастукваюць пачырванелымі пальцамі па клапанах, хаваюць рукі ў кішэні, ціха клянуць надвор'е, хаваюцца ад ветру адзін за аднаго і сочаць за дырыжорам, які выструніўся перад аркестрам...

Брыгада ўжо з тыдзень рыхтуецца да праверкі. Усё фарбуецца, чысціцца, хаваецца, прыбіраецца, падшываецца і прасуецца.

У памяшканні склада сохнуць тры сцяны, пафарбаваныя ў арэхавы колер. Чацвёртую належыць пафарбаваць сёння пасля абеду. Салдат пераносіць скрыні, якія стаяць усутыч да сцяны і закрываюць яе да столі.

— Міша! Міша! Міша!—кліча прапаршчык і шкрабе пазногцем рабрысты зялёны радыятар.— Ну, дзе ж ты, маленькі, падзеўся? Міша! Міша! Хадзі сюды.

Прапаршчык некалькі мінут шкрабе радыятар, але потым паварочваецца, узмахам рукі загадвае салдату спыніцца і прыкладае да вуснаў палец:

— Тссс!.. Міша, Міша! Хадзі да свайго начальніка.

Салдат стаіць са скрыняй на плячы. Востры кант нясцерпна муляе плячо, салдат не вытрымлівае і паціху рушыць да арэхавай сцяны, амаль цалкам закрытай цаглінамі скрынь.

— Відаць, чужога пачуў — вось і баіцца. Разумнае стварэнне,— ласкава кажа прапаршчык і сочыць за адтулінаю ў сцяне, дзе хаваецца труба радыятара.— Міша?

З адтуліны паказваецца вострая мышыная мордачка з растапыранымі вусамі. Мыш кропелькамі чорных вачэй аглядае памяшканне і, калі пераконваецца, што ёй нішто не пагражае, шэрым камячком падкочваецца да прапаршчыкавых рук, хапае кавалак сухара і імкліва знікае ў адтуліне.

— Разумны ты мой! — задаволена, з палёгкай уздыхае прапаршчык.— Бачыў? Вось што робяць добрыя адносіны і трэніроўка. З рукі харчуецца. Жывёлы — яны душой адрозніваюць добрых людзей...

Салдат ківае і прывальваецца да стэлажа з цынкавымі скрынямі. Яму хочацца есці і спаць. Да абеду яшчэ гадзіна, а да адбою — восем. Можна палічыць, колькі ён перанёс скрынь, колькі падняў, колькі прайшоў, але нясцерпна ные плячо і ногі. Ён даўно зразумеў марнасць падлікаў, заганнасць і бессэнсоўнасць статыстыкі...

Хочацца нерухома ляжаць з закрытымі вачамі. Хочацца цішыні і спакою. Хочацца ні пра што не думаць, а толькі адчуваць, як гарачымі хвалямі бяжыць па жылах кроў і адыходзіць цяжкая і вязкая стома. Адыходзіць і забываецца...

— А мы не можам выхаваць некалькі ідыётаў. Адукацыю вам далі, школы ды інстытуты, а вы служыць не жадаеце... Разбэсцілі вас там. А тут перавыхоўваць трэба,— упэўнена кажа начальнік склада і перагортвае старонку канцылярскай кнігі.— Праца і дысцыпліна — вось ваш абавязак. Але гайкі заціснуць. Заціснуць, і тады запішчыце, як тыя мышы.

— А мы і працуем, таварыш прапаршчык,— стомлена адказвае салдат.

— Хто? Вось ты цяпер стаіш і спрачаешся, а праца, загад начальніка стаіць.

— Зразумеў! — салдат паварочваецца і цяжка ідзе да сцяны.

— Раз! — камандуе салдат і ўскідвае скрыню на

плячо. Цяпер дваццаць крокаў да спрэс застаўленай сцяны і можна сказаць — тры!

Скрыні, складзеныя зялёнымі прыступкамі, нагадваюць салдату каменны мур. Параўнанне яму падабаецца, і ён працуе хутчэй.

Грыміць барабан, спяваюць трубы, звонка ляскаюць літаўры. Пад удар вялікага барабана «левай», гэта атрымліваецца механічна, звыкла, і салдат не заўважае, як трапляе ў рытм марша.

Прапаршчыкавы ногі ў карычневых бліскучых паўбацінках пад сталом адбіваюць такт. Яго шчокі надзьмуліся, рэдкія вусы рухаюцца, ён дыхае пад музыку. Салдату здаецца, што і пёрка адбівае крок дробнымі літарамі на белым аркушы.

— Войска без музыкі не можа існаваць. Што за парад без аркестра. Трам-там-там! Там-та-та-та-там!.. Самая лепшая музыка вайсковая. Труба як выводзіць,— прапаршчык адкладае ручку і з прасвятлелым тварам слухае марш.

— Армстронг не быў у войску, а трубач вядомы на ўвесь свет,— кажа салдат і бярэ скрыню.

— Хто?

— Луі Армстронг, таварыш прапаршчык.

— Я дванаццаць гадоў у аркестры служыў, на парадах двойчы хадзіў.

— Яго ўсе ведаюць, таварыш прапаршчык,— кідае салдат, калі праходзіць каля стала.

— Ты хочаш сказаць, што я неадукаваны, што я не прафесіянал? — твар прапаршчыка бярэцца чырвонымі плямамі.

— Я проста...

— Ты лічыш, што калі вучыўся ў інстытуце, то разумны і маеш права перапыняць начальніка?.. Адказвайце, таварыш салдат!

— Нічога я не думаю...

— Ды мяне, калі я ў адпачынку, заўжды ў аркестр

запрашаюць, просяць прыйсці сыграць на канцэрце ў ДК ці на пахаванні...

— Я не хацеў вас пакрыў...

— Інстытуты яны скончылі, а за чые грошы. Я, можа, у гэты час... Я з пятнаццаці год у войску. Я загад выконваў, а ты папракаць мяне!.. Выконвайце загад!

Салдат цягае скрыні. Адкрываецца шэрая аблушчаная сцяна. Плямы солі выступілі на лушпінні фарбы, якая ад дотыку цярушыцца і агаляе шурпаты бетон.

Прапаршчык не зважае на шыльды «Не паліць», якія ўпрыгожваюць склад, нервова паліць і спрабуе супакоіцца.

Аркестр змоўк. Чуецца толькі тупат, глухія ўдары аб пліты. Раз-два! Раз-два! Аднастайна і цяжка ідзе батальён.

— ...нам загадвалі — мы выконвалі. І з усмешкай, радасна, хутка. Не ведаюць, што ёсць сапраўдная служба: два гады. Пяць, дзесяць — вось тады б ведалі, што да чаго.

Апошнія скрыні салдат ледзь носіць. Яны здаюцца ўдвая цяжэйшымі. Пальцы баляць і не згінаюцца...

На пляцы гучыць труба. Салдат прываліўся да стэлажа і глядзіць у акно. Падаюць сняжынкі. Ён мокры ад поту. На спіне і пад пахамі цёмныя рагі з белай аблямоўкаю солі. Дыханне цяжкае, у роце прысмак жалеза.

Па пляцы ідуць на абед роты. Салдат чакае загаду.

Прапаршчык адчыняе стол, дастае сухар, разломлівае і пачынае клікаць мыш.

— Міша! Мішутка! Хадзі да свайго начальніка. Маленькі мой, хадзі да мяне,— ласкава і супакоена вуркоча прапаршчык, шкрабе радыятар і не адводзіць позірк ад адтуліны.— Абедаць ужо час. Мішутка, хадзі сюды!

Мыш хапае кавалак сухара і знікае пад радыятарам.

— Ну вось, паабедай, маленькі...— супакоена кажа прапаршчык і вытрасае крошкі з далоні.

Пасля таго як прыбіраюцца сшыткі і ўключаецца вентылятар, на стале з'яўляюцца вялікі стракаты тэрмас і цыратавая торбачка з бутэрбродамі. Салдат глытае сліну і адварочваецца да сцяны. Ён чуе, як прапаршчык адкаркоўвае стракаты тэрмас, чуе, як шамаціць папера. Водар гарбаты змешваецца з пахам свежага агурка, вентылятар разганяе пахі па памяшканні склада, і салдат уяўляе, як ходзяць прапаршчыкавы сківіцы і растапырваюцца рэдкія хіжыя вусікі. Салдат адводзіць вочы ад аблушчанай сцяны...

Час абеду здаецца неверагодна кароткім. Ад цяжкай стомы салдат не заўважыў смаку і еў механічна і хутка, так, як і ўсе вакол яго за доўгім сталом.

У падсобным памяшканні сталоўкі, дзе грувасцяцца вялікія катлы, каструлі, вайсковыя тэрмасы, нясцерпна тхне хлёркай. На маленькім зэдліку пад пірамідай посуду дрэмле ў брудным сінім халаце і галёшах бачкамый па мянушцы «Страўнік». Калі ён чуе грукат каструлі, якая знарок пастаўлена пад дзверы, імгненна падхопліваецца і робіць выгляд, што імпэтна шаруе вялікую, добра ўкарэлую патэльню.

Спалоханасць знікае імгненна, як толькі ён пазнае земляка.

Салдаты выпальваюць па цыгарэце, Страўнік частуе рафінадам, расказвае хатнія навіны, дае яшчэ адну цыгарэту, і яны развітваюцца.

Пасля абеду салдат вяртаецца ў склад, пераапранаецца ў прапахлую потам «падменку» і пачынае жалезным скрабком абдзіраць фарбу. Хутка яго твар і рукі робяцца шэрымі. Фарба змятаецца і выносіцца на

сметнік. Сцяна, як пярэстая мапа, з акіянамі і выспамі, з гарамі і азёрамі, з рэкамі і гарадамі. Салдат з цікаўнасцю і задавальненнем вывучае абрысы і выявы невядомых краін.

Прапаршчык некуды тэлефануе. Яго голас мяняецца: то на пагрозлівы і афіцыйны, то робіцца тонкім і ломкім, зрываецца на шэпт, то раз'юшана патрабуе.

Прапаршчык пераконвае нябачнага начальніка, што генерал абавязкова зойдзе да яго на склад і што сцяну трэба неадкладна фарбаваць...

Дыялогі па тэлефоне цягнуцца з паўгадзіны. Прапаршчык то падхопліваецца з крэсла і выструніваецца, то выгінаецца і ківае, то асядае і просіць, то кідае слухаўку і некалькі секунд лаецца...

Салдат сядзіць на скрыні і чакае фарбу. Ён раз-пораз пазірае на начальніка склада і на адтуліну пад радыятарам, дзе хаваецца мыш.

Фарбы арэхавага колеру няма. Прапаршчык зачыняе склад і раззлаваны бяжыць праз пляц да штаба.

Салдат няспешна выцягвае ■ кішэні загорнутую ў кавалак цыраты атруту для пацукоў, з другой кішэні кавалак смажанага мяса, выкочвае яго ў буры парашок і дубцом ■ веніка запіхвае глыбока ў адтуліну пад радыятарам.

На пляцы гучыць урачысты марш. Роты з песняй праходзяць і спыняюцца насупраць акна, зацягнутага сеткай-«рабіцай»...

Калі вяртаецца начальнік склада, салдат скрабе сцяну.

— Так?! — на твары прапаршчыка разгубленасць.

Салдат выструніваецца і чакае загаду.

— Так! Фарбы арэхавага колеру няма. Ёсць шэрая, але яна непрыгожая... Так? А генерал можа зайсці, і тады... Так! Усе скрыні трэба перанесці назад. Скрыні трэба паставіць як мага шчыльней, каб яны цалкам закрылі сцяну. Выконвайце, таварыш салдат! — прапар-

шчык задаволены сваёй вынаходлівасцю, паварочваецца да стала і здымае фуражку.— Ідыёты! — кажа сам сабе і адкрывае сшытак.

— Ёсць! — гучыць адказ салдата.

— Раз! — і пудовая скрыня на плячы.— Два! — і дваццаць крокаў да сцяны...

Зялёны мур руйнуецца.

— Міша! Міша! Хадзі сюды, мой маленькі. Хадзі да свайго начальніка...

Салдат складае мур з зялёных цаглін і не ведае, што праз тыдзень атручаная мыш будзе страшэнна смярдзець. Прапаршчык будзе доўга прынюхвацца, нарэшце здагадаецца і загнутым дротам выкалупае яе труп. Разам з мышынай ён выцягне і кавалак засохлага мяса...

Салдат не ведае, што прапаршчык аблае яго, што салдат яму адкажа, а прапаршчык зробіць яму пяць сутак «губы».

Прапаршчык і салдат не ведаюць, што на той час сапраўды прыедзе генерал і дзеля гэтай урачыстай падзеі ўсім жыхарам «губы» будзе амністыя, так што салдат адседзіць толькі суткі.

Салдат не ведае, што праз тры гады пасля войска ён сустрэне прапаршчыка ў перапоўненай прыгараднай электрычцы. Прапаршчык будзе апрануты ў цывільнае, але салдат пазнае яго па рэдкіх вусіках, акуратнай пасцы ад фуражкі і па карычневых вайсковых паўбацінках...

Яны павітаюцца за руку. Маленькія вочкі прапаршчыка пачнуць бегаць, ён будзе намагацца ўспомніць імя салдата, але пасля двух-трох пытанняў пра службу і таропкіх адказаў сыдзе.

Салдат прыхінаецца да разбуранага мура і цяжка перарывіста дыхае.

Прапаршчык уключае вентылятар, дастае са стала тэрмас і пачынае палуднаваць.

Салдат смокча кавалак рафінаду і з удзячнасцю думае пра бруднага бачкамыя, які ходзіць у галёшах і сінім заплямленым халаце. Цукар збівае апетыт, і салдат бярэ наступную цагліну-скрыню.

На пляцы грыміць барабан. Спяваюць начышчаныя трубы. Шалёстка ляскаюць літаўры.

Пад удар вялікага барабана «левай» — гэта атрымліваецца незаўважна і механічна. Салдат нясе скрыню. Ён выконвае загад.

Раз! Два!

Раз! Два!

— Міша, Міша, хадзі да мяне. Я цябе пачастую. Палуднаваць час,— прапаршчык шкрабе пазногцем па радыятары.— Хадзі да свайго начальніка!..

Салдат смокча апошні кавалак цукру і цягне скрыню. Ён успомніў імя чалавека, які ўсё жыццё вымушаны закочваць на высокую гару вялікі камень...

Раз! І пудовая скрыня на плячы.

Два! Паварот і дваццаць крокаў.

Але за што Сізіф быў пакараны і чым прагнявіў бога, застаецца па-за свядомасцю, і салдат, як ні намагаецца, успомніць не можа...

За акном ідзе снег. Аркестр грае стомлена і без ранейшага імпэту. Толькі вялікі барабан грукоча ўпэўнена і надзейна.

## Хімічны аловак

Праваруч ад пад'езда майго чатырохпавярховага дома стаяла замураваная чыгуннымі лапамі ў тоўшчу асфальту, блакітная лава. Як і аблезла-ружовыя сцены дома, лава была спрэс у размаітых татуіроўках надпісаў. На ёй звычайна і сядзеў, з цыгарэтай, заціснутай у жоўта-карычневых зубах, жыхар першага паверха — сталяр Юзік, па мянушцы Куцапалы. Калі папраўдзе, то мянушкай хрысцілі толькі за вочы, бо Юзік, хоць і быў мужчына невялікі, але крыўды не дараваў нікому. Звычайна Юзікаў твар меў выраз рашучасці і глыбокай пакрыўджанасці. Блізка пасаджаныя да тонкага носа, вочы слязіліся, вусны крывіліся ў зменлівай змяістай усмешцы, сівыя, каротка пастрыжаныя валасы былі ўскудлачаныя, і глядзеў Юзік на ўсіх падазрона і здзекліва. З-за вуха тырчаў кавалак хімічнага алоўка, пляскатая кепка ляжала на каленях, а рукі Юзік хаваў у кішэнях ці за спіною.

Усе дзеці з нашага дома абыходзілі блакітную лаву, занятую Юзікам. Здаралася, што нехта забываўся і шыбаваў да пад'езда паўз лаву. Сталяр спрытна падхопліваўся, лавіў малога, рабіў жорсткі твар і крычаў: «А, папаўся, падшыванец! Зараз я пакажу табе «чучу», больш не будзеш газеты ў скрынях паліць і мачыцца ў пад'ездзе! Мігам грабеньчыкам струк адпілую!»

Дзіцёнак, раптоўна схоплены, пачынаў енчыць і крычаць ратунку, а Юзік тым часам выцягваў з кішэні металічны грабеньчык і імкнуўся расшпіліць ці сцягнуць маломе порткі. Віцька Сушок аднойчы так спало-

хаўся, што напусціў у порткі і пачаў заікацца. Нават расказвалі, што маці вадзіла Віцьку да старой Машнісі, каб тая зашаптала яго. Пасля гэтага здарэння Сушок і блізка баяўся падысці да блакітнае лавы, а бегаў напрасткі, праз кветнік.

Колькі дарослыя ні сварыліся на Юзіка, колькі ні палохалі міліцыяй — ён выхоўваў нас праверанымі сродкамі. А дарослым звычайна казаў: «Ты пакрычы, пакрычы — можа, хутчэй памрэш! А я табе дамавіну зраблю, хоць капейчына якая будзе. Ведай, я— апошняя інстанцыя!» Слова «інстанцыя» падабалася стаяру невераго́дна. Дарослыя, сапраўды, з Куцапалым сварыліся неахвотна. Гэта і зразумела, хто ж хоча пачуць пра ўласную смерць. А дамавіны Юзік рабіў адмысловыя, да яго з просьбамі нават з Гомеля прыязджалі. Калі быў пільны заказ — Юзіка на блакітнай лаве не было, і яе займалі мы.

У тым, што Куцапалы мог адпілаваць грабеньчыкам пісюн, мы не сумняваліся, бо яго сын Ладак не аднойчы паказваў спіну і лыткі спрэс у чырвона-сініх шнарах і драпінах.

— Гэта Юзік пазаўчора здаў заказ, выпіў, а потым пачаў нас выхоўваць нажоўкай.— Хваліўся Ладак і апускаў кашулю.

— А за што ён цябе так? — цікавіліся мы, адчуваючы павагу да хлопца.

— Настаўніца напісала ў дзённік, а я не паспеў лісты выдраць, вось Юзік і прачытаў.— Ладак заўжды называў бацьку Юзікам.

З Ладакам я вучыўся ў адным класе. У школу ён хадзіў неахвотна і часта прагульваў заняткі. І колькі Юзік ні лупцаваў хлопца, усё было марна, адно дзённік рабіўся танчэйшым і нарэшце губляўся назаўсёды. Памятаю, што пасля таго як настаўніца геаметрыі ўбачыла Ладакаву спіну, яна больш ніколі не прасіла дзённік, каб паставіць адзнаку ці напісаць заўвагу.

Кватэра Ладакавых бацькоў была дзіўная, бо адначасова нагадвала майстэрню, склад і музей. Мэбля, якой было не шмат, хоць і была самаробная, але глядзелася. Памятаю вялізную цёмна-карычневую шафу, чорную канапу з круглымі скуранымі валікамі, агромністы стол на тонкіх гнутых ножках і некалькі цяжкіх дубовых крэслаў з высокімі спінкамі. Яшчэ, што мяне заўсёды бянтэжыла, у перадпакоі стаяла века да недаробленай дамавіны, у якой на цвіках вісела Юзікава ватоўка і дэрмацінавы фартух. Пахла ў кватэры сталярным клеем, шкіпінарам і сухімі дошкамі.

Аднаго разу, калі Ладак не прыйшоў на заняткі, класная адправіла мяне даведацца, што з хлопцам... Я пагрукаў у дзверы, а потым увайшоў у кватэру. За дзвярыма пакоя, куды я зазірнуў, з сякерай у руцэ стаяў Юзік. Ён стаяў басанож, у ватоўцы на голае цела, твар быў цёмны, рашучы і злосны. Я спалохаўся і не ведаў што сказаць.

— Чаго табе? — прасіпеў мужчына.

— Мне трэба Лада,— ледзь вымавіў я.

— Заб'ю байструка! — закрычаў Юзік і секануў па стале.

Я выскачыў на вуліцу перапалоханы, ледзь жывы... У двары перастрэў Ладака, які дахаты і не збіраўся. Хлопец растлумачыў, што Юзік «сеў на каня», і яны вымушаны начаваць у сваякоў. Юзіку не заплацілі за чырвоную труну, вось ён і пачаў вар'яцець, п'е і дахаты нікога не пускае...

Калі памерла старая Машніха — Юзік хутка зрабіў ёй дамавіну і сказаў, што грошы браць не будзе, бо старая хоць і сварылася з ім, але была беднай удавой, а бедных трэба шкадаваць. Гэткая Юзікава міласэрнасць усіх здзівіла і насцярожыла. Я не памыліўся — насцярожыла, бо на саракавінах, куды Юзік прыйшоў на падпітку, ён учыніў сварку са сваякамі і суседзямі нябожчыцы. Куцапалы пачаў патрабаваць грошы за

выдатна зробленую дамавіну. Яго саромілі, пераконвалі, але дарэмна — Юзік стаяў на сваім. Грошы аддалі, бо спалохаліся. Юзік крычаў на ўвесь пад'езд, што мо звяртацца ні ў якія інстанцыі не будзе, пойдзе на могілкі, выкапае Машніху і забярэ труну, бо труна — «дошчачка да дошчачкі», як сабе зробленая — міністэрская, а не абы-што...

Калі Юзік бываў цвярозым, а гэта здаралася досыць рэдка, ён любіў разважаць пра палітыку, успамінаць вайну, расказваць пра генералаў. Ён у тварах паказваў, як яго ўзнагароджвалі, як арыштоўвалі, як везлі на Поўнач. Юзік хваліўся тым, колькі ён з'еў на Поўначы чырвонай рыбы, ікры і сабачыны... У такія моманты мы зайздросцілі Ладаку, які бег дадому, выцягваў з шафы бацькаў святочны летнік з трыма бліскучымі медалямі. Юзік падхопліваўся з лавы, накідваў летнік, прыкладаў правую руку са знявечанымі карацелькамі пальцаў да скроні і рапартаваў свайму сыну, як генералу. Мы смяяліся.

А яшчэ Юзік распавядаў, адкуль бяруцца дзеці, як яны робяцца, і першым паведамляў, у каго з нас па хуткім часе будзе брат ці сястра, і нават казаў, колькі засталося чакаць. Мы чырванелі, не давалі веры ягоным ціхім словам...

Першы раз Ладака пасадзілі за тое, што ён разам з Віцькам Сушком укралі, а потым разбілі матацыкл. Юзік, пасля суда, на які ён хадзіў у летніку з медалямі, піў штодня два месяцы.

Ладака пусцілі на пахаванне маці — маленькай ціхай жанчыны, якая памерла на аперацыйным стале. Казалі, што не ад рака, а ад атручвання ацэтонам. Нябожчыца працавала тынкоўшчыцай і ўсё жыццё падзарабляла рамонтам прыватных кватэр, бо акрамя Ладака, які сядзеў у калоніі, трэба было дагледаць Насту і Алесіка.

Пахаванне запомнілася добра. На памінках Ладак

да крыві збіў Юзіка і сваю родную сястру Насту. За Юзіка з Настай ніхто не заступіўся — усе ведалі, як Юзік лупцаваў нябожчыцу-жонку... А Наста пачала гуляць з сёмага класа і пасля памінак прыхапіла пляшку гарэлкі і мусіла сысці на ўсю ноч.

Ладака забралі. Наста з памінак трапіла ў бальніцу з паламанай рабрынай, а пасля, не заходзячы дадому, у венерычны дыспансер, бо высветлілася, што пятнаццацігадовая дзяўчына хворая на пранцы. Юзік паабяцаў, што дачку, як толькі выпішуць, — заб'е, бо такой ганьбы ён — паважаны чалавек — трываць не будзе.

Наста як ведала, што яе чакае, і дадому не вярнулася. Яна з'ехала на Поўнач, дзе праз два гады выйшла замуж за геолага, а потым за нафтавіка. На святы Юзік атрымліваў паштоўкі ■ Сургута і пасылкі з чырвонай рыбай і кедравымі гарэхамі. Паштоўкі Юзік ірваў на дробныя кавалкі, а гарэхамі, калі быў цвярозы, частаваў дзяцей.

Пасля сёмага класа хударлявы і ціхі Алесік з'ехаў да сястры ў Сургут. Алесік з'ехаў, але праз колькі месяцаў вярнуўся Ладак, у сіняй павуціне татуіровак, ■ бліскучымі фіксамі і самотным позіркам арэхавых вачэй.

Юзік змяніўся, кінуў піць, нават казалі, што Куцапалы «падшыўся» і з раніцы да вечара майстраваў мэблю ў сваёй недагледжанай кватэры.

Праз паўгода Ладака, які жыў з бацькам і вечарамі дапамагаў старому збіраць мэблю, арыштавалі. За згвалтаванне мажной касіркі з хлебнай крамы яму далі шэсць гадоў. Не ведаю, як там было, але ўсе былі за Ладака і супраць касіркі. Казалі, што яна вельмі хацела замуж, а калі Ладак адмовіў — падала на яго заяву.

Юзік пісаў скаргі ў розныя інстанцыі, ездзіў у вобласць, званіў па міжгораду, некаму даваў хабар, але ўсе намаганні былі дарэмныя.

Цяжарная касірка з'ехала.

Ні Наста, ні Алесь да Юзіка не вярталіся, хоць ён і даслаў ім ліст, у якім прасіў прабачэння і скардзіўся на здароўе.

Дзеці прыехалі на тэлеграму, якую адправілі суседзі, прыехалі са спазненнем...

Суседка аддала ключы і расказала, што Юзік у апошнія дні не выходзіў з кватэры і нікога не пускаў да сябе. Суседка чула, як грукаў малаток, як смярдзеў сталярны клей, ацэтон і лак.

Юзік пакінуў запіску. На аркушы з вучнёўскага сшытка дзе-нідзе расплываліся словы, напісаныя хімічным алоўкам. Юзік пракляў сваё жыццё, папрасіў прабачэння перад Ладакам і суседзямі, а потым задавіўся ў прыбіральні.

Хавалі Юзіка ў выдатна зробленай дамавіне арэхавага колеру, над якой ён і шчыраваў у апошнія дні.

Памятаю пачарнелы дробны твар, расчэсаныя на роўны прабор сівыя валасы, тонкую свечку ў знявечаной руцэ і медалі на цёмным летніку. Было некалькі вянкоў ад суседзяў, былі танныя кветкі. Стаяла страшэнная спёка і таму пахавалі хутка.

На саракавіны Наста з Алесем вынеслі на вуліцу вялікі стол, той — пасечаны Юзікам, накрылі яго і налівалі ўсім, хто праходзіў паўз блакітную лаву да пад'езда.

## Змест


На вуліцы . . . . . . . . . . . . . 3
Гадзіннік за сцяной . . . . . . . . . 8
Браты . . . . . . . . . . . . . . 18
Шлягер . . . . . . . . . . . . . 25
Колер хакі . . . . . . . . . . . . 29
«Я — Віця» . . . . . . . . . . . . 38
Шэры матылёк . . . . . . . . . . . 43
У чаканні цягніка . . . . . . . . . 51
Самакат . . . . . . . . . . . . . 58
Доўг . . . . . . . . . . . . . . 65
Пераўтварэнне . . . . . . . . . . . 74
«На доўгую памяць» . . . . . . . . 78
Вонкавае святло . . . . . . . . . . 88
Швэдар . . . . . . . . . . . . . 96
Зімны лёс . . . . . . . . . . . . 106
Спёка . . . . . . . . . . . . . . 110
Нагода . . . . . . . . . . . . . 116
Разрэз будынка . . . . . . . . . . 122
Зялёны мур . . . . . . . . . . . . 127
Хімічны аловак . . . . . . . . . . 137

**Сцяпан У.**

С 92 Вежа: Апавяданні.— Мн.: Маст. літ., 1990.— 143 с.— (Першая кніга празаіка).

ISBN 5-340-00830-4.

Степан В. Башня: Рассказы.

Кніга апавяданняў «Вежа» — гэта калейдаскоп падзей, здарэнняў як простых і звычайных, так нечаканых і экстравагантных. Аўтар прымушае сваіх герояў задумвацца і разважаць аб сапраўдных і штучных каштоўнасцях у жыцці чалавека і ў мастацтве.

Героі твораў — маладыя людзі, гараджане — спрабуюць пазбавіцца адзіноты, неўладкаванасці, разбурыць сцены адчужанасці, непаразумення і вырвацца з супярэчлівай рэчаіснасці.

С $\frac{4702120201-145}{М\ 302(03)-90}$ БЗ 64—90 ББК 84Бел7

*Литературно-художественное издание*

Владимир Степан

(Степаненко Владимир Александрович)

БАШНЯ

Рассказы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Уладзімір Сцяпан

(Сцепаненка Уладзімір Аляксандравіч)

ВЕЖА

Апавяданні

Рэдактар *Т. М. Турчыняк.* Мастак *У. А. Сцепаненка.* Мастацкі рэдактар *М. Я. Шкурпіт.* Тэхнічны рэдактар *Г. П. Тарасевіч.* Карэктар *Дзядзюля Л. А.*


ІБ № 3430

Здадзена ў набор 19.12.89. Падп. да друку 21.06.90. АТ 06008. Фармат 70×100 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 5,85. Ум. фарб.-адб. 6,01. Ул.-выд. арк. 6,17. Тыраж 6100 экз. Зак. 3158. Цана 40 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

40 к.



Уладзімір Сцяпан (Сцепаненка Уладзімір Аляксандравіч) нарадзіўся 22 студзеня 1958 года ў гарадскім пасёлку Касцюкоўка на Гомельшчыне. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Служыў у войску.

Працуе рэдактарам на Беларускім тэлебачанні.

Друкаваўся ў часопісах «Беларусь», «Маладосць», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», у іншых перыядычных выданнях.

Уладзімір Сцяпан адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў «Крыло», «Жнівеньскі праспект», «Тутэйшыя».